WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 КАСТРЫЧНІКА 2010 г.
АЎТОРАК
№ 194
(26802)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ ІМКНЕЦЦА ВЫЙСЦІ НА ЎЗРОВЕНЬ СТРАТЭГІЧНАГА ПАРТНЁРСТВА З ТУРЦЫЯЙ

У ходзе рабочага візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Турэцкую Рэспубліку 2 кастрычніка ў Стамбуле адбыліся яго сустрэчы з прэм'ер-міністрам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам і Прэзідэнтам гэтай краіны Абдулой Гюлем.

Бакі абмеркавалі стан двухбаковых адносін і найбольш перспектыўныя напрамкі далейшага супрацоўніцтва ў розных сферах, а таксама актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня. Асноўная ўвага была ўдзелена гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву Беларусі і Турцыі.

Сустрэча з Рэджэпам Таіпам Эрдаганам прайшла ў фармаце сам-насам у стамбульскай рэзідэнцыі прэм'ер-міністра — палацы Далмабахчэ. Паціскаючы руку беларускаму лідару, Рэджэп Таіп Эрдаган заўважыў: «'Мы з вамі вельмі падобныя».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў імкненне Беларусі выйсці на ўзровень стратэгічнага партнёрства з Турцыяй і гатоўнасць прапанаваць гэтай краіне шэраг перспектыўных напрамкаў для сумеснай дзейнасці.

Сустрэча кіраўніка беларускай дзяржавы з Абдулой Гюлем *(на фота)* прайшла ў фармаце рабочай вячэры ў рэзідэнцыі Прэзідэнта Турцыі Тараб'я. Іх размова працягвалася амаль дзве гадзіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокі ўзровень і плён беларуска-турэцкіх палітычных кантактаў. «Мы ведаем адзін пра аднаго шмат, і патэнцыял наш вялікі, але выкарыстоўваецца ён слаба. Калі мы рэалізуем ўсе дамоўленасці, якія з вамі абмеркавалі, то выйдзем на вельмі высокі ўзровень супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт Беларусі ў гутарцы са сваім турэцкім калегам.

У сваю чаргу Абдула Гюль выказаў упэўненасць у паспяховай рэалізацыі намечаных праектаў. «Мы задаволены тым, што турэцкія кампаніі маюць магчымасць працаваць у Беларусі», — сказаў ён. Турэцкі лідар таксама падзякаваў за тое, што ў Беларусі створаны добрыя ўмовы для інвесціравання.

Існуючы вопыт партнёрства Беларусі і Турцыі ў рэалізацыі сумесных праектаў сведчыць аб тым, што краіны могуць паспяхова супрацоўнічаць па ўсім спектры пытанняў, якія іх цікавяць. Апошнім часам актывізавалісяся афіцыйныя кантакты паміж дзвюма краінамі, а ўзровень палітычных адносін з'яўляецца добрым падмуркам для нарошчвання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

На сённяшні дзень паказчык тавараабароту паміж Беларуссю і Турцыяй яўна не адпавядае патэнцыялу краін. Існуе шэраг перспектыўных напрамкаў узаемадзеяння, у тым ліку ў сферы прамысловай кааперацыі. У прыватнасці, прапрацоўваецца магчымасць стварэння ў Турцыі зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі. Можна гаварыць і пра добрыя перспектывы для стварэння СП па вытворчасці складанай тэхнічнай прадукцыі на тэрыторыі Беларусі, якая з'яўляецца членам Мытнага саюза. Беларусь таксама гатова прапанаваць турэцкаму боку адносна танную і вельмі якасную тэхніку для горназдабыўной галіны.

Перспектыўным напрамкам з'яўляецца і магчымасць супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы лёгкай прамысловасці. У Беларусі запатрабаваны вопыт буйных турэцкіх кампаній гэтай галіны. Істотны патэнцыял для развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння ёсць таксама ў галіне навукі і тэхналогій, адукацыі і турызму, транспарту і лагістыкі.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ І КАНСТАНЦІНОПАЛЬСКІ ПАТРЫЯРХ ВАРФАЛАМЕЙ АБМЕРКАВАЛІ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ ЦАРКВЫ І ГРАМАДСТВА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 3 кастрычніка ў Стамбуле сустрэўся з Канстанцінопальскім Патрыярхам Варфаламеем.

Канстанцінопальская праваслаўная царква з'яўляецца адной з 15 незалежных (памесных) праваслаўных цэркваў, існуючых у свеце. Канстанцінопальскі Патрыярхат па значнасці і пачэснасці знаходзіцца на першым месцы.

Канстанцінопальскі Патрыярх Варфаламей — адзін з найбольш паважаных і аўтарытэтных іерархаў Праваслаўнай царквы. У 2008 годзе ён уключаны часопісам «Тайм» у спіс 100 найбольш уплывовых людзей свету. Патрыярх Варфаламей шырока вядомы ў свеце сваёй дзейнасцю па ахове навакольнага асяроддзя. Ён з'яўляецца ініцыятарам правядзення шматлікіх міжнародных экалагічных канферэнцый (напрыклад, па праблемах Дуная, у абарону Чорнага мора). У Еўропе ён атрымаў негалосны тытул «зялёнага патрыярха».

Сустрэчу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з Канстанцінопальскім Патрыярхам Варфаламеем блаславіў Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл.

Канстанцінопальскі Патрыярх Варфаламей сардэчна вітаў Аляксандра Лукашэнку. Сустрэча праходзіла ў вельмі цёплай і дружалюбнай атмасферы. Кіраўнік беларускай дзяржавы і Патрыярх абмеркавалі ўзаемаадносіны царквы і грамадства. Аляксандр Лукашэнка падрабязна праінфармаваў аб тым, як у нашай краіне складваюцца адносіны паміж уладай і Праваслаўнай царквой. Прэзідэнт расказаў аб міжканфесійнай сітуацыі ў Беларусі, а таксама аб унікальнасці і прыгажосці беларускай прыроды.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ён будзе заўсёды рады бачыць Канстанцінопальскага Патрыярха Варфаламея на беларускай зямлі.

Пасля гутаркі з Патрыярхам кіраўнік дзяржавы наведаў храм, агледзеў хрысціянскія святыні, што знаходзяцца ў ім, і запаліў свечку.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСКІ — ЧАЦВЁРТЫЯ Ў СВЕЦЕ!

СПАРТСМЕНКІ, амаль камсамолкі і проста прыгажуні! Успамінаючы знакамітую цытату з фільма, хочацца менавіта так называць нашых дзяўчат са зборнай Беларусі па баскетболе, якія на сусветным першынстве занялі 4-е месца.

У атацы Таццяна Тройна.

Так, у паядынку за 3-е месца каманда Анатоля Буяльскага саступіла зборнай Іспаніі (68:77), але хіба ў каго павернецца язык у чымсьці папракнуць дзяўчат? Перад гэтым было паражэнне ў авертайме ад каманды-гаспадара, зборнай Чэхіі — 77:81. Многія моманты з паядынку няхай застануцца на сумленні суддзяў — гэта ні ў якім разе не можа прынізіць і сапсаваць тую яскравую і самаадданую гульню, якую паказалі нашы на сёлетнім чэмпіянаце. Расійскія баскетбалісткі называлі беларусак «лялечкамі ў спаднічках», але дзе яны зараз, гэтыя былыя фаварыткі? Яшчэ раз віншуем нашых суайчыннiц з выдатным вынікам і чакаем новых перамог! А яны будуць, і, магчыма, яшчэ больш гучныя.

Чэмпіёнам свету стала, як і прагназавалася, жаночая амерыканская «дрым-цім», якая, не напружваючыся, «укатала» чэшак — 89:69. Амерыканкі аўтаматычна атрымалі пропуск на лонданскую Алімпіяду-2012. Выніковае становішча каманд на ЧМ-2010: 1. ЗША, 2. Чэхія, 3. Іспанія, **4. БЕЛАРУСЬ**, 5. Аўстралія, 6. Францыя, 7. Расія, 8. Паўднёвая Карэя, 9. Бразілія, 10. Японія, 11. Грэцыя, 12. Канада, 13. Малі, 14. Сенегал, 15. Кітай, 16. Аргенціна.

Учора зборная Беларусі вярнулася ў Мінск авіярэйсам з Вены.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рамонтныя работы на высакавольтнай лініі каля Заслаўя.

ВЫСОКІ ТОК

У Беларусі бясплатнае санаторнае лячэнне атрымаюць вучні школ, размешчаных у забруджаных радыенуклідамі раёнах

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 517 «Аб прадастаўленні сацыяльных ільгот некаторым катэгорыям непаўналетніх дзяцей».

Дакумент прыняты ў мэтах узмацнення сацыяльнай абароны непаўналетніх, якія пражываюць на чыстай тэрыторыі, але вучацца ва ўстановах адукацыі ў забруджаных раёнах. Гэтым дзецям прадастаўляецца права на бясплатнае харчаванне ў час навучання ў школах, бясплатныя санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, праезд туды і назад да санаторных устаноў.

Акрамя таго, для большага ахопу санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання або вучацца там, указам прадастаўлена права на бясплатны праезд дзецям, якія накіроўваюцца на аздараўленне ў складзе арганізаваных груп, і права на санаторна-курортнае лячэнне з аплатай пуцёўкі ў памеры 15 працэнтаў яе кошту аднаму з бацькоў (асобе, што яго замяняе), які суправаджае дзіця ва ўзросце 3-6 гадоў. Прыняцце ўказа з'яўляецца яшчэ адным сведчаннем таго, што клопат дзяржавы аб дзецях быў і застаецца прыярытэтнай задачай сацыяльнай палітыкі Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прамая лінія

Дапамогі, пенсіі, паслугі

Адрасная сацыяльная дапамога і варыянты сацыяльных паслуг, асаблівасці вылічэння стажу і індывідуальнага каэфіцыента, пенсійныя надбаўкі і павышэнні — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціны Вікенцьеўны Каралёвай.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, «прамая лінія» будзе праходзіць **з 11 да 12 гадзін 13 кастрычніка** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 92 і 232 38 21**. Нумар для папярэдніх пытанняў — **287 17 57**.

СОНЕЧНА І ХОЛАДНА

Праз два тыдні магчымы першы снег

МОЦНЫ скандынаўскі антыцыклон на працягу ўсяго тыдня будзе падтрымліваць на тэрыторыі Беларусі сухое, але халоднае надвор'е, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.

Вецер усходні ўмераны, у сераду па захадзе краіны — парывісты. Уначы і раніцай у нізінах магчымы непрацяглы туман. Арктычнае паветра прынясе нам сур'ёзныя замаразкі ўначы да мінус 5. Удзень будзе сонечна, але не больш за 7—13 цяпла. Такі кліматычны рэжым на 3—5 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму. Прыкладна такі характар надвор'я захаваецца і ў выхадныя. У сувязі з маштабнымі замаразкамі сіноптыкі перадаюць рэгіёнам штармавое папярэджанне з рэкамендацыямі не пакідаць на адкрытым паветры павыкопаную бульбу і іншыя караняплоды.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, прыкладна ў другой палове месяца да нас зноў пачнуць рухацца атлантычныя цыклоны. Часам будуць ісці дажджы. А вось на фоне замаразкаў раніцай і ўначы магчымы першы снег. Мабыць, другой хвалі бабінага лета мы ўжо не ўбачым.

Сяргей КУРКАЧ.

БЕЛАРУСБАНК З 1 КАСТРЫЧНІКА ЗНІЖАЕ СТАЎКІ ПА РАНЕЙ ЗАКЛЮЧАНЫХ КРЭДЫТНЫХ ДАГАВОРАХ НА БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

ААТ «ААБ Беларусбанк» з 1 кастрычніка 2010 года зніжае працэнтныя стаўкі па раней заключаных крэдытных дагаворах з фізічнымі асобамі ў беларускіх рублях на фінансаванне будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў, паведамілі ў банку.

У прыватнасці, для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на дату атрымання крэдыту, стаўка зніжана да 17 працэнтаў гадавых з выплатай працэнтаў шляхам унясення раўнамерных узносаў у перыяд пагашэння. Для грамадзян, якія не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў на дату атрымання крэдыту, стаўка зменшана да 21 працэнта гадавых з выплатай працэнтаў за фактычны час карыстання крэдытам.

Паводле звестак на пачатак верасня, астатак запазычанасці па крэдытах фізічных асобаў у Беларусбанку складаў Br13,9 трлн. Колькасць дзейных крэдытных дагавораў — больш як 810 тыс., гэта значыць, на 1 тыс. працаздольных грамадзян прыпадае 175 крэдытаатрымальнікаў. Сярэдняя запазычанасць на аднаго крэдытаатрымальніка складае Br17,2 млн.

На крэдытаванне грамадзян на льготных умовах для рэалізацыі адной з важнейшых сацыяльна значных дзяржаўных праграм — жыллёвага будаўніцтва — з пачатку года накіравана Br3,6 трлн, або 64 працэнты гадавога аб'ёму.

Пытальнік

«Падчас сустрэч інфармацыйна-прапагандысцкіх груп з насельніцтвам нараканняў на якасць хлеба таксама не было...»

...Хлеб — гэта жыццё. Нельга з яго здзекавацца! Праедзьцеся па іншых раёнах: хлеб добрай якасці. А ў нас? Возьмеш свежы бохан, падаецца, мяккі, а пачнеш есці... І ніякага смаку. Гэта ўжо многія гады так... Раней хлеб каштаваў 1 560 рублёў, а цяпер 2 260.

Леанід Канстанцінавіч ХАЛАДЗІНСКІ, вёска Ляды Чэрвеньскага раёна.

Ліст чытача насамрэч нашмат большы і па аб'ёме, і па эмацыйнасці. Відавочна, апошняя акалічнасць і перашкодзіла паважанаму заяўніку засяродзіцца на канкрэтных фактах, бо, на жаль, ён не напісаў ні пра назву хлеба, ні пра яго вагу (гучаць скаргі на яе змяненні — **рэд.**). Да скаргі вясковец прышпіліў толькі чэк з крамы № 35, якая належыць Чэрвеньскаму раённаму спажывецкаму таварыству. З яго вынікае, што 11 верасня тут была зробленая пакупка на суму 2 260 рублёў, ад рукі на паперцы дапісана, што гэта чэк за бохан хлеба...

Тым не менш, нягледзячы на адсутнасць дакладнай інфармацыі, мы дамовіліся з **дырэктарам камбіната кааператыўнай прамысловасці — філіялам Чэрвеньскага раённага спажывецкага таварыства — Аляксеем СЯМКО**, што, па магчымасці, выкладзенае будзе праверана. Неўзабаве мы атрымалі ад суразмоўцы афіцыйнае рэагаванне, дзе ён паведамляе, што разам з начальнікам цэха хлебапячэння Таццянай Няхай і справаводам Тамарай Патапенкай выязджаў на месца для разгляду ліста жыхара вёскі Ляды.

«Праведзеная сустрэча з ім, а таксама з іншымі жыхарамі вёскі, гэта пытанне ўдакладнена ў старшыні Лядзенскага сельвыканкама. Устаноўлена, што сёлета ад іх нараканняў на якасць хлебабулачных вырабаў не паступала. Няма іх і ў кнізе заўваг і прапаноў крамы № 35 вёскі Ляды, у тым ліку і ад Л.К. Халадзінскага. Падчас сустрэч інфармацыйна-прапагандысцкіх груп з насельніцтвам сельскага Савета скаргаў на якасць хлеба таксама не было.

Камбінат кааператыўнай прамысловасці выпускае больш за дваццаць відаў хлебабулачных вырабаў. Цэны на іх фарміруюцца згодна з пастановай Мінэканомікі №114 ад 28.05.2008 г. і ўзгадняюцца ў Мінскім аблспажыўсаюзе.

Якасць вырабаў кантралюецца вытворчай лабараторыяй, ДУ «Чэрвеньскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі», РУП «Барысаўскі цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі».

— Апошняя праверка праводзілася ў чэрвені гэтага года. Згодна з яе заключэннем, прадукцыя камбіната кааператыўнай прамысловасці Чэрвеньскага раённага спажывецкага таварыства адпавядае ўсім патрабаванням, — сказаў спачатку ў тэлефоннай размове, а потым гэтыя ж словы прадубліраваў у афіцыйным рэагаванні ў рэдакцыю дырэктар камбіната Аляксей Сямко.

Тым не менш, як паведамляецца напрыканцы адказу, «завоз хлебабулачных вырабаў у краму вёскі Ляды пастаўлены на кантроль».

САРКАЗІ ВЫРАШЫЎ АДАБРАЦЬ У ЗША СУСВЕТНУЮ ГЕГЕМОНІЮ З ДАПАМОГАЙ РАСІІ

Прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі збіраецца на франка-расійска-германскім саміце ў Давіле 18-19 кастрычніка прапанаваць значна пашырыць супрацоўніцтва ЕС і Расіі ў сферы эканомікі і бяспекі. У Вашынгтоне асцерагаюцца, што, калі ідэя будзе рэалізаваная, гэта парушыць сусветную перавагу ЗША, піша брытанская газета The Times. Французскі лідар таксама прапануе выпрацаваць новую эканамічную структуру, якая ўзмацніла б уплыў Кітая.

Як лічыць Сарказі, для нармальнага функцыянавання эканомікі неабходна ўстанавіць новую сусветную архітэктуру. На думку прэзідэнта Францыі, Кітаю і Расіі павінна адводзіцца ў гэтым працэсе важнае месца. Сарказі хоча, каб Расія і 27 краін Еўрасаюза сфарміравалі цесныя сувязі па розных пытаннях, у тым ліку ў вобласці нацыянальнай бяспекі, дыпламатычных адносін, эканамічнай палітыкі, правоў чалавека і іміграцыі. Як лічыць Сарказі, Францыя павінна зрабіць усё для збліжэння Расіі з Еўропай. Як стала вядома, ён мае намер скарыстацца прэзідэнцтвам Францыі ў «дваццатцы», якое пачнецца 14 лістапада, каб прасунуць сваю ідэю.

ЯПОНЦАЎ, АНГЛІЧАН І АМЕРЫКАНЦАЎ ПАПЯРЭДЗІЛІ ПРА ПАГРОЗУ ТЭРАКТАЎ У ЕЎРОПЕ

Японія 4 верасня папярэдзіла сваіх падданых пра павышаную пагрозу тэрарыстычных актаў на тэрыторыі Еўропы, паведамляе BBC News. Раней з аналагічным папярэджаннем да сваіх грамадзян звярнуліся ўлады Вялікабрытаніі і ЗША.

У звароце да падданых японскі МЗС заклікаў іх быць асцярожнымі пры выкарыстанні грамадскага транспарту і наведванні выбітнасцяў. Пры гэтым ведамства не назвала пэўных краін, у якіх пагроза здзяйснення тэрарыстычных актаў з'яўляецца асабліва высокай.

Тым часам брытанскі МЗС, які выступіў са зваротам 3 верасня, краінамі, дзе верагоднасць тэрактаў з'яўляецца самай высокай, назваў Францыю і Германію. Акрамя таго, урад краіны не выключыў, што тэрарыстычныя акты могуць быць здзейсненыя і на тэрыторыі самога Злучанага Каралеўства.

ЗША, у сваю чаргу, парэкамендавалі амерыканскім турыстам у Еўропе пазбягаць месцаў вялікага скаплення людзей. Найбольш небяспечнымі для наведвання краінамі Дзярждэпартамент таксама палічыў Францыю, Германію і Вялікабрытанію. Паводле звестак улад ЗША, тэракты на тэрыторыі ЕС рыхтуе «Аль-Каеда» і звязаныя з ёй арганізацыі.

Сёння ўзровень тэрарыстычнай пагрозы ў Вялікабрытаніі ўлады краіны пазначаюць як «сур'ёзны». Улады Францыі, у сваю чаргу, кажуць пра «чырвоную трывогу». У абодвух выпадках гаворка ідзе пра другі вышэйшы ўзровень небяспекі.

У канцы верасня стала вядома пра прадухіленне на тэрыторыі Францыі, Германіі і Вялікабрытаніі серыі тэрактаў. Як паведамлялася ў СМІ, тэрарысты планавалі правесці ў Лондане, Франкфурце і Парыжы захопы закладнікаў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

КРЫМІНАЛЬНЫ ВЫШУК СУПРАЦЬ «АСАБЛІВА ЦЯЖКІХ»

5 кастрычніка — Дзень утварэння крымінальнага вышуку. Гісторыя гэтай структуры пачалася яшчэ ў 1918 годзе, і з таго часу крымінальны вышук застаецца адным з вядучых аператыўных падраздзяленняў органаў унутраных спраў. У апошнія гады назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння колькасці цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў.

За восем месяцаў гэтага года затрымана 325 злачынцаў, якія ўчынілі забойства, 943 асобы, якія наўмысна прычынілі цяжкія цялесныя пашкоджанні. Устаноўленае месцазнаходжанне 524 зніклых без вестак. Пасля завяршэння расследавання шэрагу крымінальных спраў забяспечана вяртанне страт, учыненых крадзяжамі маёмасці ўсіх формаў уласнасці, на суму каля 10 млрд рублёў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

НОВЫЯ ЗАКОНЫ ДЛЯ БУДУЧАГА КРАІНЫ

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава А.М. на адкрыцці пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 4 кастрычніка 2010 года

Фота БЕЛТА.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Мы адкрываем пятую сесію Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання напрэдадні важнейшых палітычных падзей: чацвёртага Усебеларускага народнага сходу, на якім трэба будзе зацвердзіць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на новую пяцігодку, і пачатай кампаніі па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дзяржаву і ўвесь наш народ чакае сур'ёзны і адказны экзамен на палітычную сталасць. І ад таго, як мы вытрымаем гэты экзамен, залежаць перспектывы далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Паважаныя калегі!

У гэтым кантэксце наша асенняя сесія мае асаблівае значэнне. Нам трэба будзе разгледзець больш як 50 законапраектаў. У міжсесійны перыяд яны былі дэталёва прапрацаваны спецыялістамі-практыкамі сумесна з іншымі ўдзельнікамі заканадаўчага працэсу і гатовы да разгляду.

У першую чаргу, тут трэба адзначыць пакет законапраектаў эканамічнага блока, што складаецца з чатырох праектаў законаў, у тым ліку Закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь на 2011 год» і Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2011 год», якія нам трэба будзе разгледзець сёння. Гэтыя праекты законаў распрацаваны з улікам нядаўніх змяненняў падаткоўага і бюджэтнага заканадаўства.

Вялікае значэнне для эканомікі краіны будуць мець таксама папраўкі ў Падатковы і Бюджэтны кодэксы Рэспублікі Беларусь. Рэалізацыя прапануемых змяненняў у названыя кодэксы ў сукупнасці з мерамі па паляпшэнні падаткоўага адміністравання павінна дазволіць у 2011 годзе максімальна наблізіць айчынную бюджэтную і падатковую сістэму да сусветных фінансавых стандартаў, забяспечыць празрыстасць бюджэтнага працэсу і дадаткова накіраваць на развіццё эканомікі больш за 700 млрд руб.

На стварэнне адзінага прававога поля ў сферы адукацыі накіраваны Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Гэта першы не толькі ў нашай краіне, але і на ўсёй постсавецкай прасторы кадыфікаваны нарматыўны прававы акт у гэтай галіне. З яго прыняццем завяршаецца асноўная стадыя фарміравання стабільнай і паслядоўнай сістэмы нацыянальнай адукацыі.

СТАР.2

ЧАС АДКАЗНЫХ РАШЭННЯЎ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на адкрыцці шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання

Фота БЕЛТА.

Паважаныя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 4 кастрычніка 2010 года, пачынае работу шостая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Яна будзе праходзіць на фоне такіх значных грамадска-палітычных падзей, як выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і правядзенне Усебеларускага народнага сходу. Мы як народныя прадстаўнікі павінны максімальна садзейнічаць таму, каб вынікі выбарчай кампаніі і праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на новае пяцігоддзе сталі рэальным выяўленнем волі народа, адпавядалі яго інтарэсам і забяспечвалі ўпэўнены рух наперад краіны па шляху стварэння.

Дасягненню гэтай мэты падпарадкавана і наша заканадаўчая дзейнасць. Галоўнымі арыенцірамі ў гэтай рабоце былі і застаюцца правы чалавека, гарантыі іх рэалізацыі, павышэнне якасці жыцця людзей на аснове дынамічнага развіцця эканомікі.

На пазачарговай сесіі мы прынялі пакет законапраектаў, якія вызначылі асноўныя напрамкі бюджэтнай і падатковай палітыкі з улікам новых эканамічных рэалій. Гэта дасць нам магчымасць у ходзе гэтай сесіі зрабіць акцэнт на заканадаўчым вырашэнні актуальных задач развіцця сацыяльнай сферы, аховы здароўя, адукацыі і культуры, забеспячэння канстытуцыйных правоў грамадзян. Усяго ў Палаце прадстаўнікоў ужо знаходзіцца 58 пытанняў, якія ахопліваюць практычна ўсе сферы жыцця беларускай дзяржавы і грамадства.

Цэнтральнае месца сярод пытанняў сацыяльнай тэматыкі займаюць праекты двух кадыфікаваных актаў, якія непасрэдна закранаюць самыя надзённыя інтарэсы людзей. Я маю на ўвазе Кодэкс аб адукацыі і Жыллёвы кодэкс. З прыняццем першага мы завершым працяглую карпатлівую работу па прававым афармленні сістэмы адукацыі. Новы Жыллёвы кодэкс змяшчае шэраг заканадаўчых навацый, якія датычацца развіцця інстытута іпатэкі, абароны правоў уласнікаў жылля, пытанняў эксплуатацыі жыллёвага фонду.

Асабліва трэба спыніцца на праекце Закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў». Пры падрыхтоўцы гэтага пытання трэба максімальна ўлічыць вынікі маніторынгу работы са зваротамі грамадзян, праведзенага па даручэнні Кіраўніка дзяржавы, і практыку нашай работы ў выбарчых акругах.

СТАР.2

ЛЮДЗІ І ПАКУПКІ НЕ ПАЦЯРПЕЛІ

Узгранне ў маторным адсеку пасажырскага аўтобуса стала прычынай пажару вялізнага транспартнага сродку. Машына, якая належыць гомельскай прыватнай фірме, была арэндаваная для паездкі супрацоўнікаў адной з магілёўскіх арганізацый у горад Хмельніцкі (Украіна) па пакупкі. Шоп-тур прайшоў добра, але ж на зваротнай дарозе раніцай пад Ельскам адбылося ўзгаранне, пасля якога ўсе 68 пасажыраў разам з вадзіцелем вымушаныя былі хутка пакінуць двух'ярусны камфартабельны аўтобус бельгійскай вытворчасці. Як паведамілі ў прэс-службе гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, людзі дачакаліся двух аўтобусаў з Гомеля, якія і транспартавалі іх да месца жыхарства. Разам з куплянымі рэчамі — іх паспелі выратаваць. А вось аўтобус, у якога выгарэў другі «паверх», адрамантаваць будзе складана.

ЗАГІНУЛІ 15-ГАДОВЫЯ ШКОЛЬНІКІ

Астанкі падлетка-сіраты, які жыў у прыёмнай сям'і ў вёсцы Слабада Мазырскага раёна, былі знойдзеныя ў нядзелю на пажарышчы, дзе згарэла 15 тон сена, упакаванага ў рулоны, паведамілі ў прэс-службе гомельскага абласнога ўпраўлення МНС. Па словах сведак, юнак там быў не адзін. Да таго ж высветлілася, што дома няма яшчэ аднаго хлопчыка з гэтага населенага пункта. Пасля пошукаў у панядзелак было знойдзена цела і другога падлетка. Юнак са шматдзетнай сям'і таксама стаў ахвярай свавольства з агнём.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.10.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	3 009,00	1 чэшская крона	168,89	USD	30,4960
▲1 еўра	4 129,25	1 польскі злоты	1046,72	10 UAH	38,4032
1 латвійскі лат	5 827,44	▲1 расійскі рубель	98,67	1000 BYR	10,1282
1 літоўскі літ	1 197,04	1 украінская грыўня	378,97	EUR	41,9747

Агенцтва Уладзіміра Грыўцова

НОВЫЯ ЗАКОНЫ ДЛЯ БУДУЧАГА КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Умацаванню прававых асноў у галіне жыллёвых адносін паслужыць новая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса. Сярод яго навацый — палажэнні законаў аб прыватызацыі жыллёвага фонду, сумесным дамаўладанні, пашырэнні правоў і канкрэтызацыі абавязкаў грамадзян і арганізацый у жыллёвай сферы. У новай рэдакцыі кодэкса будзе ўрэгуляваны шэраг жыццёва важных пытанняў, што датычацца аплаты жыллёва-камунальных паслуг, вызначэння аб'ектаў і абмежаванняў па адчужэнні і іпатэцы жылых памяшканняў, кіравання нерухомай маёмасцю, арэнды і г.д.

У мэтах юрыдычнага забеспячэння развіцця малой энергетыкі распрацаваны праект Закона «Аб аднаўляльных крыніцах энергіі». З яго прыняццем будзе створана прававая аснова для рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы станаўлення і развіцця малой энергетыкі. Гэта будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню энергетычнай бяспекі краіны і дасць магчымасць захаваць неаднаўляльныя крыніцы энергіі для будучых пакаленняў.

Далейшаму заканадаўчаму забеспячэнню ўстойлівага развіцця сельскіх тэрыторый, падтрымкі і абароны сельгасвытворцаў, стабільнасці аграрнага рынку паслужыць Закон «Аб аграпрамысловай вытворчасці».

Будзе прадоўжана работа па ўмацаванні прававых асноў грамадзянскай супольнасці, законнасці і правапарадку. Значную ролю ў гэтым адыграюць папраўкі ў шэраг нарматыўных прававых актаў, у тым ліку ў Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы. Гэтыя змяненні і дапаўненні накіраваны на дэмакратызацыю крымінальнага заканадаўства і павінны садзейнічаць больш поўнай кампенсацыі нанесенага ўрону.

Далейшаму развіццю інстытута трацейскага разбору будзе садзейнічаць прыняцце Закона «Аб трацейскіх судах». Укараненне альтэрнатыўных форм правасуддзя дасць магчымасць зменшыць колькасць зваротаў у суды, паскорыць вырашэнне спрэчных пытанняў і скароціць нагрузку на суддзяў.

Акрамя таго, у сесійны перыяд плануецца ўнесці папраўкі ў законы «Аб дарожным руху», «Аб электрасувязі», па пытаннях архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці і інш. Будуць разглядацца таксама законапраекты, што рэгулююць адносіны ў сферы нацыянальнай бяспекі і знешняй працоўнай міграцыі.

Трэба будзе прыняць шэраг рашэнняў па развіцці дагаворна-прававых адносін з іншымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі. У прыватнасці, намечана ратыфікаваць міжурадавыя пагадненні з Фінляндскай Рэспублікай, Кітайскай Народнай Рэспублікай, Латвійскай Рэспублікай, Расійскай Федэрацыяй і Чарнагорыяй.

Усе пералічаныя пытанні з'яўляюцца жыццёва важнымі для нашай краіны і нашых грамадзян, і прыняцце адпаведных законаў, несумненна, будзе садзейнічаць далейшаму развіццю дзяржавы і грамадства.

Паважаныя калегі!

Важнейшым напрамкам нашай дзейнасці з'яўляецца работа ў рэгіёнах. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Лукашэнка А.Р. неаднаразова падкрэсліваў, што вышэйшае прызванне парламентарыя — дапамагчы кожнаму чалавеку, калі ў яго склаліся няпростыя жыццёвыя абставіны, падтрымаць.

У перыяд паміж сесіямі члены Савета Рэспублікі рэгулярна сустракаліся з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, растлумачвалі сацыяльную і эканамічную палітыку беларускай дзяржавы, сутнасць і змест прынятых намі законаў, ажыццяўлялі індывідуальны прыём грамадзян. Гэта работа праводзілася ў адпаведнасці з планам, зацверджаным Прэзідыумам Савета Рэспублікі.

У ліпені—верасні нашымі сенатарамі было праведзена больш як 160 асабістых прыёмаў грамадзян, на якіх прынята каля тысячы чалавек. Непасрэдна ў Савеце Рэспублікі на асабістым прыёме пабывала больш за 40 чалавек, разгледжана 150 пісем і скаргаў грамадзян. Іх аналіз, у прыватнасці, паказаў, што 45 працэнтаў зваротаў датычацца пытанняў законнасці і абгрунтаванасці судовых пастаноў і правамернасці прынятых рашэнняў, 30 працэнтаў — праблем жыллёва-камунальнай гаспадаркі і сацыяльнай абароны.

Не ўсе скаргі маглі быць у поўнай меры задаволены, паколькі не заўсёды для гэтага былі дастатковыя падставы. Але, на жаль, і абгрунтаваныя скаргі ўсё яшчэ маюць месца. І з'яўленне такіх скаргаў з'яўляецца сведчаннем таго, што ў мясцовых органах улады ўсё яшчэ ёсць сістэмныя недапрацоўкі, іншы раз праяўляюцца бюракратызм і фармальныя адносіны да чалавека.

Наша задача як сенатараў, гэта значыць людзей аўтарытэтных і надзеленых вялікімі паўнамоцтвамі, — актыўна ўмешвацца ў гэтыя пытанні, прымушаць мясцовыя органы ўлады больш аператыўна вырашаць узнікаючыя праблемы. Хачу асабліва падкрэсліць, што кожны з нас павінен не толькі ўдзельнічаць у прыёме грамадзян, але і прасочваць да канца выкананне прынятых рашэнняў і рэкамендацый па кожным выпадку. Пытанне павінна знаходзіцца ў вас на кантролі да яго поўнага вырашэння — або задавальнення скаргі ці просьбы, што паступіла, або матываванай адмовы ў яе выкананні.

У той жа час неабходна больш строга падыходзіць да разгляду неабгрунтаваных скаргаў і заяў. З'явілася нямала «прафесійных скаржнікаў» з прамернымі і неабгрунтаванымі прэтэнзіямі. Як гаворыць кіраўнік дзяржавы: «Тут мы людзей крыху разбалавалі». У гэтым пытанні не трэба дапускаць перакосу і выстаўляць чыноўнікаў крыніцай усіх нашых бед. Кантралюючы і справядліва крытыкуючы дзеянні мясцовых улад, чыноўнікаў на месцах, мы павінны звяртаць увагу не толькі на іх абавязкі перад насельніцтвам, але і на абавязкі і адказнасць кожнага грамадзяніна перад дзяржавай і грамадствам.

Адным з напрамкаў дзейнасці Савета Рэспублікі па-ранейшаму будзе заставацца сістэмная работа з Саветамі дэпутатаў усіх узроўняў.

Нам трэба ўдасканальваць практыку ўдзелу членаў Савета Рэспублікі ў рабоце мясцовых Саветаў дэпутатаў. Сёння кожная чацвёртая сесія Саветаў дэпутатаў абласнога і базавага ўзроўняў праходзіць з нашым удзелам. Гэта дае магчымасць валодаць інфармацыяй аб стане спраў на месцах, своечасова выяўляць вузкія месцы ў жыцці рэгіёнаў, сумесна выпрацоўваць канкрэтныя механізмы вырашэння праблем. Удзельнічаючы ў рабоце сесій, сенатары не павінны адмоўчвацца, пасіўна сядзець у прэзідыуме. Неабходна выкарыстоўваць кожную такую магчымасць для інфармавання аб галоўных напрамках дзяржаўнай палітыкі, задачах, што стаяць перад краінай, і тых мерах, якія прымаюцца для павышэння дабрабыту людзей.

Асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць Саветам дэпутатаў пярвічнага ўзроўню. Асобныя з іх яшчэ слаба ўплываюць на развіццё сваіх тэрыторый, недастаткова мэтанакіравана працуюць над папаўненнем мясцовага бюджэту. Значная колькасць мясцовых бюджэтаў усё яшчэ з'яўляецца датацыйнай, і гэта — адна з праблем, без вырашэння якой мы не зможам у поўнай меры забяспечыць дзейсную ролю сельскіх і пасялковых Саветаў у кіраванні сваімі населенымі пунктамі.

Як вядома, цяпер шэраг функцый па добраўпарадкаванні тэрыторый перададзены ад сельскіх Саветаў на раённы ўзровень. У прынцыпе гэта правільна, паколькі сваімі сіламі сельскія Саветы не могуць вырашаць задачы, якія патрабуюць значных матэрыяльных затрат і сур'ёзнага тэхнічнага забеспячэння. Аднак ужо цяпер можна бачыць, што ў сувязі з гэтым узнікае праблема некаторага адхілення мясцовай улады ад вырашэння непасрэдных патрэб жыхароў сваёй вёскі або пасёлка. Неабходна разабрацца ў гэтай праблеме і знайсці такое рашэнне, якое ўзмацніла б магчымасць і зацікаўленасць Саветаў пярвічнага ўзроўню ў самастойным вырашэнні пытанняў жыцця вёскі.

У шэрагу рэгіёнаў ёсць добры вопыт вырашэння пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, у тым ліку ў вёсцы. Там мясцовыя органы ўлады ажыццяўляюць развіццё тэрыторый з улікам узаемнай адказнасці дзяржавы, мясцовай улады і суб'ектаў гаспадарання, уключаючы прыватны бізнэс. Трэба пераймаць і шырэй распаўсюджваць такі вопыт па рэспубліцы.

Гэтыя пытанні будуць абмеркаваны ў канцы кастрычніка на чарговым выязным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якое пройдзе на базе Касцюковіцкага і Краснапольскага раёнаў.

У рамках гэтага пасяджэння на прыкладзе двух сельскіх Саветаў дэпутатаў будзе прадэманстравана работа аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы (АІС) «Мясцовыя Саветы дэпутатаў», якая цяпер уводзіцца ў дзеянне. Яе выкарыстанне дасць магчымасць аптымізаваць справаводства, у тым ліку значна скараціць час на апрацоўку інфармацыі і падрыхтоўку дакументаў, што дасць магчымасць павысіць эфектыўнасць работы Саветаў.

Развіваючы гэту тэму, павінен сказаць, што ў чацвёртым квартале гэтага года апрабацыя АІС «Мясцовыя Саветы дэпутатаў» будзе праведзена на прыкладзе аднаго раёна ў кожнай вобласці рэспублікі, а на працягу 2011 года неабходна будзе ўкараніць гэту АІС ва ўсіх мясцовых Саветах дэпутатаў Рэспублікі Беларусь.

Упэўнены, што ў гэтай важнай дзяржаўнай справе прымуць самы актыўны ўдзел старшыні абласных выканаўчых камітэтаў — члены Савета Рэспублікі. Без іх дапамогі цяжка будзе вырашыць многія арганізацыйныя і фінансавыя пытанні ўкаранення АІС.

Паважаныя калегі!

Як паказвае практыка, важны інструмент у нашай рабоце з насельніцтвам — сістэмнае і мэтанакіраванае ўзаемадзеянне са сродкамі масавай інфармацыі. Апошнім часам супрацоўніцтва членаў Савета Рэспублікі са сродкамі масавай інфармацыі прыкметна актывізавалася. У рэспубліканскіх і мясцовых СМІ стала больш публікацый і паведамленняў аб сустрэчах з насельніцтвам, аб правядзенні асабістых прыёмаў грамадзян. Напрыклад, толькі ў міжсесійны перыяд больш як у 140 газетных публікацыях расказвалася аб гэтых і іншых аспектах дзейнасці Савета Рэспублікі.

Найбольш актыўна выступалі ў сродках масавай інфармацыі члены Прэзідыума Савета Рэспублікі, а таксама члены Савета Рэспублікі Атрашкевіч Алена Віктараўна, Мароз Лілія Францаўна, Аверын Віктар Сяргеевіч, Рабец Валерый Васільевіч, Дзюжаў Андрэй Анісімавіч, Сакалоўская Людміла Карнееўна, Ятусевіч Антон Іванавіч, Манько Наталля Віктараўна, Падаляк Алена Міхайлаўна, Парахневіч Ірына Міхайлаўна, Мароз Юрый Дзмітрыевіч, Крыштаповіч Міхаіл Васільевіч, Місюра Раіса Аляксееўна і інш.

Гэта важны бок нашай дзейнасці, і мы павінны яе пастаянна ўдасканальваць. У прыватнасці, падрыхтаваны ўжо тэматычныя графікі выступленняў членаў Савета Рэспублікі ў СМІ аб парламенцкай і прафесійнай дзейнасці, па законапраектах, якія будуць разгледжаны ў ходзе пятай сесіі.

У кастрычніку—лістападзе ў Савеце Рэспублікі пройдуць сустрэчы з рэдактарамі абласных, гарадскіх і раённых газет. Нам трэба максімальна эфектыўна выкарыстаць іх для данясення інфармацыі аб дзейнасці нашага Парламента, аб унутранай і знешняй палітыцы нашай дзяржавы. Трэба не баяцца закранаць вострыя пытанні, якія хвалююць нашых грамадзян, і даваць па іх аргументаваныя і зразумелыя тлумачэнні.

Павінен таксама адзначыць, што сёння сталі больш эфектыўна выкарыстоўвацца магчымасці вэб-сайта Савета Рэспублікі.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У міжсесійны перыяд важнае месца адводзілася пашырэнню міжнародных і міжпарламенцкіх кантактаў. Значны імпульс развіццю міжпарламенцкага беларуска-сірыйскага супрацоўніцтва надала сустрэча кіраўнікоў палат беларускага Парламента з Прэзідэнтам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі ў ходзе яго візіту ў Мінск. Важнейшыя напрамкі беларуска-кітайскага супрацоўніцтва абмеркаваны ў Савеце Рэспублікі з Намеснікам Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў.

Дэлегацыя Савета Рэспублікі ўдзельнічала ў рабоце Трэцяй Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў у Жэневе, дзе намі быў прадстаўлены даклад з інфармацыяй аб ролі парламентарыяў у справе развіцця палітычнай сістэмы нашай краіны і ўмацавання міжнароднага супрацоўніцтва па праблемах, якія ўяўляюць глабальны інтарэс. У ходзе гэтага мерапрыемства прайшлі нашы сустрэчы з кіраўнікамі парламентаў Азербайджана, Балгарыі, Казахстана, Латвіі, Малдовы, Султаната Аман, Індыі і Італіі. У складзе дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь члены Савета Рэспублікі ўдзельнічалі ў 19-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Вялікае значэнне надавалася развіццю двухбаковых адносін з парламентамі замежных дзяржаў. У прыватнасці, далейшае развіццё атрымалі нашы кантакты з парламентамі Чэхіі, Даніі, Эстоніі і Літвы.

Прадаўжаўся канструктыўны дыялог з еўрапейскімі парламенцкімі структурамі. У Савеце Рэспублікі адбылася важная сустрэча са старшынёй падкамітэта па Беларусі, новым дакладчыкам па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ пані Хурскайнен.

У канцы верасня ў Мінску члены Прэзідыума Савета Рэспублікі ўдзельнічалі ў пасяджэнні круглага стала на тэму «Аб шляху ў напрамку адмены пакарання смерцю ў Беларусі», арганізаваным Сакратарыятам Савета Еўропы сумесна з парламентарыямі Рэспублікі Беларусь. У ходзе гэтага пасяджэння быў прааналізаваны вопыт еўрапейскіх дзяржаў, адбыўся абмен меркаваннямі аб перспектывах адмены гэтага віду пакарання ў нашай краіне.

Савет Рэспублікі будзе прадаўжаць работу па пашырэнні кантактаў з парламентамі замежных краін, актыўна супрацоўнічаць з міжпарламенцкімі арганізацыямі. У прыватнасці, забяспечаны ўдзел дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у 123-й Асамблеі МПС, якая пачынаецца сёння ў Жэневе, у планавых міжпарламенцкіх мерапрыемствах у рамках СНД, ЕўрАзЭС, АДКБ, а таксама Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Улічваючы значнасць пытання, хачу спыніцца на важнейшых задачах Савета Рэспублікі, звязаных з маючай адбыцца выбарчай кампаніяй.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — наша агульная справа. Ніхто не павінен застацца ўбаку. Свой уклад у іх падрыхтоўку і правядзенне павінен унесці і Савет Рэспублікі. Мы павінны мабілізаваць існуючы ў нас патэнцыял і папрацаваць так, каб усе этапы выбарчай кампаніі прайшлі ў строгай адпаведнасці з дзеючым нацыянальным заканадаўствам, каб былі забяспечаны высокі ўзровень арганізацыі выбарчага працэсу, дакладная, зладжаная работа выбарчых камісій.

Неабходна істотна актывізаваць работу з насельніцтвам, асабліва па месцы жыхарства. На асаблівым рахунку павінны быць аддаленыя і малалікія вёскі. Трэба дайсці да кожнага чалавека, каб ён пранікнуўся пачуццём грамадзянскай адказнасці і ўсвядоміў неабходнасць свайго ўдзелу ў гэтай жыццёва важнай для краіны палітычнай кампаніі.

Гэту работу трэба весці, максімальна выкарыстоўваючы рэсурс дэпутатаў мясцовых Саветаў. У красавіку гэтага года ў іх склад выбраны найбольш актыўныя і дастойныя грамадзяне, здольныя ўнесці істотны ўклад у работу з насельніцтвам і арганізацыю мерапрыемстваў, звязаных з правядзенем выбараў.

Членам Савета Рэспублікі неабходна часцей выступаць у вучэбных і вытворчых калектывах, асвятляючы дзейнасць нашага Парламента, растлумачваючы сутнасць унутранай і знешняй палітыкі нашай дзяржавы, развейваючы тыя палітычныя міфы, якія ў вялікай колькасці насаджаюцца сёння ў недружалюбных нам сродках масавай інфармацыі. Пры арганізацыі і правядзенні гэтай работы важна ўлічваць асаблівасці і інтарэсы розных груп насельніцтва.

Выкарыстоўваючы мясцовыя СМІ, неабходна ўдзяліць асаблівую ўвагу інфармаванню насельніцтва аб падрыхтоўцы і рэалізацыі ў рэгіёнах рэспубліканскіх і рэгіянальных сацыяльна-эканамічных праграм, накіраваных на павышэнне ўзроўню жыцця людзей, і ролі Парламента ў вырашэнні гэтых пытанняў.

Перакананы, што 19 снежня краіна прадэманструе ўсёй міжнароднай супольнасці адкрытасць сваёй палітыкі і дэмакратычнасць нашых выбараў. Разам з тым мы не прымаем якога-небудзь умяшання ў працэс волевыяўлення нашых грамадзян. У адпаведнасці з нашай Канстытуцыяй толькі беларускі народ можа і будзе выбіраць свайго Прэзідэнта.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Дазвольце на гэтым завяршыць сваё выступленне, пажадаць усім нам зладжанай, эфектыўнай работы і перайсці да пытанняў сённяшняга пасяджэння.

ЧАС АДКАЗНЫХ РАШЭННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Бо толькі ў міжсесійны перыяд дэпутаты ажыццявілі прыём больш як трох з паловай тысяч выбаршчыкаў, разгледзелі звыш трох тысяч зваротаў грамадзян, правялі больш як семсот сустрэч у працоўных калектывах, а таксама прынялі ўдзел у 215 пасяджэннях мясцовых органаў улады. Згадзіцеся — гэта добрая база для таго, каб падрыхтаваць законапраект, які можа рэальна палепшыць сітуацыю ў гэтай сферы.

Мы прадоўжым работу па ўзмацненні сацыяльнай абароны сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Прадугледжваецца пашырыць кола асобаў, якія маюць права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, зрабіць больш простым і зразумелым парадак яе назначэння і выплаты.

Прыняўшы базавыя законы аб ахове здароўя, мы пераходзім да вырашэння канкрэтных задач у гэтай сферы. Тут варта вылучыць законапраект, накіраваны на забеспячэнне гарантый бясплатнай дапамогі, у якім упершыню прапануецца заканадаўча ўрэгуляваць пытанні, звязаныя з рэалізацыяй крыві і яе кампанентаў. Акрамя таго, у перыяд сесіі чакаецца ўнясенне праектаў новых законаў, якія датычацца дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій, гарантый правоў грамадзян пры аказанні псіхіятрычнай дапамогі, а таксама медыцынскай дапамогі асобам, якія маюць захворванні, што ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва.

У полі нашага зроку будуць знаходзіцца і пытанні культуры, у тым ліку такія актуальныя, як абарона аўтарскіх правоў, развіццё музейнай справы ў краіне. І гэта далёка не поўны пералік пытанняў сацыяльнай тэматыкі, над якімі мы будзем працаваць.

З улікам новых умоў гаспадарання самая пільная ўвага дэпутатаў будзе ўдзелена розным аспектам заканадаўчага рэгулявання эканомікі. У прыватнасці, размова ідзе аб удасканаленні прававога забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны, архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай, транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці.

У мэтах лібералізацыі эканомікі, развіцця дзелавой актыўнасці мы прадоўжым работу па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур, парадку дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю. Будуць таксама зроблены захады па адаптацыі нацыянальных прававых актаў у сферы тэхнічнага нармавання і стандартызацыі да міжнароднай практыкі.

Наступны важны аспект — заканадаўчае забеспячэнне курсу на новую тэхналагічную стратэгію. Сёння ў мэтах развіцця тэзісаў, якія прагучалі ў Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Парламенту, вядзецца падрыхтоўка парламенцкіх слуханняў. Яны будуць прысвечаны пытанням пераводу эканомікі ў інавацыйнае рэчышча, а таксама ролі, якую павінны адыграць у гэтым працэсе навука і адукацыя. Іх вынікі дапамогуць выпрацаваць больш кампетэнтныя рашэнні па праекце Закона «Аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы», падрыхтоўка якога вядзецца ў адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы.

Даволі сур'ёзная работа нас чакае і ў галіне заканадаўства аб праваахоўнай дзейнасці. Нам трэба будзе разгледзець папраўкі ў Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, у законы аб пракуратуры, аб органах унутраных спраў, аб аператыўна-вышуковай дзейнасці. Адзначу таксама законапраект, накіраваны на аптымізацыю сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, у якім зроблены акцэнт на ўзмацненні вучэбна- і лячэбна-выхаваўчых функцый у сістэме пераадолення антыграмадскіх паводзін дзяцей і падлеткаў.

Значная ўвага будзе ўдзелена ўдасканаленню прававых асноў судаводства, перш за ўсё гаспадарчага. Асноўная мэта — павысіць зацікаўленасць грамадзян і суб'ектаў гаспадарання ў выкананні спрэчак у дасудовым парадку, шляхам трацейскага разбору, а таксама з прымяненнем спрошчаных і прымірыцельных працэдур, што выкарыстоўваюцца ў гаспадарчым працэсе.

Нарошчваючы прававую базу міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў плануе на гэтай сесіі ратыфікаваць пакет міжнародных дагавораў. Сярод іх пагадненні па прыгранічных пытаннях з Польшчай, аб узаемнай дапамозе ў мытных справах з Фінляндыяй, аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і тэхнікі, сродкаў масавай інфармацыі з Францыяй.

Мы ратыфікуем таксама Рамачнае пагадненне Беларусі з Паўночным інвестыцыйным банкам, пакет дакументаў па лініі СНД і ЕўрАзЭС. Асабліва адзначу далучэнне нашай краіны да Міжнароднай канвенцыі аб спрашчэнні і гарманізацыі мытных працэдур і маючую адбыцца ратыфікацыю новых нарматыўных дакументаў у рамках Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

Звяртаючыся да пытанняў міжнароднай дзейнасці, хацеў бы адзначыць вялікую работу, праведзеную ў міжсесійны перыяд. Парламентарыі прымалі актыўны ўдзел у абмеркаванні такіх актуальных пытанняў міжнароднага парадку дня, як барацьба з тэрарызмам, незаконнай міграцыяй і гандлем людзьмі, правы чалавека і гендарная роўнасць, энергетычная і харчовая бяспека, аварона навакольнага асяроддзя.

Так, на трэцяй Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў, праведзенай у лістападзе 2008 года ў Жэневе, кіраўнікі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь падзяліліся з замежнымі калегамі напрацаваным у Беларусі вопытам па забеспячэнні стабільнасці ў сацыяльнай сферы і на рынку працы ў перыяд крызісу, прынялі ўдзел у дэбатах аб мэце і напрамках далейшага развіцця міжпарламенцкага супрацоўніцтва і пашырэння ўзаемадзеяння з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у вырашэнні глабальных праблем чалавецтва.

У ходзе 19-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ нашы парламентарыі выказалі пазіцыю Рэспублікі Беларусь па пытаннях змянення клімату на планеце і стварэння еўрапейскай архітэктуры бяспекі.

Пошуку новых напрамкаў узаемадзеяння з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы садзейнічаў візіт у нашу краіну дакладчыка па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях ПАСЕ Сінікі Хурскайнен. Важным крокам у паглыбленні дыялогу з Саветам Еўропы стаў удзел дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у круглым стале па праблематыцы пакарання смерцю, арганізаваным Сакратарыятам Савета Еўропы.

Далейшае развіццё атрымалі і нашы кантакты з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора. Праўжалася работа па забеспячэнні паўнапраўнага ўдзелу беларускіх парламентарыяў у фарміруемым парламенцкім вымярэнні ініцыятывы Еўрапейскага саюза «Усходняе партнёрства».

У адпаведнасці з планамі работы ў рамках Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі беларускія парламентарыі прымалі ўдзел у пасяджэннях пастаянных камісій і шэрагу іншых мерапрыемстваў.

Гаворачы аб выніках двухбаковага супрацоўніцтва, трэба адзначыць першы візіт у нашу краіну парламенцкай дэлегацыі Каралеўства Данія на чале са старшынёй Камітэта па знешняй палітыцы Фолькетынга Евай К'ер Хансэн, а таксама візіт парламенцкай дэлегацыі Кітая на чале з Намеснікам Старшыні Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Цзянам Шушэнам.

У канцы верасня адбыўся візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Эстонскую Рэспубліку, у ходзе якога намечаны перспектывы развіцця міжпарламенцкіх сувязяў, наладжвання супрацоўніцтва ў палітычнай сферы, пашырэння бізнэс-кантактаў і культурнага абмену.

У перыяд асенняй сесіі прадоўжыцца практыка абмену візітамі. Плануецца, што нашу краіну наведаюць парламенцкія дэлегацыі Італіі і Украіны. Дэлегацыя Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь зробіць афіцыйны візіт у Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прымуць удзел у мерапрыемствах па лініі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, міжпарламенцкіх асамблей СНД і ЕўрАзЭС, Парламенцкай асамблеі АДКБ. Нас чакае работа ў рамках 123-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, асенняга пасяджэння Парламенцкай асамблеі АБСЕ, пасяджэнняў парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы і Генеральнай асамблеі Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

У нашых планах таксама ўдзел у міжнародным назіранні за парламенцкімі выбарамі ў Азербайджане і Малдове.

Асаблівая адказнасць ускладаецца на дэпутацкі корпус у сувязі з забеспячэннем дзейнасці прадстаўнікоў замежных парламентаў і міжпарламенцкіх арганізацый, якія прымуць удзел у міжнародным назіранні за ходам прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Беларусі.

Як бачым, па ўсіх напрамках парламенцкай дзейнасці нас чакае адказная і напружаная работа. Упэўнены, набыты намі вопыт дасць магчымасць паспяхова выканаць усе пастаўленыя задачы.

На заканчэнне, паважаныя калегі, хачу падзякаваць вам за добрую падрыхтоўку да сесіі і пажадаць плённай работы.

Дзякуй за ўвагу.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены ў развіцці канструктыўнага дыялогу Беларусі і Германіі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста З кастрычніка павіншаваў Федэральнага Прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Германія Крысціяна Вульфа і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём германскага адзінства.

«Упэўнены, што супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі будзе паспяхова развівацца як канструктыўны дыялог на аснове павагі і плённага ўзаемадзеяння ў інтарэсах двух народаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Управляющий по делу о банкротстве ЧУП «Автодом-Запад» Монтик Д.Н. – организатор торгов сообщает о проведении ТОРГОВ по продаже транспортных средств ЧУП «Автодом-Запад», а именно:

№ лота	Наименование лота	Коли-чество	Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС)	Шаг торгов, бел. руб. (5 % от началь-ной цены)	Задаток, бел. руб. (5 % от началь-ной цены)
1	Полуприцеп КЕГЕЛЬ SFHB 24, 2005 г.в.	1	39 150 682	1 957 534	1 957 534
2	Седельный тягач ВОЛЬВО FH12, 2003 г.в.	1	102 987 385	5 149 369	5 149 369
3	Полуприцеп ШМИТЦ S01, 2004 г.в.	1	38 540 506	1 927 025	1 927 025
4	Полуприцеп ШМИТЦ SPR24, 2004 г.в.	1	38 919 907	1 945 995	1 945 995
5	Полуприцеп ШМИТЦ S01, 2004 г.в.	1	37 307 462	1 865 373	1 865 373

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

Торги состоятся 21 октября 2010 года в 15.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ЧУП «Автодом-Запад», р/с 3012000001027 в филиале № 6 ОАО «Белгазпромбанк» г. Гродно, код 194, УНП 590662206.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 15.00 19.10.2010 по адресу: 230001 г. Гродно, а/я 27 или по факсу 8 (0152) 526859. Задаток должен поступить на указанный счет не позднее 15.00 19.10.2010.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8 (029) 6309211, тел./факс 8 (0152) 526859.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел. 227 52 36, 226 03 01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36.

Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-5 (2 очередь строительства). Жилой дом № 21 по генплану в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/962-1691 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 27 августа 2009 г.

Земельный участок площадью 0,3557 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано 5-секционным, 9-этажным. Количество жилых помещений жилого дома – 197, серия – 3А-ОПБ.

Начало строительства – июнь 2010 года.

Окончание строительства в соответствии с ПОС – 31 декабря 2010 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 05.08.2009 № 1126-8-2009 с дополнением от 10.08.2010 № 800-60/10.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство 50 жилых помещений 1-3 секции с гражданами из числа обманутых дольщиков в соответствии с решением Мингорисполкома № 1177 от 20.05.2010.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет – 2 336 380 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 22.01.2010 № 4с-01-2010, генподрядчик – ОАО «МДК».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться в каб. 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

Генеральный директор Е.И. Вовна

ПАСАЖЫРСКІ ЦЯГНІК АДРЭЗАЎ ПАЛЬЦЫ

Цягнік «Мінск — Санкт-Пецярбург» адрэзаў фалангі трох пальцаў правай кісці рукі

Прамая мова

Сямён ШАПІРА:

«НЕ ПРАБЛЕМА — ГРОШЫ, ГАЛОЎНАЕ — АКУПЛЯЛЬНАСЦЬ І ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ БІЗНЭС-ПРАЕКТА»

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА правёў прэс-канферэнцыю.

— Мне вельмі падабаецца Гродна, пачынаю яго любіць, — сказаў Сямён Шапіра. — Але бачу і тыя праблемы, якія стаяць перад горадам у яго развіцці. Вельмі падабаюцца і нашы райцэнтры. Адзін з першых, які кінуўся ў вочы, — Астравец. Мы запрасілі туды кіраўнікоў усіх раёнаў, абласных службаў, каб паказаць, як трэба берагчы і развіваць раённы цэнтр.

Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

Не будзе канкурэнцыі — адстанем назаўсёды

— Усе праблемы, якія ўзнікалі ў дзяржаве, — гэта стварэнне ўдзельных княстваў. Яны разбуралі дзяржаву. Вы ведаеце пазіцыю Прэзідэнта, які дакладна сказаў, што на тэрыторыі нашай краіны, незалежна ад раёна, вобласці, усе тавары маюць аднолькавы шанц на яго набыццё жыхарамі. Гэта стратэгічная ўстаноўка, якая дазваляе краіне быць на канкурэнтным узроўні. Пачнём ствараць перавагі для нейкіх вытворцаў — адстанем назаўсёды, перашкодзім развіццю краіны. Сямён Шапіра сказаў, што ставіцца задача з дзевяці прадпрыемстваў малочнай галіны і пяці мясаперапрацоўчых стварыць дзве структуры, узмацніўшы і развіўшы іх магутнасці, каб стаць больш канкурэнтаздольнымі: «У бліжэйшы час дзякуючы гэтым падыходам, а не нейкім адміністрацыйным мерам, мы будзем заваёўваць рынкі іншых рэгіёнаў нашай краіны».

— Будучыня Гродзенскай энергасістэмы — за Зэльвенскай вугальнай станцыяй і Астравецкай АЭС. Мы тады зможам не толькі забяспечыць патрэбы рэгіёна, але і прадаваць энергію. Разам з тым, будзем будаваць гідраэлектрастанцыі, ставім задачу ва ўсіх раёнах развіваць альтэрнатыўныя віды энергіі. У прыватнасці, што датычыцца драўніны, дранкі, то цяпер нашы структуры вырабляюць яе каля 100 тысяч тон. Самі спажываем 30 тысяч, а каля 70 тысяч тон прадаём за валюту. Задача — выйсці на 150 тысяч тон дранкі і ўжо сёлета 100 тысяч тон выкарыстоўваць для ўласных катлоў. Праблему альтэрнатыўных крыніц энергіі за год - два мы павінны кардынальным чынам вырашыць.

Без ініцыятывы не будзе ні праектаў, ні сродкаў на іх ажыццяўленне

Якія інвестыцыйныя перспектывы хімічнага гіганта — ААТ «Гродна Азот»? Сямён Шапіра адказаў, што нядаўна там пабывалі патэнцыйныя партнёры з адной з буйнейшых расійскай кампаніі, якая мае газ — менавіта ад яго залежыць эфектыўнасць працы гродзенскіх хімікаў. Пасля сустрэчы ў Гродне расіяне паехалі ў Прыбалтыку, дзе ёсць аналагічнае прадпрыемства. Абмяркоўваецца магчымасць стварэння холдынга з удзелам гэтых двух прадпрыемстваў і расійскай кампаніі, якая зможа забяспечыць іх газам. Але пра вынік пакуль казаць рана і, зразумела, рашэнне такога ўзроўню будзе прымацца кіраўніцтвам рэспублікі.

Сямён Шапіра таксама паведаміў, што ўсіх кіраўнікоў прадпрыемстваў папрасілі прадаставіць бізнэс-планы: як збіраецеся за наступную пяцігодку на 50—60 працэнтаў, як мінімум, павялічыць аб'ёмы вытворчасці? Яны думаюць, напружваюцца, шукаюць новыя рынкі збыту прадукцыі, дыверсіфікуюць вытворчасць. Кожны дырэктар альбо ўжо абараніў, альбо рыхтуецца да абароны сваёй праграмы.

Галоўнае тут — інвестыцыі. І праблема ў іх атрыманні, на думку старшыні аблвыканкама, нават не ў фінансавых сродках («грошай хапае, многія кампаніі выходзяць на нас»), а ў дэфіцыце эфектыўных, высокаакупляльных бізнэс-праектаў. Таму і банкі асцярожнічаюць. Паводле інфармацыі Сямёна Шапіры, цяпер прапрацоўваецца пытанне будаўніцтва на Гродзеншчыне яшчэ аднаго цукровага завода, каб павялічыць да 2 мільёнаў тон аб'ёмы цукровых буракоў з іх поўнай перапрацоўкай на тэрыторыі вобласці. Акрамя таго, хуткаакупляльным бачыцца старшыні аблвыканкама праект будаўніцтва буйной птушкафабрыкі (на першым этапе — 100 тысяч тон мяса) з выкарыстаннем дзесяці нашых прадпрыемстваў, стварэннем холдынга. Вывучаецца рынак і, магчыма, у вобласці пабудуюць таксама фабрыку на 20 тысяч тон макаронных вырабаў.

Сямён Шапіра прывёў у прыклад старшыню Слонімскага райвыканкама Іосіфа Паўлюкевіча, па ініцыятыве якога эфектыўна развіваецца добра знаёмы па савецкіх часах гаспадарчы спосаб будаўніцтва ў сельскай мясцовасці, дзякуючы чаму так званыя неперспектыўныя аб'екты атрымліваюць другое жыццё.

— Выбралі разам з кіраўніком гаспадаркі аб'ект, падключылі меліярацыю, паклалі асфальт, убралі хмызняк, адрамантавалі ферму, укаранілі сучасныя тэхналогіі. І ўсім паказалі, што не трэба падаць духам. Стварылі нармальныя ўмовы працы, людзі задаволеныя.

Гаворачы пра кадры сельгаспрадпрыемстваў, Сямён Шапіра падкрэсліў, што «ў цэлым яны на Гродзеншчыне моцныя, але трэба давяраць маладым».

— У нас многія становяцца кіраўнікамі перад пенсіяй, гэта няправільна. Глыбока перакананы, што больш цікавай, творчай, насычанай працы, чым старшыня сельгаспрадпрыемства, не можа быць для развіцця, станаўлення чалавека і прафесіянала. Калі на 28-м годзе жыцця мне даверылі кіраваць гаспадаркай, то я клаўся спаць і чакаў, калі настане раніца — так хацелася на працу. А сёння... Многія з маладых спецыялістаў, як у арміі, чакаюць «дэмбеля». Цяжка, няма выхадных. Значыць, трэба купіць столькі тэхнікі, так тэхнічна перааснасціцца, каб усё рабілася своечасова, без працы ў суботу і нядзелю. І другое — забяспечыць дастойную зарплату... Трэба рухаць моладзь.

Дольшчыкам «Кансента» дапамогуць

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды» (дарэчы, адказ быў таксама па-беларуску: «Добра валодаю беларускай мовай, не забываю яе, хоць у асноўным даводзіцца размаўляць па-руску»), Сямён Шапіра сказаў, што грамадзяне звяртаюцца ў аблвыканкам з самымі рознымі праблемамі і прапановамі. Нейкую адну тэму вызначыць цяжка. Многія пытанні датычацца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, шмат скаргаў на працу міліцыі, дзяржаўных установ.

«Гучная» тэма гродзенскіх забудоўшчыкаў, якія аказаліся падманутымі фірмай «Кансент», цяжкая, але вырашальная, лічыць старшыня аблвыканкама.

— Сітуацыя не тупіковая. Доўга чакалі вынікаў гаспадарчай рэвізіі гэтай фірмы і ў бліжэйшы час зробім рашучыя крокі, каб прадоўжыць будоўлю. Пастараемся ўсё зрабіць, каб грамадзяне атрымалі жыллё.

Каб не было сорамна перад нашчадкамі

Па ініцыятыве Гродзенскага аблвыканкама аб'яўленая грамадская акцыя «Адновім Каложу разам!». І не дай божа дапусціць памылку, зазначыў Сямён Шапіра.

— Улада — гэта вялізная адказнасць. Я ўжо пераконваўся: сёння прымаеш рашэнне ў дачыненні да лёсу чалавека, а калі з цягам часу бачыш, што рашэнне няправільнае, то страшэнна балюча самому, а па-другое, часта атрымліваеш рэакцыю ў адказ ад таго, каго ты пакрыўдзіў. Калі ж дакранаешся да пытанняў гісторыі, то павінна быць асаблівая асцярожнасць. Тут нельга, дарэчы, ні сякерай, ні нажом. Таму такія знакавыя пытанні, як далейшы лёс Каложы, датычацца не толькі ўлады, але і кожнага жыхара краіны, і трэба, каб яны знаходзілі грамадскае гучанне, каб людзі маглі выказацца. Каб нашы нашчадкі не казалі, што ў 2010 годзе нешта «нахамуталі»і пакінулі такую спадчыну. Я пакуль глыбока не перакананы, што трэба Каложу сёння рэстаўраваць. Сваё слова павінны сказаць прафесіяналы, якія прызнаныя ў свеце. Маё меркаванне тут будзе апошнім, а меркаванне спецыялістаў павінна быць першым.

З адказнасцю не толькі перад сённяшнімі, але і заўтрашнімі пакаленнямі звязанае і развіццё інфраструктуры яшчэ адной жамчужыны — беларускай часткі Аўгустоўскага канала. Ва ўрад пададзеныя дакументы аб уключэнні гэтай тэрыторыі, а таксама некаторых аб'ектаў абласнога цэнтра ў свабодную эканамічную зону «Гроднаінвест» для прыцягнення інвестыцый і развіцця турызму, паведаміў Сямён Шапіра.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Зварот і адказ

НЕ ТОЛЬКІ З ФАСАДУ БУДЗЕ ХОРАША?

ПРАБЛЕМА, якая ўзнікла па віне Ляхавіцкага малочнага завода, закранула ўсіх жыхароў райцэнтра. Не адзін год спрабавалі яе вырашыць, і толькі сёлета, здаецца, пастаўлена кропка. А калі я пачуў, што праблема «закрытая на 80%», то паехаў у Ляхавічы.

Малочны завод на працягу многіх гадоў зліваў адходы вытворчасці ў адстойнікі, якія знаходзяцца побач з райцэнтрам. І хоць сыроватка і натуральны прадукт, але падчас распаду яе над наваколлем распаўзаецца дужа непрыемны пах. А калі вецер дзьмуў з боку адстойнікаў, то ўсе жыхары і госці Ляхавічаў адчувалі адпаведны «водар».

Скаргі адсылаліся ва ўсе інстанцыі — гэтая праблема разглядалася і падчас маніторынгу, які праводзіўся ў Ляхавічах 25—27 жніўня. Тады камісія выязджала на завод, каб разабрацца ў сітуацыі на месцы. Ці ўдалося нешта змяніць?

людзі

Я іду па вуліцы Савецкай, якая працягнулася ад цэнтра Ляхавічаў аж да самых адстойнікаў. На гэтай вуліцы знаходзіцца і малочны завод.

— Я жыву на вуліцы Гагарына, але і там адчуваецца непрыемны пах, — расказала немаладая жанчына — яна была першай з апытаных. Пасля яе многія скардзіліся, і толькі адна маладзіца заявіла:

— Каля маёй хаты смуроду няма. У суседзяў можа і чуваць. А ў нас не.

— Як такое можа быць?

— А я працую на заводзе, і ў мяне ўсё добра.

Людзі адмаўляліся называць свае прозвішчы, і толькі два пенсіянеры выказаліся адкрыта.

— Я працаваў у райбальніцы на «хуткай дапамозе», і мне давялося пабываць не толькі ва ўсіх закавулках нашага горада, але і ў розных вёсках раёна. Шчыра кажучы, паветра сапсаванае нават у бліжэйшых ад райцэнтра вёсках, — заявіў Уладзімір Каваленка.

— Але ж я прайшоў усю вуліцу і нічога не адчуў.

— Сёння ўжо холадна і ціха, а летам нельга акно адчыніць. Днём і ноччу не адчыняем, — дадаў сусед Каваленкі — Уладзімір Цімашок.

Яны жывуць у непасрэднай блізкасці ад адстойнікаў, таму іх заразумець можна. У Цімашок павёў мяне да трох вадаёмаў, абнесеных дамбамі, каб я на свае вочы ўбачыў, што там робіцца.

Пах адчуваўся, але мяне здзівіла тое, што ў вадаёмах нічога не расце. Даводзілася бачыць адстойнікі каля фермаў, куды сцякала жыжа, і там буяла трава, чарот, аер, балотныя ваўчкі... А тут — чыстая паверхня. Значыць сыроватка, малочная кіслата не такія ўжо і бяскрыўдныя для наваколля.

Калі вяртаўся назад, падышоў да сямейнай пары, якая цягнула вазок з гарбузамі.

— Пах ужо не такі, як раней быў? — спытаў у жанчыны.

— Можа працэнтаў на дваццаць менш, але ўсё роўна ёсць.

— А чаго да дырэктара завода не звяртаюцца людзі?

— А чаго звяртацца, хіба нешта зменіш? Жукоўскаму гаварылі, а ён умее адказаць.

Пазіцыя жыхароў адназначная: «Ніхто нічога тут не зменіць. Камісіі прыязджалі, а ўсё застаецца па-старому». Але ж Ляхавіцкі малочны завод — прыватнае прадпрыемства, і ў яго ёсць гаспадары, якія ў свой час зрабілі на заводзе рэканструкцыю і сёння хочуць мець прыбытак. І тут да іх няма прэтэнзіі, але пра экалогію нельга забываць. Завод плаціць у раённы бюджэт падаткі, у работнікаў прадпрыемства ёсць праца і зарплата. Для Ляхавічаў — гэта ўжо нямала, бо падобных прадпрыемстваў у раёне ўсяго два. Але ж людзі ў нас на першым месцы!

Ці можна вінаваціць дырэктара завода Вячаслава Жукоўскага ў гэтай праблеме? Пад яго кіраўніцтвам прадпрыемства працуе стабільна, стала адным з лепшых на Брэстчыне. Але трэба ўлічваць, што Жукоўскі таксама, як і гаспадары завода, зацікаўлены, каб прадпрыемства давала максімальны прыбытак.

Інтарэсы людзей абараняе мясцовая ўлада, а хіба кіраўніцтва ў Ляхавічах не дыхае з жыхарамі райцэнтра адным і тым жа паветрам?!

УЛАДА

У кабінеце кіраўніка раёна **Дзмітрыя БУРДУКА** знаходзіўся і старшыня райсавета **Яўген ЮРЛЕВІЧ.**

— А праблема вырашаная, — заявіў Д. Бурдук. — Сёлета на заводзе запусцілі новы цэх па перапрацоўцы сыроваткі, і сёння яна ўжо не выкідаецца ў адстойнікі.

— Але ж людзі працягваюць скардзіцца.

— Летам тэмпература паветра даходзіла да 40 градусаў, таму не дзіўна, што на адстойніках выпарэні працягваліся, але гэта раскладаліся мінулыя накапленні.

— Я жыву ў нейкім паўкіламетры і скажу, што ў параўнанні з мінулымі гадамі праблема закрытая ўжо на 80 працэнтаў. Можа, людзі не ведаюць, што на малочным заводзе пабудавалі цэх, — дадаў Я. Юрлевіч.

— Дзмітрый Міхайлавіч, можна людзей супакоіць і паведаць ім, што ўжо ў наступным годзе ў Ляхавічах будзе пахнуць бэзам і чаромхай?

— Людзям можна сказаць, што паветра ў Ляхавічах будзе самым чыстым. А на месцы тых адстойнікаў будзе пасаджаны лес, але гэты працэс працяглы. Найперш неабходна, каб на тых картах (адстойніках) закончыліся працэсы натуральнага ачышчэння. Патрэбен час.

Каб высветліць, колькі неабходна часу для нармалізацыі эколагічнай абстаноўкі, давялося сустрэцца з начальнікам райінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **Сяргеем БАРГАМОНАМ.**

— Калі там нават нічога не рабіць, то за пяць гадоў усё стабілізуецца.

— Але чаму такая сітуацыя склалася ў Ляхавічах?

— Калі б горад быў больш буйны, то выкіды малаказавода растварыліся б у гарадской каналізацыі і ніхто не прыкмеціў бы, а так заводу прыйшлося ўзводзіць свае адстойнікі. Але хачу адзначыць, што наш горад адзіны ў краіне вырашыў гэтую праблему.

Цэх перапрацоўкі сыроваткі абышоўся заводу ў салідную суму — каля 5 мільярдаў рублёў, і цяпер гаспадаркі раёна забіраюць яе на корм жывёле. Адназначна, «выкінуць» такія грошы на экалогію гаспадарам завода было няпроста, але зробленая вялікая справа. На жаль, пра яе мала хто ведае, і адсюль у людзей такі песімізм і недавер.

Будзем лічыць, што скаргі і звароты жыхароў райцэнтра адыгралі сваю ролю. Праблема закрытая, хоць пэўны час будзе напамінаць пра сябе. Пачакаем.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

Лепшае з творчай спадчыны Казіміра Свояка

Упершыню ў гістарыяграфіі сучаснай Беларусі творчая спадчына паэта Казіміра Свояка выдадзеная асобнай кнігай. Казімір Свояк — паэтычны псеўданім каталіцкага святара і публіцыста Канстанціна Стаповіча, якога лічаць адным з пачынальнікаў духоўна-ірацыянальнай плыні ў заходнебеларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя. Казімір Свояк быў найбольш вядомы як папулярызатар беларускай мовы, які карыстаўся ёю не толькі ў паўсядзённым жыцці, але і ў царкоўнай службе.

— Амаль дваццаць гадоў ішлі да гэтай кнігі, — гаворыць **складальніца і ўкладальніца зборніка Ірына БАГДАНОВІЧ.** — Кніга ў чымсьці ўнікальная. Яна складалася нязмушана. Сабраць спадчыну Свояка было вельмі не проста: экзэмпляры «Беларускай крыніцы», дзе друкаваўся ў свой час малады паэт, не ўсе ёсць у Беларусі, таму шмат даводзілася працаваць у архівах Вільні. Я не скажу, што выдадзеная намі кніга — поўны збор твораў. Але гэта тое, што ўдалося знайсці на сёння.

Кніга пабачыла свет у серыі «Беларускі кнігазбор» і стала 54-м томам у гэтай серыі. Як распавёў **галоўны рэдактар і старшыня МГА «Беларускі кнігазбор» Кастусь ЦВІРКА,** «за савецкім часам творчая спадчына Свояка не выдавалася ні разу, таму для многіх, асабліва маладых чытачоў, кніга можа стаць вялікім адкрыццём»:

— Мы яшчэ не ведаем нашу літаратуру па-сапраўднаму — не ўсё ў ёй адкрыта да канца. Сабраць матэрыялы з перыёдыкі 20-30 гадоў было зусім не проста. Я сам не веру, што творы Свояка набяруцца на асобны том. Дзякуй Ірыне Багдановіч, якая вярнула імя Казіміра Свояка.

Сёлета спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння Казіміра Свояка. Паэт нарадзіўся ў 1890 годзе ў в. Барані Свянцянскага павета Віленскай губерні (сёння — тэрыторыя Астравецкага раёна). Пры жыцці выдаў паэтычны зборнік «Мая ліра», памёр у маі 1926 года ад сухотаў.

Ты, Божа, разсудзі: чаму народ мой бедны
Праз век гніе у цьме, ў няволі безпатольнай,
Скажы — няўжо прыказ Твой запаведны
Пакорным быць падан душы бязвольнай!?

Бо есьлі так, народ згніе ў пакоры,
Чужынцу дасьць і матку і дачку;
А сам бядак, нанет прыбіты — хворы
Жыцьцё закончыць на чужым шнурку.
(Аўтарская арфаграфія захаваная.)

Ілья ЛАПАТО.

Крымінал, здарэнні

СКРАДЗЕНЫЯ СТАРАВЕРСКІЯ АБРАЗЫ

У Бабруйскім раёне расследуецца крадзеж 14-ці абразоў. Яны зніклі са староверскай царквы «Пакровы Прасвятой Багародзіцы» ў вёсцы Туркаўская Слабада. З заявай у міліцыю звярнулася настаяцельніца царквы, 60-гадовая бабруйчанка. Апошні раз староверы бачылі абразы 2 верасня, а 26 верасня выявілі крадзеж: у замку на царкве невядомыя зладзеі перакусілі дужку. Бабруйскі РАУС распачаў крымінальную справу.

Алена КАЗЛОВА.

«ЗАКАЛЫХАЛА» І АБАКРАЛА

Зваршчык з Баранавічаў паскардзіўся ў міліцыю, што невядомы абакраў яго ноччу ў дварыдома па вул. Леніна.

Следства ўстанавіла, што наручны гадзіннік «Касіа», залаты пярсцёнак і бранзалет коштам 350 000 рублёў з хлопца зняла 16-гадовая навучэнка СГПТВ са Слоніма.

РЭШТА ЦІ СМЕРЦЬ?

У в. Казлякевічы (Баранавіцкі раён) трое мужчын вырашылі выпіць. Гаспадар хаты даў аднаму з сабутэльнікаў грошы, і той пайшоў у краму па гарэлку. Падчас выплаты гаспадар нагадаў хадаку, што той не вярнуў 3 тыс. рублёў рэшты. Успыхнуў скандал, і з мужчыны пачалі «выбіваць» грошы.

Біў хадака не гаспадар, а трэці сабутэльнік, які і нанёс 52-гадоваму мужчыну цяжкія траўмы. Калі прыехала «хуткая дапамога», небарака ўжо быў мёртвым.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

САПРАЎДНЫ АЧАГ КУЛЬТУРЫ

У Віцебску ўвечары адбыўся пажар у будынку Дома культуры. Вялікае цаглянае збудаванне, якое галоўным фасадам выходзіць якраз на Заходнюю Дзвіну, ужо гадоў дзесяць не эксплуатуецца. Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, прычына пажару — неасцярожнае выкарыстанне адкрытага агню. Ля вогнішча знаходзіліся тры грамадзяніны (усе беспрацоўныя). Іх пажарныя выратавалі. А вось што будзе далей з вялікім будынкам, каля якога часта збіраюцца бяздомныя і тыя, каму няма чаго рабіць, пакажа час. Знайшоўся б добры інвестар, які б мог там адчыніць, напрыклад, сучасны забаўляльны цэнтр. Ачаг культуры з прыстаўкай «былы» знаходзіцца ў самым цэнтры горада, у не кальких хвілінах хады ад чыгуначнага і аўтавакзалаў і чакае перамен.

ВАРТАЎНІКА НЯМА, СІГНАЛІЗАЦЫЯ НЕ СПРАЦАВАЛА

У Талачынскім раёне ноччу нехта «наведаў» краму райпа ў вёсцы Серкавіцы. Узламалі дзвярныя запоры, прабраліся ў складское памяшканне. Нішто не магло перашкодзіць рабаўніцтву: крама вартаўніком не ахоўваецца, а сігналізацыя, якая ёсць, не спрацавала, бо знаходзілася ў няспраўным стане. Зніклі прадукты харчавання, спіртныя напоі, цыгарэты. Высветлілася, што краму «ўзяў» 50-гадовы мясцовы жыхар. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Свой досвед

Пра сваю цяпліцу, якую зрабіў з аконных рам, я пісаў вясною. Але ўжо восень, і, магчыма, чытачам будзе цікава ведаць, што ў той цяпліцы выраслa.

Спачатку жонка абуралася: «Ты яшчэ і цяпліцу задумаў на мяне павесіць. Хто ў ёй будзе рабіць? Ты?!»

Але настрой у жонкі адразу змяніўся, як толькі пачалі падымацца памідоры, перцы, баклажаны... Прыедзем на дачу, дык яна адразу бяжыць у цяпліцу парадавацца. Хто не мае «шклянога дома», той многае губляе. І справа тут не толькі ва ўраджаі — у цяпліцы зусім іншае жыццё. Там усё буяе і не марнее, як бывае на адкрытым грунце. Прыкмеціў, што ў цяпліцы шмат маленькіх жабак, ды і суседскія каты любяць паляжаць у цяні раслін. Там горача, але і вільготнасць высокая. Вінаградныя кусты пачалі выкідваць паветраныя карэньчыкі. Магчыма, не для ўсіх раслін гэта добра, але не бачна, каб яны пакутавалі.

У цяпліцы памерам 25 м², акрамя вінограду, было пасаджана 35 кустоў памідораў і прыкладна 20 з іх гатунку «Аранж», а яшчэ па пяць кустоў «Чэры», «Ранішняй зоркі» ды «Благавесту». «Аранж» — гатунак вельмі ўраджайны, але, на наш погляд, празмерна салодкі. Таму губляецца таматны смак, які ёсць у чырвоных памідорах.

Гатунак «Благавест» таксама добры, але сцябло вырасла вышэй за два метры, а для цяпліцы гэта не зусім добра. «Чэры» ўвогуле трэба саджаць у адкрытым грунце, бо гэтыя памідоры не баяцца фітафторы і гоніць іх у вышыню неймаверна — да трох метраў. Гэты гатунак падыходзіць для кансервавання, бо плады памерам з чарэшню, вельмі добра раскладваюцца ў слоіку з карнішонамі.

Вось і прыйшлі да высновы, што ў цяпліцы неабходна саджаць памідоры не дужа высокія, прыкладна да 1 м, каб было больш святла і для іншых раслін.

Сабралі ў цяпліцы пад 80 кг памідораў і не ведалі, што з імі рабіць, — два кашы аддалі знаёмым.

Перцаў было пасаджана 10 кустоў двух гатункаў — «Каліфарнійскае дзіва» і «Калабок». Але калі перцы далі ўраджай, то аказалася іх пяць гатункаў. Ды і сярод памідораў «Аранж» некалькі кустоў было чырвоных «пальчыкаў». Нягледзячы на такое асарці, перцаў набралася кілаграмаў дзесяць.

Баклажаны доўга хварэлі, лісце жоўкла, і расліны былі вялымі. Цяжка было зразумець, чаго ім не хапала. Але затым набралі моц і, нягледзячы на халады, працягваюць цвісці, але ўжо пачынаюць марнець. І з імі паўтараецца тое ж, што было вясной. Баклажанам не хапала цеплыні, і таму вясной расаду неабходна высаджваць у цяпліцу не ў красавіку, як мы зрабілі, а ў другой палове мая. Для баклажанаў ідэальная тэмпература ў межах 18 °С, а калі меней, то яны хварэюць.

І баклажанаў хапіла на сям'ю, тым больш што зрывалі іх памерам 8-10 см. І зноў жа, баклажанаў купілі два гатункі, а на справе аказаўся адзін. З набыццём насення трэба быць уважлівымі. Лепш купляць яго ў спецыялізаваных дзяржаўных арганізацыях, якія маюць свае крамы.

А на вінаград, які рос у той жа цяпліцы, не мог нарадавацца. Гронкі чыстыя, буйныя і ўжо ў канцы ліпеня «Алёшанькін» выспеў, а ў сярэдзіне жніўня наліўся і вінаград «Прыгажосць Поўначы».

Вінаграду набралася два 7-літровыя вядры. Не шмат, але трэба ўлічваць, што зімой лаза была пашкоджаная марозам і вінаградныя кусты не мелі былой сілы.

Тут важна не толькі, каб ягады выспелі. Для вінограду вялікае значэнне мае і спеласць лазы. Сёлета яна карычневая, а не зялёная, як здаралася ў мінулым. Будучы ўраджай залежыць і ад гэтага фактару.

На наступны год думаю павялічыць цяпліцу на паўтара метра, каб у ёй апынуўся і астатні вінаград («Алмацінскі ранні» і «Мускат Ніна»). Чатыры рамы ў запасе ёсць, так што праблемы не будзе.

Верх цяпліцы быў накрыты плёнкай 120 мкр, але яна пад восень распаўзлася. Ураджай быў сабраны без вялікай шкоды, але хацелася, каб цяпліца ўсё ж захоўвала цяпло і пэўны час восенню. У будучым трэба будзе купляць плёнку таўшчынёй 160-180 мкр.

Магчыма, нехта скажа, што ў яго без цяпліцы выраслі перцы і памідоры. Сёлета ў гэтым нічога дзіўнага няма — надвор'е спрыяла. Але нават у такіх умовах ураджай у адкрытым грунце ў разы меншы, чым у цяпліцы, а пра тэрміны выспявання і размовы няма: прыкладна на 20 дзён розніца.

Але не толькі ўраджай радуе вока. Калі бачыш, як прывольна адчуваюць сябе ў цяпле расліны, то шкадуеш, што не маеш аранжарэі ці хоць бы абагравальнай цяпліцы. Але для гэтага патрэбна мець вольны час.

Стварыць рай на зямлі нескладана, толькі вось бывае пазнавата.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

РАСОНСКІЯ «ДАЖЫНКІ»

МАЛЕНЬКІ беларускі гарадскі пасёлак Расоны, дзе перад пачаткам Вялікай Айчыннай працаваў настаўнікам у школе Пётр Машэраў (школа носіць яго імя), літаральна за некалькі месяцаў папрыгажэў. Ды так, што яго сёння не пазнаць. А ўсё дзякуючы таму, што тут вырашылі ўпершыню правесці абласныя «Дажынкі». Раён у цэлым атрымаў шмат падарункаў, ды такіх вялікіх, што прыйшлося чапляць большасць з іх да трактароў, каб увезці ў пасёлак. Канцэрт для перадавікоў прайшоў з удзелам сталічных «зорак». Дарэчы, тутэйшыя і прыезджыя на свята нечакана для сабе ўбачылі і пачулі, як асабіста губернатар... танцуе і спявае! Выдатна! Ад душы. А як ён жа прачытаў верш на роднай мове!

Бадай, маленькі пасёлак Расоны з насельніцтвам усяго больш за 5,1 тысячы чалавек ніколі не бачыў такога маштабнага свята. Тут адкрыліся фізкультурна-аздараўленчы комплекс (а яшчэ да навагодніх святаў распачне сваю дзейнасць і басейн), вялікі ўніверсам, капітальна быў адрамантаваны мясцовы раённы Дом культуры, як і вуліцы пасёлка. А цэнтральная плошча так і «просіцца на фотаздымак». Адна з добрых навін — губернатар даў даручэнне адкрыць у раённым цэнтры вучылішча, дзе будуць рыхтаваць спецыялістаў лясной гаспадаркі.

Пакуль яшчэ свята не распачалося, карэспандэнт «Звязды» завітаў у сярэднюю школу. Дырэктар Ірына Міхайлаўна МІРАНОВІЧ на сваёй пасадзе трохі больш за дзевяць месяцаў. Расказала, што ў адзінай у райцэнтры школе вучацца 198 вучняў, выкладаюць у ёй больш за семдзесят педагогаў. Дэфіцыту кадраў няма. Па размеркаванні прыехала маладая выкладчыца англійскай мовы — выпускніца Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сярод вучняў ёсць і тыя, якія на школьным аўтобусе прыязджаюць на вучобу з суседніх вёсак... Вучні і настаўнікі працуюць на прысядзібным участку: вырошчваюць расаду капусты, памідораў, кветак.

— Тое, што не прадаём, пакідаем сабе, бо яшчэ ж пры школе ёсць інтэрнат, дзе жывуць дзеці з далёкіх ад райцэнтра вёсак. Забяспечваем іх на зіму агароднінай: бульбай, капустай, морквай, буракамі, — расказвае дырэктар. — План па аказанні платных паслуг выканалі на 122 працэнты. У школе зробім капітальны рамонт. Потым, безумоўна, пастараемся стварыць добры музей, а мо і куточак краязнаўчы.

Сотні жыхароў райцэнтра прыйшлі на адкрыццё Дома культуры, які літаральна атрымаў другое жыццё.

— Культура паказвае нацыянальны каларыт, самабытнасць усяго народа. Акрамя таго, што Дом культуры атрымаў новае жыццё, мы таксама прыгаставалі падарунак — камплект гукавога і светлавога абсталявання. Цяпер не сорамна будзе запрашаць тут выступіць ні «Сяброў», ні «Песняроў» — можна нават Патрысію Каас запрасіць, — звярнуўся да жыхароў раёна старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ. — Тое, што мы сёння бачым, як змяняюцца Расоны, гаворыць аб адраджэнні гэтага прыгожага, легендарнага раёна. У свой час абмяркоўвалася: ці далучыць Расонскі раён да Полацкага раёна, ці да нейкага іншага. Калі б так зрабілі, у выніку раён застаўся б на ранейшым узроўні. А сёння мы бачым квітнеючыя Расоны. Рамантуюцца школа і паліклініка, прыведзеныя ў парадак двары, дамы... Як мне сёння сказаў адзін гараджанін, — гэта практычна горад. Такім ён і будзе! І чым больш тут будзе дзяцей, тым больш будзе дасягненняў на гэтай прыгожай зямлі. У раёне павінна быць насельніцтва не меней за 30 30 тысяч чалавек, а ў вас усяго 11 тысяч. Таму, дарэчы жанчыны, вам задача — літаральна на працягу пяцігодкі вырашыць дэмаграфічнае пытанне. Не менш як трое дзяцей! Каб гэты Дом культуры быў напоўнены дзіцячымі галасамі. Каб тут праходзілі дыскатэкі, канцэрты...

Што тычыцца развіцця аграрнага сектара Расонскага раёна — у бліжэйшыя два гады запланавана павялічыць плошчы зямель, якія выкарыстоўваюцца для сельскагаспадарчых работ, у тры разы: да 30 тысяч гектараў. У гэтым дапамогуць іншыя раёны вобласці...

Механізатарам уручылі грашовыя прэміі і тэлевізары «Віцязь».

— За ўсю гісторыю Віцебшчыны льнаводы атрымалі самы высокі ўраджай. Не падвялі работнікі, якія займаліся нарыхтоўкай кармоў: упершыню мы не завозім корм з іншых рэгіёнаў. А летась гэта ж было, — гаварыў, віншуючы лепшых работнікаў аграрнага комплексу вобласці з «Дажынкамі», губернатар Аляксандр Косінец. — Пакуль што без дзяржаўнай дапамогі сельская гаспадарка вобласці мае мінусавую рэнтабельнасць. Але ў 2013 годзе, дзякуючы выкананню адпаведнай абласной праграмы, яна стане плюсавой. А ў 2015 годзе без датацый аграпрамысловы комплекс будзе мець рэнтабельнасць 5,7 працэнта. Пры гэтым будзем вырабляць гатовай прадукцыі на суму ад трох трыльёнаў рублёў. Палова будзе экспартавацца...

Падчас канцэрта дзяўчаты, якія спявалі шлягеры мінулых гадоў, выйшлі ў залу. Запрашалі танцаваць гледачоў і паспяваць разам. У першым радзе мужчыны чамусьці пасаромеліся. Выручыў губернатар і адзін з яго намеснікаў. Так ліха танцавалі! А губернатар яшчэ і падпеў. Дарэчы, падчас свайго выступлення перад перадавікамі на чыстай беларускай мове выдатна прачытаў верш Якуба Коласа.

Кірмашы вырабаў народных майстроў, падворкі з гандлем, дэгустацыя каўбас, сыроў, музыка і танцы — усё гэта было на «губернскіх» «Дажынках». Дарослым і дзецям вельмі спадабалася свята. Мой маленькі сын, якога я ўпершыню ўзяў у камандзіроўку, быў таксама ў захапленні. «Коні, гусі, рыбы, свінка... Тата, глядзі», — звяртаўся да мяне пяцігадовы чалавечак. Хто ведае, мо таксама стане знатным перадавіком?

«Дажынкі» з такім жа размахам і надалей будуць праводзіцца ў розных населеных пунктах Віцебшчыны. Значыць, і там стане прыгажэй, весялей, утульней жыць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Расоны — Віцебск.

Выпускнікі сустрэліся ў манастыры

Пустынскі манастыр, што на Мсціслаўшчыне, 2 кастрычніка сабраў выпускнікоў і колішніх супрацоўнікаў дзіцячага дома і школы, якія існавалі на яго тэрыторыі яшчэ ў савецкі час.

Свята-Успенскі манастыр, які знаходзіцца на беларуска-расійскім памежжы, вядомы з 1380 года. Мсціслаўскі князь Сімяон Лугвен заснаваў яго на месцы гаючай крыніцы, якая, паводле падання, вярнула яму зрок. Крыніца застаецца месцам паломніцтва і да нашых дзён.

Савецкая ўлада ў 1925 годзе арганізавала на тэрыторыі манастыра дзіцячы дом для беспрытульнікаў, які праіснаваў 45 гадоў. Яго выпускнікоў размяркоўвалі ў рамесныя вучэльні па ўсім Савецкім Саюзе.

Агульнаадукацыйную школу ў былым манастыры наведвалі выхаванцы дзіцячага

Наўздагон

«У НАС ЛЮДЗІ ВЕДАЮЦЬ: КАЛІ БЕЛАРУСКАЕ — ЗНАЧЫЦЬ ЯКАСНАЕ»

СВАІМІ ўражаннямі ад прэс-тура, які прайшоў у Беларусі на мінулым тыдні, з карэспандэнтам «Звязды» падзяліліся прадстаўнікі расійскіх рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі.

Аляксандр МАРЫНАЎ, галоўны рэдактар газеты «Наша Пенза»:

— Я з задавальненнем езджу ў Беларусь. І не толькі таму, што з гэтай краінай у мяне звязаныя самыя цёплыя ўспаміны (Аляксандр Іванавіч 40 гадоў таму служыў у Баранавічах. — **Н. Д.**). Чытачы тэлефануюць і пытаюцца, калі я паеду зноў у Беларусь. Публікацыі пра вашу краіну нашы людзі чытаюць з вялікім задавальненнем. Аб гэтым сведчаць шматлікія водгукі, якія прыходзяць у рэдакцыю.

У нас у горадзе можна набыць беларускія тавары. Не скажу, што ў кожнай сям'і, але ў мяне дома і сокавыціскалка беларуская, і халадзільнік «Атлант»... Беларуская бытавая тэхніка вельмі надзейная, і не дарагая. Што тычыцца абутку, то перавагу таксама аддаю беларускаму. Звычайнага абутку мне хапае месяцаў на пяць-шэсць. Я шмат хаджу пешшу. А вось гэтым беларускім туфлям, якія зараз на мне, ужо два гады. А выглядаюць, самі ж бачыце, як новыя, і зносу ім няма. За гады службы ў Беларусі аб'ездзіў шмат беларускіх гарадоў. Зараз, падчас прэс-тураў , у якіх удзельнічаю не першы раз, што раз дзіўлюся іх новаму абліччу. Усё мяняецца ў лепшы бок: гарады сталі больш сучаснымі, больш прыгожымі. Вельмі ўражвае таксама, як беражліва беларусы ставяцца да сваёй гісторыі: на свае вочы мы, расійскія журналісты, бачылі, што рэстаўруецца Нясвіжскі замак, будуецца Храм-помнік Усіх Святых. Так беражліва адносіцца да сваёй гісторыі, бясспрэчна, могуць толькі сапраўдныя патрыёты.

Наталля СУПРАГА, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Рэспубліка Башкартастан»:

— У нас у Башкартастане вельмі каціруюцца беларускія трактары, рэклама якіх пастаянна друкуецца на старонках нашай газеты. У горадзе, акрамя таго, ёсць некалькі крамаў, дзе прадаецца беларускі трыкатаж. Беларуская прадукцыя карыстаецца папулярнасцю, нашы людзі ведаюць, што калі беларускае — значыць якаснае. На гэтым тыдні мы наведалі такія прадпрыемствы, як «Белкамунмаш», «Амкадор», «Камунарка». Склалася адчуванне, што краіна працуе, што беларусы занятыя, што ў іх ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні, пра іх клапоціцца кіраўніцтва. Я думаю, што гэта надае людзям аптымізм, без якога, як мне здаецца, любому чалавеку жыць проста немагчыма.

Генадзь ЕМЯЛЬЯНАЎ, рэдактар аддзела газеты «Марыйская праўда» (Рэспубліка Марый Эл):

— Я раней наведваў Мінск з прыватнымі візітамі. Мне заўсёды падабаўся гэты горад, яго чысціня, парадак і, перш за ўсё, безумоўна, — людзі. І на гэты раз з задавальненнем наведаў вашу краіну ў складзе гэтага прэс-тура. Мы праехалі па многіх раёнах Мінскай вобласці. Не магу не адзначыць парадак і чысціню на палях. Відавочна, што ўсе кавалкі зямлі выкарыстоўваюцца з розумам. Радуюць і поспехі тых прадпрыемстваў, якія мы наведалі. Я размаўляў і раней з людзьмі і ведаю, што жыць у Беларусі можна — гэта добрая краіна. Я рады, што кіраўнік прадпрыемства «Белкамунмаш» ведае пра існаванне такога краю, як Марый Эл. Ведае, што гэта, як ён выказаўся, — «тралейбусная рэспубліка». У нас пакуль не ходзяць беларускія тралейбусы. Я думаю, што наспеў час памяняць стары тралейбусны парк і набыць такія машыны, якія выратуюць мінскае прадпрыемства. У мяне ў Беларусі шмат сяброў. І, паверце, ніякія палітычныя непаразуменні не паўплываюць на нашы добрыя, сапраўды брацкія, адносіны.

Аляксандр КОРСУНАЎ, галоўны рэдактар газеты «Арэнбуржжа»:

— Мне Беларусь вельмі падабаецца, падабаюцца людзі. Я кажу гэта ад душы. Усе сустрэчы, якія былі арганізаваныя падчас чарговага прэс-тура, пакінулі прыемнае ўражанне. Беларусы добрыя і гасцінныя. У краіне ўражвае парадак на вуліцах і арганізацыя працы на прадпрыемствах. Відавочна, што краіна мацнее эканамічна, адпаведна расце і дабрабыт людзей. Упершыню з савецкіх часоў убачыў на прадпрыемствах дошку гонару і ганьбы. Вельмі важна, на мой погляд, што людзям не толькі своечасова плацяць зарплату , але і ацэньваюць іх працу добрым (а калі трэба, то і дрэнным) словам. Гэта стымулюе, кожны работнік павінен адчуваць сваю значнасць. Шмат чакаю ад інтэрв'ю з Прэзідэнтам. Аляксандр Лукашэнка быў у нас у Арэнбургу. Тады я пераканаўся, што ён разумны чалавек і цудоўны прамоўца. Яго цікава слухаць.

Аляксандр КАМРАКОЎ, галоўны рэдактар газеты «Волжская камуна» (г. Самара):

— Нам, напэўна, паказваюць лепшае. Але тое, што паказваюць, сапраўды, уражвае. І перш за ўсё — парадак, які тут паўсюль: як на вуліцах гарадоў, так і на прадпрыемствах і культурных аб'ектах. Хочацца адзначыць, што ў Беларусі эканоміка развіваецца неадрыўна ад сацыяльнага складніку. На мой погляд, вельмі важна, каб кіраўніцтва прадпрыемстваў не толькі ставіла мэтай зарабіць грошы, але і клапацілася пра сваіх работнікаў. Кожны павінен адчуваць сябе абароненым. Кідаецца ў вочы і вялікая колькасць забудоў і новых дамоў. У Самары добра ставяцца да беларусаў. А тое, што існуюць на ўзроўні асобных расійскіх СМІ крытычныя вострыя выказванні ў адрас краіны-суседкі... Гэта асабліва не ўплывае на адносіны паміж сабой брацкіх народаў. Людзі ж не дурні, могуць адрозніць палітычную гульню ад праўды.

Алег ЧЭРКАВЕЦ, спецыяльны карэспандэнт газеты «Праўда» (г. Масква):

— Я не першы раз у Беларусі, і меркаванне аб вашай краіне, якое ўжо даўно было сфарміраванае, толькі ўмацавалася. Падчас нашага насычанага прэс-тура мы пазнаёміліся з работай сумеснага беларуска-кітайскага прадпрыемства «Мідэя-Гарызонт». Прадпрыемства новае, але яно ўжо паспела заняць сваю нішу перш за ўсё на замежных рынках. Вось вам яскравы прыклад, як вялікі Кітай — эканамічны гігант — праяўляе вялікую цікавасць да маленькай, як часам любяць гаварыць асобныя масквічы, Беларусі. Для параўнання: з Расіяй Кітай такіх дамоўленасцяў не заключае... Абмяжоўваецца ў асноўным дагаворамі аб пастаўцы сваіх тавараў. Уразіў таксама і цудоўны парад тэхнікі, які паказалі на прадпрыемстве «Амкадор». А вось чысціня на вуліцах даўно не здзіўляе — гэта норма. Падчас прэс-канферэнцыі старшыня Мінгарвыканкама патлумачыў, што на пустым месцы нічога не бывае, каб падтрымліваць гэту чысціню, даводзіцца прыкладаць пастаянныя намаганні.

Запісала Надзея ДРЫЛА.

ЧАС САЛІСТАЎ

Маладыя музыканты краін СНД вучацца ў Мінску пад патранатам Башмета.

Любімы інструмент беларусаў — напэўна, альт. Любімы музыкант — напэўна, Башмет... Бо ўжо пяты раз наша краіна праводзіць Міжнародны фестываль Юрыя Башмета, народнага артыста СССР, які вядомы ў свеце сваёй віртуознай ігрой на альце. На мінскім фестывалі, які афіцыйна адкрыецца 6 кастрычніка, Юрый Башмет будзе выступаць як саліст і дырыжор камернага ансамбля «Салісты Масквы». Аднак уладальнік прэміі «Грэмі», якога ў Мінску слухаюць кожны год, сёлета чакае ў якасці госця фестывалю яшчэ аднаго ўладальніка прэміі «Грэмі» — скрыпача Гідона Крэмера і камерны ансамбль «Крэмерата-Балтыка».

7 кастрычніка на музычным небасхіле будуць ззяць «Зоркі пакаленняў». Гэта канцэрт, дзе Крэмер і Башмет выступяць разам з беларускім піяністам Расіславам Крымерам і літоўскай віяланчэлісткай Гіёдрэ Дырванаўскайтэ. У фестывальныя дні на сцэне Белдзяржфілармоніі пройдуць канцэрты з удзелам зорак сусветнай класічнай музыкі, Дзяржаўнага акадэмічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава, ансамбля старадаўняй музыкі «Хортус-Музыкус», выдатнага піяніста, народнага артыста Расійскай Федэрацыі Аляксея Любімава і іншых. На заканчэнне — 13 кастрычніка — запланаваны канцэрт з удзелам дырыжора і кіраўніка «Аркестра нацый» Юстуса Франца, які паспяхова працуе з аркестрам Марыінскага тэатра і Варшаўскім сімфанічным аркестрам. Аднак усё пачалося з моладзі 3 кастрычніка, яшчэ напярэдадні афіцыйнага адкрыцця, калі пачала сваю дзейнасць Моладзевая акадэмія краін СНД. Пачынанне такое ўвялі ў праграму летась. Маладыя музыканты мелі магчымасць пастаяць побач, паслухаць, павучыцца ў сусветных зорак. Для 30 маладых музыкантаў з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Малдовы, Расіі, Узбекістана, Таджыкістана, Туркменістана падобныя майстар-класы пройдуць сёлета.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЕМ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

НАИМЕНОВАНИЕ, МЕСТОПОЛОЖЕНИЕ, ЦЕЛЕВОЕ НАЗНАЧЕНИЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

2 (два) земельных участка для строительства и обслуживания жилых домов, расположенных по адресу: Минская область, Молодечненский район, г.п. Радошковичи, пер. Янковского № 37 (кадастровый номер 623855700005000325) и № 40 (кадастровый номер 623855700005000326) с ориентировочной площадью каждого 1500 м², с начальной ценой 19 188 000 рублей за один участок. Расходы, связанные с формированием земельного участка (изготовление землеустроительного дела) и с госрегистрацией, подлежат возмещению победителем аукциона в сумме 1085936 рублей. Шаг аукциона установлен в размере 5 % от предыдущей цены.

ПРОДАВЕЦ — Радошковичский поселковый исполнительный комитет.

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА — СИКУП «УКС-СЕРВИС».

СУММА ЗАДАТКА — 1 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, получатель платежа: СИКУП «УКС-СЕРВИС».

ФОРМА, УСЛОВИЯ ОПЛАТЫ — платеж в размере цены приобретения объекта за вычетом суммы задатка на р/с 3600622100000 филиал № 601 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 769, получатель платежа: Радошковичский поселковый исполнительный комитет, код платежа — 04002, УНН 600027604 ОКПО 04432972, согласно протоколу аукциона, в течение 20-ти рабочих дней со дня получения протокола аукциона. Возмещение расходов, связанных с формированием объекта (изготовление землеустроительного дела) и госрегистрацией перечислять также на указанный счет с кодом платежа — 04616.

ДОКУМЕНТЫ, ПРЕДОСТАВЛЯЕМЫЕ ДЛЯ УЧАСТИЯ В АУКЦИОНЕ: заявление на участие, заверенная банком копия платежного документа на внесение задатка; физическим лицам — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, юридическим лицам — копию учредительных документов и свидетельство о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица.

КОНЕЧНЫЙ СРОК ПРИЕМА ЗАЯВЛЕНИЙ — 05.11.2010 г. до 11.00.

АДРЕС, ПО КОТОРОМУ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВЛЕНИЯ: г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

ДАТА, ВРЕМЯ, МЕСТО И ПОРЯДОК ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА — 05.11.2010 г. в 14.00 по адресу: г. Молодечно, ул. Мира, д. 15, к. 1.

Аукцион состоится при наличии не менее двух участников на один лот.

Тел. для справок: 8 (0176) 73 00 13, 75 16 09, 8 (044) 710 74 60.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» сообщает об отказе от проведения аукциона, назначенного на 12 октября 2010 года в 12.00 (газета «Звязда» от 8 сентября 2010 года № 175) по продаже одним лотом капитального строения (инв. № 631/С-13632), капитального строения (инв. № 631/С-13634) и капитального строения (инв. № 631/С-13827), расположенных по адресу: Минская область, Вилейский район, Осиповичский с/с, д. Холянино, находящихся в республиканской собственности и в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Зенит-БелОМО», и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания объектов, в связи с необходимостью внесения изменения в Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 16 июля 2010 г. № 1071 в части изменения оценочной стоимости капитального строения (инв. № 631/С-13632), определенной по состоянию на 1 января 2010 г.

Парламенцкі дзённік

ГУЧНЫ РЭГІСТР

База персанальных звестак беларускага насельніцтва павінна быць сфарміраваная да 2013 года

Фінансавы крызіс змяніў многія правілы гульні, унёс карэктывы ў шматлікія працэсы, адсунуў на другі план цэлыя праекты. Адзіны рэгістр беларускага насельніцтва напаткаў якраз такі лёс. Налета ён ужо быў бы сфарміраваны (паводле закона, прынятага яшчэ ў 2008-м). Калі б не адно грашовае «калі». Ад такіх бюджэтных выдаткаў адмовіліся на карысць сацыяльных праграм. Цяпер яго стварэнне вымяраецца адрэскам часу да 2013 года. Менавіта папраўкамі ў Закон «Аб рэгістры насельніцтва», якія дэпутаты прынялі ўчора адразу ў двух чытаннях.

Што ўяўляе сабой рэгістр? Гэта своеасаблівая база персанальных звестак пра грамадзян. Захоўваюцца яны ў выглядзе аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы. Таму карэктывы можна ўносіць вельмі аператыўна. Упаўнаважаныя на тое шэраг дзяржорганаў, мясцовыя ўлады, агульныя суды, ЗАГСы і ваенныя камісарыяты.

Такая база звестак зробіць больш эфектыўнай работу па прынцыпе «аднаго акна», мяркуе **міністр унутраных спраў Анатоль КУЛЯШОЎ**. Забяспечыць хуткае атрыманне інфармацыі для самога грамадзяніна і ўсіх структур — пачынаючы ад мясцовага кіравання і да найвышэйшых органаў улады.

Паралельна з фарміраваннем рэгістра рыхтуецца і ўвядзенне біяпашпартоў. Закупка абсталявання, якаснага праграмнага прадукту, безумоўна, патрабуе фінансавых і часавых затрат. Аднак верагодна, працэс гэты давядзецца фарсіраваць, — адзначае кіраўнік ведамства. Паколькі не выключана, што краіны Еўропы ў хуткім часе не будуць пускаць на тэрыторыю сваіх краін без такога дакумента.

КАЛАСАЛЬНА СКЛАДАНАЯ ЗАДАЧА

Такой уяўляецца фінансістам утрыманне налета павышаных заробкаў бюджэтнікам

Пакет найважнейшых фінансавых дакументаў будучага года ўхвалены сенатарамі на першым пасяджэнні восеньскай сесіі. Гэта стала магчымым дзякуючы таму, што дэпутаты разгледзелі яго на пазачарговай сесіі ў верасні.

Даходы кансалідаванага бюджэту-2011, нагадаем, складаюць — 54,5 трлн руб. Дэфіцыт запланаваны ў суме 6 трлн рублёў (3% да ВУП). Такі ўзровень, паводле слоў **міністра фінансаў Андрэя ХАРКАЎЦА**, адпавядае міжнародным стандартам фінансавай бяспекі. Бюджэт звярстаны з улікам інфляцыі ў восем адсоткаў за год. А сярэднегадавы курс долара, паводле прагнозаў фінансістаў, складзе 3170 рублёў.

Прыняты парламентарыямі законапраект абяцае бюджэтнікам істотнае прыбаўленне заробку. Летась, як нагадаў міністр фінансаў, заробкі наогул не павышаліся. З пачаткам лістапада павысіцца тарыфная стаўка першага разраду (да 118 тыс. руб.) ды мінімалка. Запланаванае маштабнае павелічэнне, як выказаўся кіраўнік ведамства, проста пакрывае тое, што павінна было рэалізоўвацца краінай паступова. Ён падкрэсліў, што «пакуль для краіны цяжка рэалізаваць падобнае павышэнне». Варта браць у разлік, што на 10 працэнтных пунктаў павялічыцца ў бюджэце ўдзельная вага заробкаў, сацыяльных выплат. Гэта азначае істотнае змяненне структуры, а па сутнасці — неабходнасць стрымліваць усё астатняе. Суцяшае толькі тое, што «павышаючы сацыяльныя гарантыі, зніжаючы падаткі, мы спрабуем выйсці на сітуацыю, калі эканоміка будзе самастойна генерыраваць рэсурсы, і гэта пасадзейнічае, у тым ліку, і напаўненню бюджэту».

А вось утрымаць гэтыя заробкі налета — задача і ўвогуле «каласальна складаная».

— На наступны год мы не ставім амбіцыйных задач па далейшым росце. Бюджэт разлічваецца, зыходзячы з таго, каб захаваць рэальныя заробкі, якіх мы дасягнулі на канец гэтага года, — дзеліцца з сенатарамі А. Харкавец.

«СЕНАТАРСКІ ТЭРМІН»

Па справе аб хабары асуджаны былы член Савета Рэспублікі

Тэрмін у чацвёртым скліканні Савета Рэспублікі для Аркадзя КАРПУЦЯ скончыўся заўчасна. Віной таму іншы тэрмін — пазбаўленне волі на два гады за падрыхтоўку да дачы хабару ў буйным памеры. Гэтую інфармацыю агучыў на пасяджэнні сесіі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Яўген СМІРНОЎ. Такі прысуд вынесены былому старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 12 жніўня. Копія дакумента, якая паступіла ў верхнюю палату парламента, стала падставай для рашэння сенатараў. Яны датэрмінова пазбавілі паўнамоцтваў былога калегу. У верхняй палаце Аркадзь Карпуць займаў пасаду намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Выбары-2010

«І ЛЮДНЫ КАСТРЫЧНІК НАПЕРАДЗЕ...»

Самыя мітуслівыя месцы сталіцы з мінулага чацвярга сталі яшчэ больш запоўненымі. У пераходах, на выхадах станцый метро, ля кірмашоў людзі ў разнастайных камізэльках і шаліках выстаўляюць, бы музейны экспанат, кардонную шыльду з партрэтам патэнцыйнага Прэзідэнта. Кожны са сваім. Некаторыя нават з двума...

— Вось, калі ласачка, у мяне можна і за Раманчука, і за Саннікава, — падсоўвае мне адразу дзве папкі спрытны зборшчык подпісаў.

За некалькі дзён работы ён разжыўся ўжо шасцю сотнямі аўтографаў, прычым пакідаюць іх не толькі мінчане, але і... госці сталіцы з самых розных куткоў краіны. Калі яшчэ з паўтары сотні яго калег могуць пахваліцца такім вынікам, то місія ўсёй групы, лічы, ужо выкананая.

Цьфу-цьфу, каб не сурочыць, але народ наш да лёсавызначальнай электаральнай падзеі неабыякавы. Пікеты не тое што не пустуюць — ля некаторых нават выстройваюцца чэргі. Пакуль стаяць, кагалам абмяркоўваюць кандыдатуру. Актыўна, у фарбах, з запалам. Праўда, усё больш з пазіцый знешнасці. «Гэны дужа малады!», «Ці есць ён штось, ці не?!», — непакоіцца электарат. Шкада, што не праграмы кандыдатаў іх так чапляюць, затое якая аднасць ды супольнасць! Такую, акрамя як у чарзе, нідзе больш і не адчуеш! У многіх, як і ў спрытнага зборшчыка подпісаў, задаткі шматстаночнікаў:

— Я вырашыў за ўсіх падпісацца, — старанна выводзячы подпіс, кажа дзядок. — Няхай усе вылучаюцца, а там паглядзім, хто чаго варты.

17 прэтэндэнтаў у прэзідэнты — маладых і не вельмі — і... людны кастрычнік наперадзе. Людзі ахвотна дзеляцца сваімі аўтографамі, некаторыя шчыра засмучаюцца, што гэтага нельга зрабіць без пашпарта, і абяцаюць вярнуцца на пікет ужо ў поўным «узбраенні».

А вось **міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль КУЛЯШОЎ** свой подпіс у падтрымку таго ці іншага кандыдата пакінуць яшчэ не паспеў. Кажа, ніхто да яго з гэтым пакуль не звяртаўся (Гэй, зборшчыкі подпісаў, будзьце больш актыўнымі!). Аднак у прафесійным плане, як кіраўнік праваахоўнага ведамства, арыентаваны на ўсялякую падтрымку гэтаму этапу выбарчай кампаніі:

— Уся сістэма МУС у такі адказны перыяд скіраваная на аказанне дапамогі, а ніяк не супрацьдзеянне групам, якія займаюцца зборам подпісаў.

Супрацоўнікі міліцыі, паводле яго слоў, нават калі прыкмячаюць асобныя нязначныя парушэнні, толькі канстатуюць іх і не робяць ніякіх захадаў па стрымленні. Імкнуцца быць «максімальна карэктнымі, паважлівымі, ніякім чынам не перашкаджаць». Сур'ёзных інцыдэнтаў імі пакуль не зафіксавана.

Спакойны і паспяховы, хоць пры гэтым і досыць актыўны, характар працякання выбарчай кампаніі адзначаюць і ў ЦВК. Якому па традыцыі даводзіцца выконваць ролю трацейскага суддзі ў спрэчных момантах. Куды ж без іх! Зборшчыкі подпісаў, напрыклад, скардзяцца на залішні ціск з боку службовых асоб.

— Не ўсе кіраўнікі нашых устаноў разумеюць, напрыклад, што тэрыторыя, якая прылягае да крамы, не з'яўляецца яе тэрыторыяй, — дзеліцца ўражаннямі з журналістамі **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА**.

Ёсць, праўда, і супрацьлеглыя выпадкі: калі за электарат змагаюцца так зацята, што нібыта перашкаджаюць іншым той электарат абслугоўваць...

— Некаторыя групы паводзяць сябе настолькі бесцырымонна, перашкаджаючы працы крам і пакупнікоў, што плачуць ужо гэтыя магазінныя ўлады, — кажа кіраўнік ЦВК.

Аднак усе спрэчныя моманты з арганізацыяй пікетаў, паводле яе слоў, вырашаюцца паспяхова. Тым часам у Цэнтральнай камісіі чакаюць кіраўніка назіральнай місіі СНД Сяргея Лебедзева. Сустрэча з ім запланаваная на 6 кастрычніка. Тады ж, трэба меркаваць, і акрэдытуюць першых міжнародных назіральнікаў.

Усё яшчэ толькі пачынаецца, так што самы «людны» час — відаць, наперадзе.

Зоя ВАРАНЦОВА.

І ЗНОЎ СУСТРЭЧЫ З НЯМЕЦКАЙ КУЛЬТУРАЙ

4 кастрычніка ўжо ў сёмы раз у нашай краіне пачаўся «Тыдзень Германіі». Сёлета ён мае тэматычную афарбоўку і ў асноўным прысвечаны знакавай падзеі ў жыцці нямецкага народа — 20-годдзю Германскага адзінства.

Юбілей стане цэнтральным пунктам праграмы Тыдня. З гэтай нагоды запланаваныя разнастайныя мерапрыемствы: дыспуты, дыялогі, «круглыя сталы», сумесныя наведванні музеяў і іншых устаноў культуры краіны. Акрамя таго, можна будзе ўбачыць лепшыя нямецкія фільмы, паслухаць лекцыю аб галерэйным жыцці Германіі і сучасным нямецкім мастацтве. Не застануцца без увагі таксама літаратура, музыка, тэатр, мода і мова. Праграма Тыдня прадугледжвае знаёмства беларусаў са здабыткамі немцаў у гэтых сферах. Не менш цікавым будзе і навукова-адукацыйны бок Тыдня. У БДУ асобны дзень вырашана прысвяціць знаёмству з досведам вядзення навуковых даследаванняў у Германіі. У сваю чаргу, маладыя беларускія вучоныя змогуць пазнаёміць нямецкіх калег і гасцей са сваімі распрацоўкамі і дасягненнямі ў розных галінах навукі. Запланаваныя таксама мерапрыемствы, якія дазволяць жыхарам Беларусі лепш пазнаёміцца з асаблівасцямі і традыцыямі паўсядзённага жыцця немцаў — напрыклад, культурай ужывання алкагольных напояў. У прыватнасці, прэзентацыя чырвонага віна ў мінскім рэстаране «Вестфалія» дазволіць запрошаным адчуць смак лепшых марак він Германіі.

Настасся КАПЧЫНА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лесаруб Мікалай ДАДОНАЎ з Езярышчынскага лясніцтва Гарадоцкага раёна.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 8 ноября 2010 г. открытого аукциона по продаже земельного участка

Наименование и характеристики продаваемого имущества	Обращенный в доход государства земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома
Сведения о земельном участке	Кадастровый номер 500000000004000879, площадь 0,1020 га
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Взлетная, 29
Сведения о собственнике	Савилов Д.А.
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, 220030, г. Минск, (017) 227 40 22
Начальная цена	88 584 000 белорусских рублей
Сумма задатка	8 000 000 белорусских рублей

К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **8 ноября 2010 г. в 15.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.10.2010 по 05.11.2010 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22.

Абзац

◢ Віцебская філармонія запрашае на канцэрты для цяжарных. У сёлетнім канцэртным сезоне тут пачынаецца ўнікальны праект — канцэрты класічнай музыкі для жанчын, якія збіраюцца нарадзіць. Будучым мамам прапануюць паслухаць музыку Баха, Моцарта, Дунаеўскага і іншых кампазітараў — у жывым выкананні. Тут жа навучаць спяваць калыханкі — класічныя і беларускія.

◢ Уначы 4 кастрычніка невядомы мужчына патэлефанаваў у міліцыю і паведаміў, што на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» закладзеная выбуховая прылада. Сапёры тут жа адправіліся абследаваць тэрыторыю комплексу, дзе заўсёды шмат турыстаў. Але ніякіх выбухованебяспечных прадметаў не было выяўлена. Затое высветлілі асобу «мінёра». Ім аказаўся 26-гадовы жыхар горада, які нідзе не працуе і мае праблемы са здароўем.

◢ У Брэсцкім раёне на піларме загінула 23-гадовая рабочая замежнага прадпрыемства «Будімекспрам». Трагедыя адбылася на тэрыторыі піларамы прадпрыемства ў вёсцы Вялікая Курніца. Маладую жанчыну зацягнула пад рэзальную частку пілы. Установлена, што загінулая не мела дапуску да працы на гэтым абсталяванні. Эксплуатацыя пілы ажыццяўлялася з парушэннямі заканадаўства аб ахове працы.

◢ Гамяльчанін за 3 хвіліны з'еў 19 сасісак. Аб`яднанне «Гомельмясамалпрам» у суботу ўпершыню арганізавала абласны фестываль «Мяса-малочная краіна - 2010». Падчас фестывалю прайшло некалькі вясёлых конкурсаў. Паводле ўмоў «сасісачнага»спаборніцтва, удзельнікі павінны былі за тры хвіліны з'есці 30 вараных сасісак. З васьмі ўдзельнікаў зрабіць гэта не ўдалося нікому. Выйграў гамяльчанін, які з'еў за тры хвіліны 19 сасісак. Ён атрымаў ва ўзнагароду некалькі кольцаў любімага прадукту.

Поўны абзац

◢ Брытанскі кіроўца ўстанавіў новы сусветны рэкорд, пераадолеўшы адлегласць амаль у 2,5 тыс. км без дазапраўкі. Гэвіну Канвэю, які кіраваў аўтамабілем Volkswagen Passat Bluemotion, хапіла аднаго бака паліва, каб дабрацца з Лондана да іспанскага горада Малага. Паездка заняла 34 гадзіны пры сярэдняй хуткасці 72 км/ч. Сярэдні расход паліва склаў каля 3л/100км, што істотна ніжэй, чым папярэдні рэкорд, які склаў 4,3л/100км. Аўтамабіль, на якім быў устаноўлены рэкорд, абсталяваны дызельным рухавіком 1,6 літра.

◢ Пяціметровы шэдэўр цырульніцкага мастацтва папоўніў Кнігу рэкордаў Украіны. Прычоску ў выглядзе вежы з ажурных пляценняў пад назвай «Вікторыя» збудавала майстар з Луганскай вобласці. На яе выраб яна патраціла 3 месяцы, а на мантаж канструкцыі на галаве мадэлі спатрэбілася каля гадзіны і паўкіло лаку. Важыць збудаванне 4 кг, на галаве яго трымае пластыкавы каркас. Вышыня прычоскі перавысіла папярэдні рэкорд на паўтара метра.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Ну і ну!

ДВА ПРЫЧЭПЫ СМЕЦЦЯ... З КВАТЭРЫ

У Віцебску ў адным з жылых дамоў — хрушчовак па вуліцы Лазо — некалькі гадоў жыхары пакутавалі з-за інтэлігентнага суседа. Як такое можа быць? Можа, калі сусед — насамрэч інтэлігентны чалавек (выкладчык), але, мякка кажучы, трохі жыве не так, як астатнія. У прыватнасці, трымае ў сваёй трохпакаёўцы мноства сабак і кошак, захоўвае тое, што збірае на вуліцы... Непрыемны пах, тараканы — усе гэтыя пакуты сталі непрыемнай асаблівасцю дома. Скардзіліся незадаволеныя ў ЖЭУ-14, які абслугоўвае іх дом. Ды, на жаль, паразумення так і не знайшлі.

Пра свае беды і няшчасных суседзяў расказала мне чытачка. Што рабіць? — пацікавілася яна ў надзеі. І дадала, што нават спрабавалі неяк паўплываць на суседа і пры дапамозе ўчастковага. Ды не атрымалася. Камунальнікі толькі канстатавалі, што, маўляў, ім і міліцыянеру гаспадар дрэнна пахнучай кватэры проста дзверы не адчыніў.

Параіў чытачцы выклясці пісьмова праблему ў камітэт дзяржаўнага кантролю — заказным лістом і пажадана не за адным подпісам. Дараду паслухалі і рэалізавалі. Зварот, падпісаны жыхар васьмі кватэр, у выніку зрабіў «звычайны цуд». Раптам кватэрай і суседам пачалі цікавіцца прадстаўнікі камунальнай, санітарнай службаў... І міліцыянер, як заўважылі суседзі, наведаў праблемнага суседа.

Сапраўднай святочнай падзеяй для суседзяў «дзіўнага чалавека» стала назіранне таго, як брыгада камунальнікаў акуратна «разгружала» кватэру ад смецця. Самыя ўважлівыя падлічылі мінімум два прычэпы, запоўненыя розным хламам. Непрыемны пах хутка знік. Жывёл вывезлі на спецыялізаваную базу. Праўда, некаторыя суседзі завяраюць, што жывёл хай і стала меней, але некалькі ўсё роўна засталіся ў кватэры. А як праверыць? Зноў скаргу пісаць? Зноў хутка прыйдзецца скардзіцца ў рэдакцыю, кантралёрам?

Адразу ж напрошвалася пытанне: няўжо тыя ж камунальнікі, якія праігнаравалі просьбы жыхар дома, не падумалі пра тое, што ўсё роўна тыя будуць прымаць меры: тэлефанаваць, пісаць у іншыя інстанцыі, каб разабраліся ў сітуацыі і аказалі рэальную дапамогу?

Ці зрабіў адпаведныя высновы інтэлігенты сусед — час пакажа. Між іншым, як адзначае чытачка, у афіцыйным лісце, атрыманым пасля праведзенай работы па вывучэнні скаргі, у ліку іншага паведамлялася і пра тое, што з суседам па месцы ягонай службы таксама правялі «тлумачальную работу».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ КОНКУРСОВ

Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь извещает о проведении 26 ноября 2010 г. открытых конкурсов по продаже принадлежащих Республике Беларусь акций: ОАО «Бархим» – в 10.00; ОАО «Речицкий текстиль» – в 11.00.

Продавец – Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Красноармейский, 12.

Для участия в конкурсе в срок до 16.00 10 ноября 2010 г. по адресу: г. Минск, пер. Красноармейский,12, каб. 401 необходимо предоставить документы, полный перечень которых размещен на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www.gki.gov.by).

Получить более подробную информацию об акционерных обществах, условиях конкурсов, ознакомиться с годовой бухгалтерской отчетностью акционерных обществ по состоянию на 1 января 2010 г., проектом договора купли-продажи акций можно по адресу: г. Минск, пер. Красноармейский, 12, каб. 401.

Контактные телефоны:

Фонд государственного имущества Государственного комитета по имуществу (017) 284 85 62.

Департамент ценовой политики Министерства экономики (017) 200 68 45, 222 67 17.

| № | Полное и сокращенное наименования открытого акционерного общества, его адрес | Уставный фонд, шт. акций | Номинальная стоимость акции, рублей | Доля государства в уставном фонде | | Предлагается для реализации | | Начальная цена | | Задаток*, рублей | Условия конкурса в отношении акционерного общества | Земельные участки, зарегистр

ШКОЛЬНАЯ ГРАМАТА ДЛЯ БАЦЬКОЎ, ці Як дапамагчы прывыкнуць да школы першакласніку

УСІМ нам не раз даводзілася адаптавацца да новых умоў: прывыкаць, падстройвацца, прыстасоўвацца. Кожны дарослы адчуў гэта на сабе і разумее, наколькі бывае складана. Адаптацыя патрабуе ўсіх сілаў арганізма. А цяпер уявіце сабе малое дзіця, якое трапляе ў новы калектыў, дзе ўмовы, правілы... Вялікі стрэс для маленькага чалавека.

Фота Пятра ФАМІНА.

— Існуе агульная пазіцыя, што адаптацыя — гэта стрэс і вельмі сур'ёзная нагрузка на дзіця, — гаворыць **Вольга ГАЛАЎНЁВА, кансультант-псіхолаг сайта Ребенок.BY** — Але трэба разумець, што стан, калі чалавек трапляе ў новыя ўмовы, гэта не заўсёды дрэнны. Ён нясе ў сабе і пазітыў. У гэтай сітуацыі чалавек максімальна ўспрымальны да новых правілаў. Усе сістэмы арганізма настройваюцца на тое, каб прыняць сваю новую ролю.

Самае складанае правіла для дзяцей у школе — неабходнасць займацца не заўсёды цікавым. Важна прымусіць сябе сядзець на месцы, быць уважлівым, не хадзіць па класе і ўвогуле разумець, што ёсць такое слова «трэба».

Адна мая знаёмая скардзілася, што першыя паўгода яе дзіця, першакласнік, замкнулася ў сабе і стала абыякавым амаль да ўсяго. І толькі ў другім паўгоддзі малое стала больш падобным на сябе былога.

Псіхолаг лічыць, што гэта тыповая сітуацыя. Менавіта столькі часу патрэбна першакласніку, каб ён зразумеў, адчуў, усвядоміў сваю новую ролю і прывык да яе.

— Ёсць такое паняцце, як адвольнасць, — гаворыць Вольга Сяргееўна. — Здольнасць захоўваць увагу і ўменне прымушаць сябе. Яна вельмі моцна звязаная з фізічным станам дзіцяці і з яго здароўем.

Таму перад паступленнем у школу варта як мага больш часу правесці на прыродзе. І далей, у працэсе ўсяго школьнага жыцця, дзіця патрэбна ўмацоўваць, загартоўваць. Таксама важна шмат увагі ўдзяляць яго паўнацэннаму харчаванню. Гэта значыць, трэба даваць больш садавіны, гародніны, соку...

Калі дзіця не высыпаецца, мала бывае на свежым паветры, то нават калі яно вельмі будзе хацець, не зможа выседзець урок і быць уважлівым. Яно вельмі хутка будзе стамляцца, і ўсе словы настаўніцы «праляцяць» міма. І малое нават не разумее, чаму ім незадаволены і чаму яно не паспявае за іншымі. Таму бацькоўская праграма «харчаванне — прагулкі — сон» павінна выконвацца няўхільна.

У перыяд адаптацыі таксама неабходна на нейкі час абмежаваць нервовую нагрузку — тэлевізар і камп'ютар. Нельга «перагружаць» дзіця дадатковымі гурткамі і развіваючымі заняткамі. Лепш сканцэнтраваць сілы на самым галоўным — прывыканні да школьнага рэжыму.

Расслабляцца — таксама «навука»

Адзін са спосабаў расслабіцца — прыняць ванну. Аднак бацькі могуць дапамагчы і актыўна. Напрыклад, абліць дзіця халаднаватай вадой і сказаць: «Глядзі, мы зараз пальём на тваю ручку вадзіцы, і ты адчуеш, як рука расслабляецца, становіцца мяккай, цёплай». Гэтаксама можна расслабіць і іншыя часткі цела. Дапамагаюць і масажы. Пагладжваючы дзіця перад сном, напрыклад, карысна расказваць яму казку пра вожыка ў тумане, які плыве па рацэ; ці пра тое, што яно — нібыта восеньскі лісцік, які спачатку падае, а потым яго падхоплівае цёплы ветрык. Так дзіця зможа адчуць станоўчыя, добрыя эмоцыі, і яго цела расслабіцца. Таксама можна выкарыстоўваць і дыханне. Напрыклад, паспрабаваць разам з дзіцем набраць у сябе паветра і надзьмуцца, нібыта паветраны шарык, а потым «здзьмухвацца» да мяккай анучкі. Так, гуляючы, можна дапамагчы дзіцяці ўявіць вобразы цяпла, мяккасці, лёгкасці і навучыць яго расслабляцца ад кончыкаў пальцаў і да галавы. Калі мы расслабляем цела, сыходзіць і напружанне, якое накапілася за дзень.

Добрыя адносіны ў школе

Пры дзіцяці нельга гаварыць пра настаўніка негатыўна. Нават і ў сабе выхоўваць адносіны павагі да чалавека, які дае адукацыю вашаму дзіцяці, якім бы строгім, мяккім ці нявопытным вам ні здаваўся настаўнік. Галоўнае, каб гэты чалавек стаў аўтарытэтам для дзіцяці, тады яно зможа адчуваць сябе абароненым. Толькі адносіны ўзаемнай павагі бацькоў і настаўнікаў змогуць даць такі вынік, таму бацькам патрэбна навучыцца гаварыць (і раіцца) з настаўнікам. Калі вы зможаце выклікаць прыхільнасць настаўніка да сябе і свайго дзіцяці, то гэта значна дапаможа малому добра (і, галоўнае, спакойна) вучыцца.

З'явіся, сяброўка

— Яшчэ адзін немалаважны фактар для паспяховай адаптацыі першакласніка, — дадае псіхолаг, — гэта сябры. Трэба дапамагчы дзіцяці наладзіць кантакты ў калектыве. Можна даваць у школу нейкія цацкі, кнігі, прысмакі, якімі можна падзяліцца з аднакласнікамі, што дапаможа завязаць такія кантакты.

Больш за тое, дзяцей патрэбна вучыць дыялогу, вучыць расказваць, чаго хоча дзіця, і абавязкова слухаць, чаго хочуць іншыя дзеці. Школьнікам лепш навучыцца абараняць сябе і свае інтарэсы не бойкай, не сваркай, а менавіта размовай. Бацькі ж, у сваю чаргу, убачыўшы, што дзіця пачынае з кім-небудзь адным больш гуляць, паспрабуюць наладзіць кантакты з бацькамі гэтага малога. Для гэтага можна запрасіць іх сям'ю ў госці ці проста разам сустрэцца і пагуляць.

Навучыцца вучыцца

Вучыцца — гэта вельмі цяжка. Бацькі могуць навучыць дзіця вучыцца. Пазнаваць нешта новае вельмі цікава, таму вучоба дзіцяці павінна цікавіць і саміх бацькоў. Нярэдка матулі пытаюцца пра тое, што іх дзеці елі ў сталоўцы, як сябе паводзілі, а не тое, што іх малое спасцігла новага. Безумоўна, бываюць сітуацыі, калі дзіця не расказвае бацькам пра школу. Але тады па дапамогу патрэбна звярнуцца да настаўніка. А калі даведаліся, чаму іх вучылі на ўроку, абмяркоўваць гэта, шукаць нейкія цікавыя факты... Школьніку проста неабходна бачыць зацікаўлены погляд бацькоў — сапраўдную зацікаўленасць да таго, чым яны займаюцца ў школе.

Дзеці розныя...

— Бацькам лепш улічваць і асаблівасці свайго дзіцяці, — гаворыць Вольга Сяргееўна. — Значна лягчэй дапамагчы дзіцяці ў вучобе, калі ведаеш тып яго інтэлектуальнай працаздольнасці. У кожнага маленькага чалавечка ён свой, сярод якіх можна вылучыць 3 асноўныя тыпы.

Першы — гэта актыўныя, у сэнсе разумовай (а не фізічнай) працаздольнасці, дзеці. Яны дастаткова доўга могуць быць уважлівымі, выконваць усе патрабаванні, якія дае настаўнік. Такія дзеці хутка ўключаюцца ў працу, доўга захоўваюць працаздольнасць, і ім патрэбны невялікі перыяд для адпачынку. Звычайна ў такіх праблем з вучобай амаль няма. Але і дзяцей такога тыпу няшмат: добра, калі набярэцца чвэрць класа.

Ёсць школьнікі, якія марудна ўцягваюцца ў працу. Ім, для таго, каб уключыцца і выдаць тое, на што яны здольныя, патрэбныя раскачка і час, каб набраць тэмп. І тады яны дастаткова доўга змогуць працаваць. Яны захапляюцца, і іх цяжка пераключыць на нешта іншае. Рэжым урока, на жаль, не прадугледжвае такой асаблівасці некаторых дзетак. Таму яны могуць згубіць інтарэс да вучобы, бо яны не паспяваюць за ўсімі. Хоць гэтыя дзеці не менш здольныя, чым астатнія. Калі вашае дзіця належыць да такога тыпу, то з ім лепей вяртацца да пройдзенага дома. З цягам часу мозг дзіцяці стане больш сталы і патрэба ў дадатковых паўтарэннях адпадзе.

Яшчэ адзін тып дзетак — тыя, якія хутка ўключаюцца у працу, але і хутка стамляюцца. Пакуль настаўніца праверыць хатняе заданне, пакуль напішуць «Класная работа», дзіця ўжо выдала ўсю сваю ўвагу, і яму патрэбен адпачынак. Бацькам такіх школьнікаў трэба дома, пасля добрага адпачынку, звяртаць увагу на самае галоўнае з пройдзенага. Гэтаму тыпу супрацьпаказаная доўгая падрыхтоўка да хатняга задання — падрыхтоўку працоўнага месца, пошук патрэбных старонак у падручніку і т.п.— у першы час могуць узяць на сябе бацькі. Пачынаць работу такому школьніку патрэбна з самага важнага і цяжкага. Усё патрэбна рабіць хутка і часта даваць перадых. Напрыклад, пачыталі, з'елі яблык — і зноў за працу.

Каб распазнаць, да якога тыпу адносіцца вашае дзіця, патрэбна проста паназіраць за ім ці правесці тэсты ў школьнага псіхолага, якія дапамогуць выявіць яго індывідуальную дынаміку.

Адзнака бацькоў — самая лепшая

— У школе дзіця трапляе ў асяродак адзнак: адзін больш хуткі, другі больш акуратны і гэтак далей, — расказвае Вольга Сяргееўна. — Такім чынам дзіця пастаянна напружанае: ці не горшае яно за іншых. Бацькі памыляюцца, калі пачынаюць параўноўваць сваё дзіця з іншымі аднакласнікамі. Нельга траўмаваць дзіця і паніжаць яго самаадзнаку.

Вельмі важна падыходзіць да першакласніка з пазіцыі параўнання з самім сабой. Напрыклад, тыповая сітуацыя, калі настаўнік вывешвае колькасць прачытаных за хвіліну слоў. Бацькі абавязкова высвятляюць, хто больш прачытаў. Дзіця можна параўноўваць толькі з самім сабой: «Ты чытаў сто слоў тыдзень таму, а цяпер сто пяць. Ты малайчына! Ты рухаешся наперад». Калі ўсё ж у дзіцяці ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы, звязаныя са школай, — гэта можа быць праяўленнем так званай дэзадаптацыі.

Яна мае фізіялагічныя праяўленні. Дзіця пачынае часта хварэць, скардзіцца на галаўны боль, на боль у жываце, у малога прападае апетыт, парушаецца сон — гэта самыя першыя сігналы, на якія трэба звярнуць увагу, таму што ў такіх выпадках яшчэ можна дапамагчы дзіцяці без урачоў. Важна разабрацца, што ён адчувае, што яго хвалюе, што адбываецца ў школе, наколькі дзіцяці там камфортна і ці ёсць там фактары, якія яго траўмуюць. Парушаць яго адаптацыю могуць нядобрыя адносіны з аднакласнікамі, адсутнасць узаемаразумення з настаўнікам, а таксама якія-небудзь страхі, з якімі яму аднаму немагчыма справіцца.

Калі ж дзіця вельмі змянілася, дрэнна сябе адчувае і паляпшэння не бачна, то трэба разбірацца, у чым прычына, і нават, калі патрэбна, падключыць псіхолага. Галоўнае — не запусціць працэс дэзадаптацыі і не ўвагнаць дзіця ў школьны неўроз, праяўленнем якога могуць быць і заіканне, і цікі, і энурэз, і іншыя нервовыя станы. Тады ўжо спатрэбяцца не толькі кансультацыі псіхолага, але і лячэнне ў неўролага.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ЧЫМ ХАРЧАВАЦЦА ПРЫ ПРАСТУДЗЕ?

Каб не перагружаць страўнік цяжкай бялковай і тлустай ежай, падчас хваробы лепш есці прадукты, якія лёгка пераварваюцца і не затрымліваюцца ў кішэчніку. Гэта садавіна, свежая і тушаная гародніна, посныя булёны, адварная і тушаная рыба, індычка, гарбата і сокі. Каб не раздражняць запаленыя слізістыя, адкажыцеся ад спецый, вострай і смажанай ежы. Карыснымі будуць кашы, пюрэ.

Прадукты і стравы, якія дапамогуць палегчыць цячэнне хваробы і паскораць выздараўленне.

ЛІМОН

Утрымлівае ўдарную дозу вітаміну С, які стымулюе наш імунітэт. Дадавайце лімон у гарбату або прыгатуйце цёплы ліманад. Ён выдатна змякчае горла, чысціць кроў і слізістыя. Для гэтага выцісніце сок паловы лімона ў кубак цёплай вады і дадайце чайную лыжку мёду або кляновага сіропу. Дарэчы, вялікая колькасць аскарбінавай кіслаты ўтрымліваецца таксама ў іншых цытрусавых, чорных парэчках, журавінах, шыпшыне і суніцах. Варыце морсы і рабіце настоі.

КУРЫНЫ БУЛЁН

Наварысты курыны булён яшчэ ў XII стагоддзі лічыўся лякарствам супраць грыпу і прастуды. Як паказалі сучасныя даследаванні, гэтая страва сапраўды валодае супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі, а таксама часова павялічвае хуткасць вылучэння слізі з носа, такім чынам памяншаючы ацёк і прачышчаючы верхнія дыхальныя шляхі. Больш лёгкі для засваення варыянт — посныя булёны з агародніны — таксама добры ў якасці асноўнага сілкавання. Ён надасць сіл, і пры гэтым арганізму не давядзецца расходаваць шмат энергіі на яго пераварванне.

ІМБІР

Імбірная гарбата з'яўляецца выдатным супрацьмікробным сродкам, яе п'юць пры прастудзе і нястраўнасці. Імбір аднаўляе сілы, выводзіць таксіны, валодае супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі. Пракіпяціце дзве сталовыя лыжкі надзёртага свежага імбіру ў дзвюх шклянках вады на працягу 15 хвілін і дайце настояцца яшчэ 10 хвілін. Піце па неабходнасці. Для ўзмацнення эфектыўнасці напою дадайце ў кубак некалькі штук насення кмену.

ЧАСНОК

Сыры часнок сваім пахам адпуджвае не толькі людзей, але і вірусы. А ўсё дзякуючы аліцыну — гэтае рэчыва надзяляе часнок вострым, пякучым пахам і бактэрыцыднымі ўласцівасцямі. Часнок з'яўляецца прыродным антыбіётыкам, паскарае аднаўленне арганізма пасля грыпу і дапамагае процістаяць захворванню.

ЛЕКАВЫЯ ТРАВЫ

Зялёная або чорная гарбата з дабаўленнем лісця мяты, ліпавага цвету і мацярдушкі — выдатны патагонны сродак, не горшы за малінавае варэнне. Выпіце гарачы напой — і хутчэй у ложак! Рамонак можна заварваць як гарбату і выкарыстоўваць для паласканняў. Расліна здаўна славіцца сваімі супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі.

АПЕЛЬСІНАВЫ СОК

Медыцынскія даследаванні паказалі, што вітамін С, які ўтрымліваецца ў апельсінавым соку, можа паскорыць выздараўленне ад прастуды, а 1000 мг вітаміну С, які трэба прымаць кожныя 6 гадзін, эфектыўна прадухіляюць сімптомы захворвання.

Прастудзенаму чалавеку рэкамендуецца як мага больш піць цёплых (не гарачых!) напояў. Падвышанае ўжыванне вадкасці дапамагае вымываць з арганізма прадукты жыццядзейнасці вірусаў і бактэрый і метабаліты лекавых прэпаратаў, якія мы прымаем для таго, каб вылечыць прастуду (напрыклад, парацэтамол). Акрамя таго, багатае пітво разрэджвае слізь, дапамагаючы ачысціць закладзеныя нос і горла.

МЁД

Усім вядомыя гаючыя ўласцівасці мёду. Ён валодае патагонным дзеяннем і падвышае імунітэт. Прыём дзвюх чайных лыжак мёду перад сном памяншае частату начнога кашлю і паскарае засыпанне. Рэцэпт найпрасцейшага сіропу ад кашлю: лыжка мёду з парай кропель лімоннага соку.

КІВІ

Утрыманне вітаміну С у гэтым экзатычным плодзе б'е ўсе рэкорды. Яно нават вышэйшае, чым у цытрусавых. Ужыванне ківі асабліва карыснае пры рэспіраторных інфекцыях, асабліва дзецям.

Падрыхтавала Ірына ПЯТРОВІЧ.

ДАКРАНУЎСЯ ДА КНОПКІ Ў ЛІФЦЕ — АДРАЗУ ПАМЫЙ РУКІ!

Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што на кнопках ліфтоў знаходзіцца прыкладна ў 35 разоў больш бактэрый, чым на стульчаку ў грамадскай прыбіральні.

Даследчыкі з Арызонскага ўніверсітэта правялі бактэрыялагічны аналіз паверхні кнопак у ліфтах атэляў, банкаў, офісаў і аэрапортаў, падчас якога высветлілася, што на адным квадратным сантыметры кнопкі "жывуць" у сярэднім 313 калоніеўтваральных адзінак бактэрый (КОЕ). На такой жа плошчы стульчака ў грамадскай прыбіральні можна знайсці ў сярэднім восем КОЕ. Падчас далейшага аналізу высветлілася, што сярод мікробаў на кнопках ліфтоў часта прысутнічаюць і хваробатворныя бактэрыі — пераважна кішэчнай групы.

Даследчыкі тлумачаць, што ў будынках з вялікай колькасцю наведвальнікаў да кнопак пастаянна дакранаюцца дзясяткі людзей, за кошт чаго і адбываецца абмен разнастайнымі мікраарганізмамі. Нават пры рэгулярным ачышчэнні кнопак патэнцыял мікробнага росту на іх застаецца вельмі высокім.

Падчас папярэдніх даследаванняў на аналагічныя тэмы было ўстаноўлена, што клавіятуры камп'ютараў у чатыры разы больш брудныя, чым стульчакі, а мабільныя тэлефоны ў 18 разоў больш брудныя, чым рукаяткі бачкоў у грамадскіх прыбіральнях.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНАЕ ВІНО: І ПРЫЕМНА, І КАРЫСНА?

Італьянскія навукоўцы знайшлі нечаканыя плюсы спажывання чырвонага віна. Калі піць віно штодня, то можна... захаваць свае зубы.

Даследчыкі з універсітэта Павіа прыйшлі да высновы, што ўсяго шклянка чырвонага віна ў дзень страхуе ад візітаў да стаматолага У чым жа прычына цудоўнага эфекту?

Навукоўцам удалося ўстанавіць, што алкагольны напітак утрымлівае асабліва хімічнае рэчыва. Яно блакіруе дзеянне хваробатворных бактэрый Streptococcus mutans, перашкаджае іх замацаванню да зубоў і разбуральнаму ўздзеянню. Менавіта гэтыя бактэрыі і цягнуць развіццё карыесу. Яны пераўтвараюць цукрозу ў малочную кіслату. У выніку запускаецца працэс утварэння кіслага асяроддзя, і адбываецца дэмінералізацыя зубоў.

Адкрыццё было зроблена ў ходзе эксперыментальнай работы. Бактэрыі змясцілі ў невялікую колькасць чырвонага віна. У віне Streptococcus mutans сустрэлі здольнасць замацоўвацца да зубоў.

Навукоўцы не жадаюць спыняцца на дасягнутым і маюць намер даведацца, ці можна на падставе атрыманай інфармацыі стварыць лекавы прэпарат. Зразумела, што можна абараняць зубы і проста пры дапамозе спажывання чырвонага віна, але, па-першае, тут ёсць рызыка захварэць на алкагалізм. Па-другое, некаторыя гатункі він утрымліваюць лішак цукру і кіслот, і іх спажыванне можа аказаць на зубы процілеглы эфект.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона) по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукционы по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

Сведения о предметах аукционов

Дата и время проведения аукциона:	**22 октября 2010 г. в 11.00** (аукцион повторный)

Капитальные строения, зеленые насаждения производственной территории и право заключения договора аренды земельного участка.
Капитальное строение (инв. № 630/С-59596) – двухэтажное здание штаба с бетонным подвалом, теневым навесом, общ. пл. 849,5 кв.м, 1939 г/п (года постройки), стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59598) – одноэтажное здание учебного корпуса с бетонным подвалом, теневым навесом, навесом, общ. пл. 671,5 кв. м, 1945 г/п, стены и перегородки кирпичные, междуэтажные перекрытия ж/бетонные, крыша рубероидная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59578) – двухэтажное здание казармы с открытым навесом, общ. пл. 1566,2 кв.м, 1967 г/п, стены и перегородки кирпичные, междуэтажные перекрытия ж/бетонные, крыша рубероидная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59584) – одноэтажное здание столовой № К-2/106 с двумя теневыми навесами, общ. пл. 664,4 кв.м, 1974 г/п, стены и перегородки кирпичные, чердачные перекрытия ж/бетонные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59581) – одноэтажный склад, общ. пл. 258,9 кв.м, 1966 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша рубероидная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59585) – одноэтажный склад ГСМ, общ. пл. 265,2 кв.м, 1975 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша рубероидная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59599) – одноэтажный склад № К-2/108, общ. пл. 844,7 кв.м, 1975 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59580) – одноэтажный склад, общ. пл. 96,0 кв.м, 1971 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша – толь. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59590) – одноэтажное здание склада № К-2/109, общ. пл. 828,2 кв.м, 1975 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59591) – одноэтажное здание продсклада № К-2/110 с бетонным подвалом и открытым теневым навесом, общ. пл. 534,1 кв.м, 1975 г/п, стены и перегородки кирпичные, чердачные перекрытия ж/б, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59595) – одноэтажное здание склада № К-2/114, общ. пл. 65,5 кв.м, 1976 г/п, стены и перегородки кирпичные, чердачные перекрытия железобетонные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59592) – одноэтажное здание склада № К-2/112, общ. пл. 410,5 кв.м, 1976 г/п, стены и перегородки кирпичные, чердачные перекрытия ж/бетонные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59594) – одноэтажное здание склада № К-2/113, общ. пл. 827,7 кв.м, 1976 г/п, стены и перегородки кирпичные, крыша рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59597) – кабельная сеть наружного освещения 0,4 кВ общей протяженностью 2049,5 м, 1974 г/п, рабочее напряжение – 380 вольт. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59600) – объект благоустройства: проезды с асфальтовым покрытием – 7613,1 кв.м, дорожки с асфальтовым и плиточным покрытием – 988,6 кв.м, площадка с асфальтовым покрытием – 3614,6 кв.м, ограждение территории: железобетонное протяженностью 1455,2 м, металлическое протяженностью 231,2 м, ворота металлические в количестве 3 шт., беседка – кирпичная. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59593) – водопровод с тремя водопроводными колодцами протяженностью 215,8 м, 1976 г/п. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59587) – металлические тепловые сети протяженностью 213,4 м, 1976 г/п. **Капитальное строение** (инв. № 630/С-59589) – канализационные сети протяженностью 526,6 м, 1976 г/п, колодцы – 16 шт. **Зеленые насаждения** производственной территории (газоны с деревьями и кустарниками) в количестве 36 штук, 101221 кв.м.
Объекты расположены по адресу: Минская область, Молодечненский район, Красненский с/с, д. Красное, военный городок «Красное-2», на земельном участке площадью 12,2411 га, назначение – земельный участок для обслуживания капитальных строений (зданий и сооружений) военного городка «Красное-2». Срок аренды земельного участка 20 лет.
Условия использования земельного участка: для обслуживания капитальных строений. Победителю аукциона необходимо предоставить ГУ «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» беспрепятственный проезд к земельному участку для обслуживания здания клуба военного городка «Красное-2».
Имеется обременение на капитальное строение (инв. № 630/С-59584) в виде договора аренды сроком до 8 марта 2012 г.

Начальная цена предмета аукциона	**2 014 304 921** белорусский рубль (в т.ч. объекты: 1 861 070 049, право заключения договора аренды земельного участка 153 234 872)
Размер задатка	**100 000 000** белорусских рублей

Продавец: Государственное учреждение «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (г. Минск, ул. Основателей, 24, тел. (8017) 266 84 55, 266 52 33).
Арендодатель земельных участков: Молодечненский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Молодечно, ул. Виленская, 6).
Задаток для участия в аукционе перечисляется в срок **по 21 октября 2010 года включительно**. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **21 октября 2010 г. до 17.00.**
Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 18 мая 2010 г. № 94.

Дата и время проведения аукциона:	**8 ноября 2010 г. в 11.00** (аукцион повторный) *Начальная цена продажи объектов понижена на 50 %*

Недвижимое имущество и право заключения договора аренды земельного участка.
Капитальное строение (инв. № 640/С-22823) – трехэтажное здание учебного корпуса под общежитие с террасой общей площадью 1817,7 кв.м, 1979 г/п, фундамент – бетонные блоки, стены и перегородки панельные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43315) – электрическая сеть к зданию протяженностью 210,0 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43308) – водопроводная сеть от ВК-6 до здания протяженностью 10,95 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43309) – тепловая сеть от ТК-5 до здания протяженностью 7,55 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43327) – канализационная сеть от здания протяженностью 4,50 м. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г, на земельном участке площадью 0,2913 га. Срок аренды земельного участка 70 лет.

Начальная цена предмета аукциона	**266 783 490** белорусских рублей (в т.ч. объекты: 204 864 900, право заключения договора аренды земельного участка 61 918 590)
Размер задатка	**20 000 000** белорусских рублей

Продавец: Государственное учреждение «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных сил» Слуцкий филиал (Минская область, г. Слуцк, ул. Богдановича, 184, тел. (801795) 6 69 70). **Арендодатель земельных участков:** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 189).
Задаток для участия в аукционе перечисляется в срок **по 4 ноября 2010 года включительно**. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **4 ноября 2010 г. до 17.00.**
Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 7 октября 2009 г. № 189, 24 августа 2010 г. № 164.

Дата и время проведения аукциона с условиями:	**8 ноября 2010 г. в 12.00** (аукцион повторный) *Начальная цена продажи объектов понижена на 20 %*

Здания, сооружения бывшего оздоровительного лагеря «Солнечный круг» и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для их обслуживания.
Здания спальных корпусов: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-6930) – 107 кв.м, 1963 г/п (года постройки), **капитальное строение** (инв. № 620/С-6931) – 106,8 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6932) – 107 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6933) – 106,8 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6934) – 107 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6935) – 106,8 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6936) – 107 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6937) – 107 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6938) – 107 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6939) – 106,8 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6940) – 107 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6948) – 107 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6949) – 98,0 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6950) – 98,0 кв.м, 1982 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6951) – 107 кв.м, 1972 г/п – здания одноэтажные, фундамент – бутобетон, стены каркасно-засыпные, перегородки дощатые, перекрытия чердачные деревянные, имеется электроснабжение.
Здания общежитий: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7010) – 71,2 кв.м, 1964 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7011) с террасами, 70,2 кв.м, 1983 г/п – здания одноэтажные, стены каркасно-засыпные, перегородки дощатые, перекрытия чердачные деревянные, крыша шиферная; **капитальное строение** (инв. № 620/С-7040) – 248,5 кв.м, 1994 г/п – двухэтажное кирпичное здание, перекрытия чердачные и междуэтажные– ж/б плиты, крыша совмещенная.
Здания складов: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7020) – 121,9 кв.м, 1970 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7035) – 120,9 кв.м, 1963 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7017) – 256,7 кв.м, 1994 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7016) – 5,8 кв.м, 1963 г/п.
Здания овощехранилищ: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7048) – 51,0 кв.м, 1994 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7019) – 62,5 кв.м, 1963 г/п – здания одноэтажные, стены и перегородки кирпичные, перекрытия чердачные – ж/б плиты.
Здания умывальников и туалетов: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7047) – 2,0 кв.м, 2001 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7039) – 26,6 кв.м, 1984 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6956) – 26,6 кв.м, 1984 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6957) – 26,6 кв.м, 1984 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6958) – 26,6 кв.м, 1984 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7037) – 29,2 кв.м, 1985 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6953) – 29,2 кв.м,1985 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6954) – 29,2 кв.м, 1985 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-6955) – 29,2 кв.м, 1985 г/п, **капитальное строение** (инв. № 620/С-7046) – 3,6 кв.м, 2000 г/п – здания одноэтажные, стены и перегородки кирпичные, крыша шиферная.
Прочие здания: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7079) – 74,2 кв.м, 1963 г/п (здание бани с террасой), **капитальное строение** (инв. № 620/С-7041) – 93,7 кв.м, 1983 г/п, (здание котельной), **капитальное строение** (инв. № 620/С-7050) – 131,0 кв.м, 1995 г/п, (здание котельной), **капитальное строение** (инв. № 620/С-7045) – 22,8 кв.м, 2001 г/п (здание пожарного поста с гаражом), **капитальное строение** (инв. № 620/С-7038) – 10,8 кв.м, 1963 г/п (здание насосной), здания одноэтажные, стены и перегородки кирпичные, крыша совмещенная. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-6952) – 60,3 кв.м, 1961 г/п (здание дома начальника лагеря с пристройками), одноэтажное, стены бревенчатые обшитые доской, перегородки дощатые, перекрытие чердачное – деревянное. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7014) – 45,9 кв.м, 1963 г/п (здание домика сторожевого с пристройкой) – одноэтажное, стены кирпичные, перегородки дощатые, перекрытие чердачное деревянное. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7012) – 46,3 кв.м, 1975 г/п (здание медпункта с террасой), стены каркасно-засыпные, перегородки дощатые, перекрытие чердачное деревянное. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7042) – 726,9 кв.м, 1970 г/п (здание столовой с пристройками), одноэтажное, стены кирпичные, облицованные кирпичом, перегородки кирпичные, перекрытия чердачные – ж/б плиты. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7036) – 293,5 кв.м, 1995 г/п (здание кинозала), одноэтажное, стены – ж/б каркас, кирпич, перекрытие чердачное деревянное. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7043) – 29,7кв.м, 1970 г/п (здание летней кухни), **капитальное строение** (инв. № 620/С-7015) – 34,5 кв.м, 1982 г/п (здание летней эстрады), здания одноэтажные, стены дощатые. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-7049) – 116,5 кв.м, 1995 г/п (одноэтажное здание теплицы).
Сооружения: **капитальное строение** (инв. № 620/С-24209) и **капитальное строение** (инв. № 620/С-24214) – водонапорные башни; **капитальное строение** (инв. № 620/С-24205) – артскважина; **капитальное строение** (инв. № 620/С-24212) и **капитальное строение** (инв. № 620/С-24211) – пожарные водоемы 10 куб.м. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-24200), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24201), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24198), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24208) – молниеотводы №№ 1-4. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-24215) – отстойник бетонный, **капитальное строение** (инв. № 620/С-24195) – сети водопровода, **капитальное строение** (инв. № 620/С-24206) – тепловая сеть.
Благоустройство территории: **Капитальное строение** (инв. № 620/С-24207), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24203), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24216) – ограждения территории. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-24204), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24199), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24202) – асфальтированное покрытие, аллея, спортивная площадка. **Капитальное строение** (инв. № 620/С-24213), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24197), **капитальное строение** (инв. № 620/С-24210) – уличное освещение.
Объекты расположены по адресу: Минская область, Дзержинский район, около дер. Логовище на земельном участке площадью 8,5975 га. Срок аренды земельного участка 99 лет. **Условия использования земельного участка:** Победителю аукциона разрешено в установленном порядке изменение назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объектов производственного назначения.
Условие аукциона по продаже недвижимого имущества: приобретение покупателем движимого имущества: стадион (трибуны), спортивный городок, спаренный лабиринт, стеллажи, пожарную сигнализацию, скамьи клуба, скамьи летней эстрады, демонтаж которого невозможен без нанесения ущерба государственному имуществу. Покупатель обязан перечислить цену реализации движимого имущества в сумме **11 081 200 белорусских рублей** на расчетный счет производственного республиканского унитарного предприятия «БЕЛСП

BELARUS

алімпіец

ЗВЯЗДА

ВЫПУСК № 6 (8)

Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

„...Я НАВУЧЫЎСЯ НА СПАРТЫЎНАЙ АРЭНЕ КАНТРАЛЯВАЦЬ СВАЕ ЭМОЦЫІ. ДОЎГА ТЛУМАЧЫЦЬ, ЯК ДА ГЭТАГА ПРЫЙШОЎ. МАГУ ПРЫЗНАЦЦА, ШТО ТОЛЬКІ ПРАЗ ДВАЦЦАЦЬ ГАДОЎ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК СТАЎ МАЛАТАБОЙЦАМ."

„ТРЭБА БЫЦЬ УПАРТЫМ ЧАЛАВЕКАМ. ШТОДНЯ ТРЭНІРАВАЦЦА: НЕ ДАВАЦЬ НІВОДНАГА ШАНЦУ ЛЯНОЦЕ І, КАЛІ ТРЭБА, ПРОСТА ПРЫМУШАЦЬ СЯБЕ. АКРАМЯ СІЛЫ ВОЛІ, ПАТРАБУЕЦЦА ТАКСАМА ПСІХАЛАГІЧНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ. КАБ УЗЯЦЬ І ВЫЙГРАЦЬ!"

Ведай нашых!

У беларусаў — больш за 40 медалёў

2-3 кастрычніка ў сталічным футбольным манежы пад дэвізам «Здароўе дзяцей — здароўе нацыі» адбыўся 6-ты міжнародны турнір «Адкрыты чэмпіянат і першынство г. Мінска па каратэ «Sanker Cup 2010». Гэта адзін з найбуйнейшых клубных спаборніцтваў па спартыўным каратэ не толькі ў Беларусі, але і ва Усходняй Еўропе. Турнір, як заўсёды, парадаваў гледачоў непрадказальнымі і яркімі спарынгамі і тэхнічнымі паказальнымі выступленнямі, а беларускіх балельшчыкаў — дастойнымі вынікамі нашых суайчыннікаў.

650 удзельнікаў з больш чым 60 клубаў, якія прадстаўлялі 10 краін свету, прадэманстравалі свае ўменні у розных дысцыплінах каратэ. У Мінску спаборнічалі каратысты з Арменіі, Азербайджана, Казахстана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Эстоніі. Беларусы ў розных узроставых і вагавых катэгорыях заваявалі больш за 40 медалёў, сярод іх — 10 залатых, паведамляе прэс-служба Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

Арганізатарамі турніру выступілі Прэзідэнцкі спартыўны клуб, Мінгарвыканкам і моладзевы клуб усходніх адзінаборстваў «СЭНКЁ».

Навіны дня

З 30 верасня па 3 кастрычніка ў чэшскім Брно прайшлі міжнародныя спаборніцтвы па бадмінтоне. Беларусы Яўген Якаўчук і Аляксей Конах, якія выступілі ў парным разрадзе, занялі 9-е месца. У адзіночным разрадзе Алеся Зайцава стала пятай.

❍

У першым кваліфікацыйным раўндзе Кубка Еўрачэлендж па баскетболе, які прайшоў у беларускай сталіцы, «Мінск-2006» унічыю згуляў з бельгійскім «Антвэрпэнам» — 87:87.

❍

У Мельбурне (Аўстралія) прайшоў чэмпіянат свету па веласіпедным спорце на шашы. У гонцы з размежаваным стартам на 45,6 км беларус Канстанцін Сіўцоў стаў 30-м. У групавой гонцы на 262,7 км ён заняў 33-е месца. Яшчэ адзін беларус Яўген Гутаровіч прыйшоў 51-м. Сярод жанчын у гонцы з размежаваным стартам на 31,8 км Таццяна Паніна заняла 27-е месца. У групавой гонцы на 127,2 км яна была 74-й. Сярод моладзі (U-23) у гонцы з размежаваным стартам на 31,6 км 9-е месца заняў беларус Андрэй Красільнікаў, яго суайчыннік Сяргей Папок быў 37-м. У групавой гонцы Сяргей Папок прыйшоў 12-м, Канстанцін Клімянкоў — 47-м, Андрэй Красільнікаў — 88-м.

❍

У Жывініцы (Боснія і Герцагавіна) прайшоў Кубак выкліку па гандболе, дзе прымаў удзел сталічны «Аркатрон». Вось вынікі матчаў: «Аркатрон» — «Партызан» (Сербія) — 28:41, «Аркатрон» — «Конюх наместай» (Боснія і Герцагавіна) — 29:30, «Аркатрон» — «Манчэстэр» (Вялікабрытанія) — 43:21. Беларусы не выйшлі у трэці кваліфікацыйны раўнд.

АЛІМПІЕЦ. ПАЭТ. І ДОБРЫ... КУХАР

І гэта ўсё пра яго — Вадзіма Дзевятоўскага — уладальніка сярэбранага медаля Алімпіяды, неаднаразовага чэмпіёна і прызёра еўрапейскіх і сусветных спаборніцтваў.

Пасля таго, як была пастаўлена кропка ў так званым допінгавым скандале, у эпіцэнтры якога аказаліся беларускія алімпійцы Іван Ціхан і Вадзім Дзевятоўскі, і іх спартыўныя дасягненні на Алімпіядзе ў Пекіне былі афіцыйна і канчаткова пацверджаныя, пісалі пра гэтых «зорак» спорту шмат. Зразумела, віншавалі нашых спартсменаў з тым, што вярнулі ім медалі, цікавіліся планамі. Калі яшчэ Іван і Вадзім вельмі настойліва толькі спрабавалі даказаць усяму свету, што яны пачэсна перамаглі... Аб гэтым і не толькі карэспандэнт «Звязды» гутарыць з вядомым спартсменам — 33-гадовым жыхаром Наваполацка.

— Вадзім Анатольевіч, вам, напэўна, надакучыла ў апошні час адказваць на пытанні журналістаў. Верагодна, чулі і нейкія пытанні, якія часта паўтараліся, а мо і нават глупствы?

— Гатовы адказаць на ўсе вашы пытанні. Наконт «неразумных», лічу, што такіх проста не бывае. Растлумачу чаму. Мне зараз здаецца, што ваша пытанне нейкае «непрафесійнае», з выснаў чалавека, які, напэўна, далёкі ад спартыўнай тэматыкі. А ўсё ж калі чалавек хоча атрымаць ад мяне нейкую інфармацыю, чаму б і не задаволіць ягоны інтарэс? Пытайце, буду адказваць шчыра! Дарэчы, працягваючы адказ на ваша першае пытанне, магу адзначыць, што заўсёды маю стасункі з людзьмі на ўзроўні інтуіцыі, адчуванні энергетыкі...

— Гэта як? Вы экстрасэнсорнымі здольнасцямі валодаеце?

— Я ўжо даўно навучыўся «адчуваць» людзей, іх настрой, энергетыку. Вось сёння вы на «сваёй хвалі» і зацікавіцеся падчас нашай размовы тым, што ў глыбіні душы вас хвалюе. Мяне цікавяць псіхалагічныя фактары, на якія іншы чалавек мо і ўвагі б не звярнуў...

А псіхалогія звычайнага чалавека вельмі адрозніваецца ад псіхалогіі прафесійнага спартсмена.

— А што спартсмен — не чалавек? Няўжо асабіста вы, напрыклад, не хвалюецеся падчас спаборніцтваў?

— Безумоўна, кожны чалавек хвалюецца. Але я навучыўся на спартыўнай арэне кантраляваць свае эмоцыі. Доўга тлумачыць, як да гэтага прыйшоў. Магу прызнацца, што толькі праз дваццаць гадоў пасля таго, як стаў малатабойцам. А колькі было прыкладаў нават у спартыўным лёсе вядомых спартсменаў, калі яны выходзілі на арэну і ад хвалявання нават не разумелі, куды ім трэба кінуць молат! Мы ж выступаем на вялікіх стадыёнах, часцей за ўсё алімпійскіх арэнах. У Пекіне, калі не памыляюся, 90 тысяч гледачоў, у Сіднеі — 120 тысяч...

— Вадзім Анатольевіч, як так выйшла, што вас у дзяцінстве прывабіў молат. Вашы равеснікі ахвотна займаліся боксам, дзюдо, каратэ. А вы выбралі і цяпер «не прэстыжную» сярод моладзі атлетыку.

— Гэта атрымалася выпадкова. Хоць нічога выпадковага не бывае. Я веру ў лёс. Мой старэйшы брат Алег (вядомы вадналыжнік, неаднаразовы чэмпіён Еўропы і двойчы прызёр чэмпіянату свету; розніца ва ўзросце ў іх 3 гады і 3 месяцы — ***А.П.***) прывёў мяне ў секцыю вадналыжнага спорту. Ды хутка высветлілася, што з-за атыту (захворванне вуха — ***А.П.***) не магу ім займацца. І тады вядомы трэнер Геноў Мікалай Леанідавіч параіў заняцца кіданнем молата. Сказаў бы, каб пайшоў на бокс, так бы і зрабіў, бо вельмі мы з братам паважаем яго і давяраем.

З дзецьмі з Наваполацкага дзіцячага дома алімпіец сябруе ўжо не першы год.

— Мне расказалі, што смерць бацькі настолькі ўразіла вас, што перажыць боль, пачалі пісаць вершы.

— Так. Я вельмі сумую без яго і зараз. Пачаў раптам пісаць вершы — і мне стала лягчэй. У першых маіх вершаваных радках былі словы пра боль душы, пра тое, што, калі пражыву жыццё, аддаючы сябе людзям, абавязкова сустрэнемся з бацькам у іншым жыцці. Я веру ў Бога. Праваслаўны. Пішу вершы на рускай мове. Але ўсё хачу скласці вершы на роднай, беларускай.

— А не думаеце напісаць кнігу пра той жа допінгавы скандал? Упэўнены, не толькі ў Беларусі, але і за мяжой ваш твор мог бы стаць бестселерам! Ды і фільм экранізаваны паводле рэальнай гісторыі мог бы стаць касавым.

— Пакуль што нічога пісаць не буду. Усё трэба «пераварыць», павінен прайсці час. Але ў перспектыве, мабыць, і вазьмуся за кнігу. Я ўжо думаў пра гэта.

— Калі не сакрэт, на што вы патраціце грошы, зароблены вамі за алімпійскае серабро?

— Былі б грошы — а ўкласці іх заўсёды знойдзецца куды. Пакуль мы з Ціханам яшчэ не атрымалі ні кватэр, ні прызавых па 50 тысяч долараў. А патрацілі, каб даказаць усяму свету, што невінаватыя, шмат болей: на адвакатаў, на паслугі экспертаў. Каб атрымаць у крэдыт грошы для барацьбы за праўду, закаслі сваю маёмасць. Зараз, здаецца, пытанне атрымання кампенсацыі — справа бліжэйшага часу.

— Правакацыйнае пытанне: крыніцы вашых даходаў? Вы працуеце, нешта рэкламуеце?

— Вельмі добрае пытанне! Я нічога не ўтойваю. У свой час, зразумела, зарабіў грошай у прафесійным спорце: за медалі і гэтак далей. Падчас перыпетый «допінгавага інцыдэнту» таварыства «Дынама» не адмовілася ад выплаты «заробку» — мільён рублёў у месяц. Як кіраўнік наваполацкай гарадской арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», мог бы атрымліваць зарплату, але ніколі і нічога не вазьму для сябе з касы арганізацыі. Наадварот, стараюся аддаць усе свае сілы аб'яднанню, свае грошы, знайсці спонсараў для правядзення цікавых акцый.

— Вечар адпачынку з добрым канцэртам?

— Не. Мы хацелі, каб мамы, якія выхоўваюць некалькіх дзяцей, адчулі сябе Жанчынамі з вялікай літары: для іх арганізавалі бясплатныя кансультацыі і сеансы ў цырульніку, мадэльеру, візажыстаў, псіхолагаў... Потым пасля знешняга і ўнутранага «адраджэння» паважаныя дамы «прайшліся па подыуме» і паказалі ўсім, што, нягледзячы на вялікую занятасць, штодзённыя клопаты, яна можа пры жаданні выглядаць, як мадэль. Жанчыны былі нам вельмі ўдзячныя. Тэлефанавалі потым, цікавіліся тым, як нам можна падзякаваць? Я ў адказ: «Вы патэлефанавалі і задаволеныя? Гэта і ёсць ваша ўдзячнасць. І не трэба ніякіх публікацый у СМІ».

Шчыра! Мне прыемна, калі я і мае аднадумцы нейкім чынам дапамагаюць землякам. Калі прыняў пад кіраўніцтва гарадскую арганізацыю, членаў было ў ёй пад 300 чалавек. Цяпер больш за тысячу. Мы — каманда, якая шчыра любіць свой Наваполацк, суседні Полацк і, вядома, нашу родную краіну — Беларусь.

— Каб арганізаваць розныя мерапрыемствы, акцыі, вы ж, напэўна, занятыя гэтым часта з раніцы да вечара. А як жа спартыўны рэжым?

— Так, бывае часта сплю ўсяго па некалькі гадзін у суткі. Сотні званкоў, сустрэч. Я ж яшчэ і дэпутат гарадскога Савета. Але магу, калі трэба, поўнасцю аднавіць свае сілы. Калі яшчэ цікава, я па натуры «сава». Мне прасцей заснуць позна ноччу. Рэжыму стараюся прытрымлівацца... Засынаю а дванаццатай гадзіне ночы, прачынаюся каля дзесяці раніцы.

— А наконт харчавання, прыходзіцца сябе абмяжоўваць?

— Перад адказнымі выступленнямі так яно і ёсць. Спартыўная дыета ў комплексе са спецыяльнымі біялагічнымі дабаўкамі. А так магу не адмовіцца ад аднаго з нямногіх задавальненняў. Але ўсё падрад не ем. Узрост ужо не той (*смяецца*). Наконт дыет, дарэчы. Я жанчынам заўсёды раю: не трэба прытрымлівацца жорсткіх дыет. Калі хочацца вельмі і шмат есці, калі ласка. Але пры гэтым, калі «цягне» на бульбу з мясам, дык лепш з'есці шмат салаты з тым жа мясам. Потым праз некалькі гадзін трохі бульбы з агароднінай. Выпіць стакан вады за паўгадзіны да ежы, потым столькі ж.

— З бурбалкамі ваду піць шкодна?

— Чаму, зусім не. Я люблю мінеральную ваду айчынных вытворцаў.

— А вы кухарыць можаце?

— І вельмі гэта люблю рабіць. Асабліва мясныя стравы — плоў, напрыклад. Люблю эксперыментаваць з рознымі кампанентамі. Падчас працэсу прыгатавання ежы адпачываю.

— Мабыць, калі-небудзь свой рэстаран адкрыеце?

— А чаму б і не. І пра гэта думаю.

— На алкаголь, вядома, у вас алергія?

— Напішаце: алімпіец, бывае, і выпівае. Дык як я потым у вочы глядзець юнакам і дзяўчатам буду, якіх агітую за здаровы лад жыцця? Адкрыю сакрэт. Яшчэ падчас СССР у зборнай спартсменам рэкамендавалі 100 грамаў сухога віна кожны дзень. Я, вядома, не злоўжываю, але тыя ж 100 грамаў чырвонага віна добрага на карысць толькі пойдуць.

А моладзі я шчыра раю атрымліваць асалоду ад заняткаў фізкультурай, спартыўных гульняў. Добры настрой атрымаеш такі, які алкаголь ніколі не можа даць. Дзяўчатам стройная фігура, здаровы колер твару гарантаваныя, калі яны актыўныя і займаюцца фізкультурай.

— Пра жанчын. І зараз вы — халасцяк?

— Даўно СМІ казаў, што ажанюся гэтай восенню. Можаце павіншаваць — вяселле прызначана на 9 кастрычніка 2010 года.

— Вадзім, віншуем з такой знамянальнай падзеяй у жыцці!!!

— Дзякуй! Мая выбранніца дапамагае мне ў спартыўных і іншых справах. Вельмі кахаю яе і цаню. Жаніўся б і раней. Але пакуль былі тыя «допінгавыя спрэчкі», не мог дазволіць сабе гэтага, пакуль не дакажу, што маю рацыю. І мая нявеста разумела гэтыя нюансы.

— Многія ведаюць што вы яшчэ і студэнт?

— Так. Зараз пасля таго, як стаў бакалаўрам, вучуся на юрыста ў магістратуры Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. А раней вучыўся на хіміка-тэхналагічным факультэце. Ды не мог з-за спаборніцтваў, трэніровак не адставаць ад аднакурснікаў, як і ўсе, працаваць у лабараторыі. На юрыдычным вучыцца прасцей. Я вельмі ўдзячны ўніверсітэту за разуменне.

— На алімпіяду ў Лондан?

— Абавязкова. Трэніруюся па тры гадзіны два разы штодня. Мая мара — залаты медаль на гульнях 2012 года. І адчуваю, што гэта мне па сілах.

Антон КАРОЎКІН, алімпійскі чэмпіён сярод юнакоў па стральбе з лука:

«УЗЯЎ І ВЫЙГРАЎ!»

Антон КАРОЎКІН і Глорыя ФІЛІПІ на алімпіядзе ў Сінгапуры.

МАГІЛЯЎЧАНІН Антон Кароўкін стаў алімпійскім чэмпіёнам. Ён заваяваў залаты медаль у стральбе з лука на першых юнацкіх летніх Алімпійскіх гульнях у Сінгапуры. Юны беларускі спартсмен, прадстаўнік магілёўскай спартыўнай школы прафсаюзаў «Юнацтва», выйграў сваё золата ў пары з італьянкай Глорыяй Філіпі. Цяпер 17-гадовага Антона можна зноў убачыць на лукадроме ў цэнтры Магілёва, дзе ён займаецца са сваім трэнерам Валянцінай Кавалёвай.

— Пачнём з вытокаў: як ты стаў лучнікам?

— Я спачатку займаўся плаваннем, а ў стральбу з лука прыйшоў толькі ў 13 гадоў. Мне сказалі так: калі гэта толькі для забавы — прыходзь некалькі разоў на тыдзень, калі гэта сур'ёзна — штодзень.

— І ты стаў хадзіць штодня?

— Так, мяне зацягнула. Я з таго часу займаюся штодня па 2,5-3 гадзіны, апроч нядзелі.

— І што, ніколі не ненавідаўся?

— «Не» прыступам ляноты. Толькі ўперад.

— Якім, на тваю думку, павінен быць трэнер, каб спартсмен дасягнуў поспеху? Жорсткім? Па-бацькоўску клапатлівым?

— Нешта сярэдняе між тым і тым.

— Калі ляцеў у Сінгапур, пра што думаў?

— Хацеў выступіць як можна лепей, але, вядома, на «золата» я не разлічваў. Проста хацеў паказаць дастойны вынік.

— Расказваюць, што па дарозе ты страціў свой багаж?

— Так і было. Багаж адправілі асобна ад мяне, і ён згубіўся. Прыбылі мае рэчы толькі за два дні да спаборніцтваў, калі мы ўжо пачалі дамаўляцца з польскімі калегамі, каб тыя пазычылі лукі.

— Твае чаканні апраўдаліся?

— Калі шчыра, я меркаваў, што будзе больш складана. Хоць гэта вельмі сур'ёзныя спаборніцтвы.

— Жорсткія па духу?

— Не, на спаборніцтвах спартсмены ставяцца адзін да аднаго вельмі добразычліва. Я іх ужо прайшоў з сотню — ад школьных ды гарадскіх, і далей. Аднак я ніколі моцна не засмучаўся, што прайграў.

— Аптымістычны настрой і дапамог табе выйграць урэшце?

— Я скарыстаўся парадай трэнера: Валянціна Міхайлаўна сказала, каб я не зацыкліваўся на трапнасці, а страляў, як умеў. Так я і зрабіў.

— У «мікст» дасталася італьянка Глорыя Філіпі?

— Арганізатары прыдумалі новыя правілы, каб у пары былі прадстаўнікі розных краін. Да гэтага я з Глорыяй не быў знаёмы, але пасля першай жа дуэлі зразумеў, што маем шанцы выступіць вельмі добра.

— На якой замежнай мове вы з ёй размаўлялі?

— Крыху на англійскай. Аднак літаральна некалькі слоў: маўляў, страляй добра, не напружвайся, зычу ўдачы. Мы шчыра радаваліся перамозе, а потым раз'ехаліся.

— Як цябе віншавалі з перамогай сваякі і сябры?

— У мяне быў з сабой ноўтбук, і ўсе віншаванні я прыняў па інтэрнэце на старонцы «У кантакце».

— Што змянілася пасля таго, як ты стаў алімпійскім чэмпіёнам сярод маладых спартсменаў?

— У мяне бяруць інтэрв'ю, але... амаль што нічога не змянілася. У мяне з'явіўся новы лук. Ён каштуе 2 тысячы еўра: палову гэтых грошай далі як перспектыўнаму спартсмену, палову заплаціла мая сям'я. Што датычыцца ўласных сродкаў, то я яшчэ столькі не зарабляю, хоць стараюся ў сваё задавальненне і гатовы займацца гэтым штодня.

— Як паставіліся да твайго поспеху бацькі?

— Маці сачыла за спаборніцтвамі ў Сінгапуры па інтэрнэце. Яна плакала ад радасці.

— Якія падарункі ты атрымаў?

— Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі падараваў мне DVD. Хутчэй за ўсё, я аддам яго сваёй бабулі, і набуду ёй некалькі старых фільмаў для задавальнення.

— А якім фільмам аддаеш перавагу ты?

— Ну, мне падабаюцца фантастычныя фільмы з элементамі жахаў — напрыклад, «Ван Хельсінг». Хоць, з іншага боку, савецкія мультыцікі кшталту «Віні-Пуха» я таксама гляджу з задавальненнем.

— А музыка, кнігі?

— Транс, электра. Паважаю «Кароль і шут». Што датычыцца кніг, то я не вельмі шмат чытаю. Спадабаліся творы Булгакава — «Сабачае сэрца» і «Майстар і Маргарыта».

— Ты цяпер стаў студэнтам?

— Так, я паступіў сёлета на факультэт фізічнага выхавання Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. Таму ў першай палове дня я на занятках, а ў другой — на трэніроўцы.

— А звычайныя моладзевыя забавы? Начныя клубы?

— Няма калі мне хадзіць у начныя клубы. Ды і калі ёсць вольны час, то аддаю перавагу боўлінгу і більярду, разам з сябрамі.

— А ў Сінгапуры была забаўляльная праграма, па-за межамі спаборніцтва?

— Там былі ўсталяваныя палаткі — спачатку еўрапейская, потым афрыканская і азіяцкая, дзе былі розныя забавы. Нас таксама вазілі на вострaў, дзе мы лазілі па скалах і будавалі плот. У акіяне нам купацца не дазвалялі, паводле тэхнікі бяспекі.

— А якія ўражанні ад горада?

— Там вельмі прыгожа і чыста. Пра акуратнасць сведчыць той факт, што ўсе дрэвы перанумараваныя. Усе людзі добразычлівыя і пастаянна ўсміхаюцца. І вельмі пунктуальныя: калі сказана, што аўтобус прыйдзе у 8.47, значыць так і будзе — хвіліна ў хвіліну.

— Якія «алімпійскія» стравы табе спадабаліся?

— З экай праблем не было. Там вельмі смачна гатуюць рыбу на пару і рыс. А вось бульбу ў Сінгапуры рабіць не ўмеюць: вараць і не соляць, а пюрэ заўсёды з камкамі.

— У якіх ты краінах яшчэ быў, і дзе найбольш спадабалася альбо не спадабалася?

— Быў у Польшчы, Турцыі, Італіі. У Амерыцы, у штаце Юта, прызнаюся, не вельмі спадабалася: там усе людзі нейкія тоўстыя і вусатыя. Прыемнае ўражанне пакінула Германія.

— Што трэба рабіць, каб стаць алімпійскім чэмпіёнам? Твой рэцэпт поспеху.

— Трэба быць упартым чалавекам. Штодня трэніравацца: не даваць ніводнага шанцу ляноце і, калі трэба, проста прымушаць сябе. Акрамя сілы волі, патрабуецца таксама псіхалагічная ўстойлівасць. Каб узяць і выйграць!

— Якія цяпер планы? Напрыклад на Лондан-2012?

— Цяпер трэба зноў пачынаць з чыстага ліста, таму што давядзецца супернічаць з дарослымі спартсменамі. Трэба шмат працаваць, каб трапіць у нацыянальную зборную, потым добра выступіць на чэмпіянаце свету, дзе будуць разыгрывацца алімпійскія ліцэнзіі. Так што ёсць куды імкнуцца.

ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА АКАДЭМІЧНЫМ ВЕСЛАВАННІ 2015 ГОДА МОЖА АДБЫЦЦА Ў БРЭСЦЕ!

З начальнікам упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама Мікалаем ХЕВУКОМ мы гутарым пра спартыўныя перспектывы Брэсцкай вобласці.

— Калі меркаваць па ўзроўні развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы для заняткаў спортам, то наша вобласць займае адно з першых месцаў, — пачынае расповед Мікалай Мікалаевіч. Можна прыводзіць шматлікія прыклады. Так, з 21 лядовай арэны краіны — шэсць знаходзяцца на тэрыторыі вобласці, у іншых абласцях дзейнічаюць пакуль па дзве, тры лядовыя арэны. Мы маем таксама 24 аб'екты, якія з'яўляюцца базамі падрыхтоўкі нацыянальных камандаў краіны. Сярод самых буйных гэта вяслярны канал — наша гордасць, таксама спартыўны комплекс для гульнявых відаў спорту «Вікторыя», спартыўная база Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, палац водных відаў спорту і лядовая арэна ў Пружанах, а таксама цудоўная спартыўная база, якая ўключае стадыён, аквапарк, лядовы палац у Кобрыне і шмат іншых. У найбліжэйшы час будзе ўведзены ў строй Цэнтр алімпійскага рэзерву па водных відах спорту ў Брэсце з чатырма басейнамі. Гэты аб'ект — адзін з лепшых сярод аналагічных у Еўропе. Сёлета плануецца таксама прыняць ад іх лядовы палац і басейн у Лунінцы. У Маларыце да 10 кастрычніка павінен быць уведзены ў строй спартыўны комплекс з гульнявой залай і плавальным басейнам. Вялікія аб'екты — лядовы палац, стадыён, басейн — узводзяцца і ў Івацэвічах.

Я наўмысна не сказаў пра Баранавічы, бо хацеў сказаць пра спартыўную базу горада падрабязней. Лядовы палац ў Баранавічах — адзін з самых прыгожых у краіне. Ён зручны як для заняткаў

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

прафесійных спартсменаў, так і для гараджан. Там можна гуляць у більярд, боўлінг, займацца фітнэсам і аэробікай, практыкавацца на трэнажорах. Зараз вядзецца праектаванне, і ў пачатку наступнага года распачнецца будаўніцтва басейнаў, хакейнага поля са штучным пакрыццём для хакея на траве і спартыўнай гасцініцы на 140 месцаў.

— Мікалай Мікалаевіч, як выглядае акупнасць буйных спартыўных аб'ектаў?

— Сапраўды, гэта актуальнае пытанне. Калі ўзводзіліся палацы, многія і гаварылі, і пісалі пісьмы ў органы ўлады наконт таго, што не патрэбныя гэтыя гмахі. І што мы бачым цяпер? На ўтрыманне вяслярнага канала з бюджэту летась было выдаткавана 1,9 мільярда рублёў. Зарабіў аб'ект за год 2,6 мільярда. Значыць, не сядзіць ён, вобразна кажучы, на шыі ў дзяржавы. Прашу мець на ўвазе, што платныя паслугі прадастаўляюцца дарасламу насельніцтву. Усе дзеці займаюцца ў секцыях, спартыўных школах на гэтай базе бясплатна. Ахвотных жа на платныя заняткі — колькі хочаш! Часта ў трэнажорныя залы, плавальныя басейны — асабліва позняй восенню, зімой складана трапіць. Цяпер нам пішуць лісты іншага зместу: дайце магчымасць катацца на каньках у лядовым палацы альбо ўзводзьце яшчэ адну арэну. Там вельмі мала часу адводзіцца для аматараў пакатацца, расклад поля шчыльна запоўнены гурткамі, секцыямі, заняткамі прафесіяналаў.

— Наяўнасць такіх салідных спартыўных збудаванняў дазваляе праводзіць спаборніцтвы самага высокага ўзроўню...

— Сапраўды так. Толькі апошнім часам у Брэсце адбыліся Першыя Еўразійскія гульні сярод юнакоў і дзяўчат з удзелам дзесяці краін, чэмпіянат Еўропы па самба з удзелам 26 краін, у нас праходзяць лігі чэмпіёнаў па гандболе, валейболе. А сёлета ў лістападзе адбылася бадай што самая буйная спартыўная падзея ў гісторыі суверэннай Беларусі — чэмпіянат свету па акадэмічным веславанні сярод моладзі да 23 гадоў з удзелам 58 краін свету. Гэта вельмі важнае спартыўнае мерапрыемства. Яно ў нейкім сэнсе паказала ўсяму свету магчымасці нашай краіны. Госці ўпэўніліся, што мы можам праводзіць спаборніцтвы самага высокага ўзроўню. А яшчэ гэтыя мерапрыемствы паказалі нам, што ў паслугах нашых спартыўных баз зацікаўленыя і замежныя партнёры. Адразу пасля чэмпіянату свету да нас папрасіліся расіяне — рыхтавацца да сусветных спаборніцтваў у Партугаліі. А мы, як кажуць, з дарагой душой, нам гэта выгодна. І вось каманда Расійскай Федэрацыі рыхтавалася да свайго выступлення менавіта ў Брэсце. Праяўляюць інтарэс і іншыя краіны.

— Моладзевыя спаборніцтвы веславаннем прайшлі ў нас паспяхова. Але ці маюць пад сабой грунт чуткі, якія пайшлі пасля чэмпіянату, наконт таго, што болей не будзе гульняў у Брэсце, бо наш аэрапорт не задавальняе патрабаванням замежнікаў?

— Скажу найперш, што Брэст заяўлены адным з кандыдатаў на правядзенне чэмпіянату свету па акадэмічным веславанні ў 2015 годзе. Пытанне вырашыцца ў кастрычніку-лістападзе. І мы спадзяёмся, што прадстаўнікі тых 58 краін, што ў нас пабывалі, замовяць слова за наш горад.

А што датычыць Брэсцкага аэрапорта, ён гатовы прымаць любыя тыпы самалётаў. Але, як вядома, няма рэйсаў у Брэст з еўрапейскіх сталіц. Таму даводзілася дастаўляць спартсменаў з Мінска або Варшавы аўтатранспартам. Не думаю, што гэта вялікая праблема. З праходам граніцы на гэты раз не было ніякіх затрымак, мытныя і памежныя фармальнасці былі праведзены хутка, дакладна і амаль непрыкметна для спартсменаў. Зараз мы разам з авіятарамі вывучаем пытанне магчымай пасадкі ў Брэсце самалётаў са спартсменамі, якія будуць ажыццяўляць рэйсы на Мінск.

— А якія яшчэ спаборніцтвы высокага ўзроўню чакаюцца ў Брэсце ў бліжэйшы час?

— На наступны год мы прымаем у сябе чэмпіянат Еўропы па бейсболе. Вывучаецца магчымасць правядзення моладзевага чэмпіянату Еўропы па хакеі на траве. Усе спаборніцтвы важныя, і ўсе яны ў рэшце рэшт вядуць да выяўлення лепшых, да нараджэння алімпійскіх надзей. Папулярнымі сталі моладзевыя лёгкаатлетычныя турніры на прызы газеты «Звязда», за што мы шчыра ўдзячныя газеце. І на нашай штогадовай лыжні «Звязда» — чаканы госць. Нярэдка перад спаборніцтвамі ўдзельнікі пытаюць, ці будзе на гэты раз «Звязда» ўшаноўваць нейкіх лыжнікаў. І мы рады даваць станоўчы адказ.

ГАНДБАЛІСТЫ ПЕРАМАГЛІ Ў ЛІЗЕ ЧЭМПІЁНАЎ

Гандбалісты мінскага «Дынама» правялі 2 кастрычніка другі матч групавога этапу Лігі чэмпіёнаў. На пляцоўцы мінскага Палаца спорту дынамаўцы перамаглі венгерскі «Пік» — 33:29. Два матчы ў той жа групе С, дзе выступае «Дынама», завяршыліся ўнічыю: іспанскі «Вальядалід» на сваёй пляцоўцы не змог перагуляць расійскі клуб «Чэхаўскія мядзведзі» — 26:26. Таксама не выявілі пераможцу дацкі «Ольбарг» і швейцарскі «Шафхаўзэн» — 30:30. Пасля двух тураў становішча ў групе С: «Чэхаўскія мядзведзі», «Вальядалід» — 3 ачкі, «Дынама», «Пік» — 2, «Шафхаўзэн», «Ольбарг» — 0.

Фота БЕЛТА.

А сярэбраны прызёр чэмпіянату Беларусі па гандболе БГК імя Мяшкова ў той жа дзень у першым матчы кваліфікацыйнага раўнда Кубка ЕГФ прымаў македонскі «Металург». Гаспадары атрымалі перамогу з лікам 28:23. Паядынак у адказ пройдзе 9 кастрычніка ў сталіцы Македоніі Скоп'е.

«ДЫНАМА» МОЖА ВЫПАСЦІ З МЕДАЛЬНАЙ ГОНКІ

У 27-м туры першынства краіны па футболе ў вышэйшай лізе футбалісты мінскага «Партызана» атрымалі чацвёртую перамогу ў чэмпіянаце — над тарпедаўцамі з Жодзіна (1:0). Праўда, ім атрымалася сысці з апошняга месца толькі на адзін дзень, таму як гродзенскі «Нёман» днём пазней дома падзяліў ачкі з БАТЭ — 1:1. Сталічнае «Дынама» атрымала другое паражэнне запар — у Наваполацку мінчане саступілі мясцоваму «Нафтану» з лікам 0:2. Вынікі астатніх гульняў: «Мінск» — «Дынама» (Брэст) — 2:2; «Віцебск» — «Белшына» (Бабруйск) — 0:2; «Шахцёр» (Салігорск) — «Днепр» (Магілёў) — 3:2. Пяцёрка лідараў чэмпіянату: БАТЭ — 59 ачкоў, «Шахцёр» — 52, «Мінск» — 52, «Дынама» (Мінск) — 46, «Белшына» — 40.

ХАКЕІСТЫ НЕ МОГУЦЬ НАЛАДЗІЦЬ ГУЛЬНІ

Хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі на выездзе два паражэння запар, прайграўшы 1 кастрычніка ў Астане «Барысу» і 3-га ў Омску «Авангарду» з аднолькавым лікам 2:4. Правальнымі ў нашай каманды атрымліваліся другія перыяды матчаў, падчас якіх яны саступалі супернiку 0:2 і 1:4 адпаведна. Цяпер мінчане займаюць з 17-ю ачкамі 6-е месца ў Заходняй канферэнцыі Кантынентальнай хакейнай лігі.

АЗАРАНКА ЗНОЎ У ДЗЯСЯТЦЫ

Беларуска Вікторыя Азаранка вярнулася ў дзясятку мацнейшых тэнісістак свету. Віка паднялася на адну прыступку і зараз займае 10-е месца ў новым рэйтынгу WTA ад 4 кастрычніка. Вяртанне ў топ-10 ёй забяспечыла гульня на турніры ў Токіа, дзе Азаранка дайшла да паўфінала і саступіла Каралін Возняцкі з Даніі.

Ведай нашых!

БАТЭ — 36-ты ў спісе лепшых сусветных клубаў

Міжнародная федэрацыя футбольнай гісторыі і статыстыкі апублікавала чарговы рэйтынг лепшых клубаў свету. За месяц барысаўскі БАТЭ падняўся з 47-га на 36-ы радок.

Першае месца займае італьянскі «Інтэр» (300 ачкоў), на другім — іспанская «Барселона» (297), на трэцім — нямецкая «Баварыя» (260).

У БАТЭ 177 ачкоў, і за час з моманту апублікавання папярэдняга рэйтынгу, калі барысаўчане ўнічыю згулялі з кіеўскім «Дынама» (2:2) і разграмілі галандскі АЗ (4:1), клуб падняўся на 11 пазіцый. Усе супернікі беларускага чэмпіёна па групе Е ў Лізе Еўропы знаходзяцца ў рэйтынгу ніжэй. Кіяўляне апусціліся з 66-га на 77-ы радок. Нягледзячы на разгром у Мінску, галандцы паднялося з 119 на 97-ю пазіцыю. Малдаўскі «Шэрыф» страціў адну прыступку і знаходзіцца на 101-м месцы.

Матэрыялы спецвыпуску «Алімпіец» падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Святлана ЯСКЕВІЧ, Ілона ІВАНОВ

ТАКСІЧНЫЯ АДХОДЫ: АПЕРАЦЫЯ «ЛІКВІДАЦЫЯ»

Стойкія арганічныя забруджвальнікі (САЗ) назапашваюцца ў прыродным асяроддзі, арганізме чалавека і жывёл, перамяшчаюцца на вялікія адлегласці, нават у самай малой канцэнтрацыі праяўляюць генатаксічны, імунатаксічны і канцэрагенны эфекты. Менавіта таму праблема звароту са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі вызначана сусветнай супольнасцю як глабальная экалагічная пагроза, якая патрабуе прыняцця тэрміновых мераў.

Міжнародныя патрабаванні па звароце з гэтымі забруджвальнікамі вызначаныя Стакгольмскай канвенцыяй аб стойкіх арганічных забруджвальніках. Дакумент быў прыняты ў Стакгольме (Швецыя) яшчэ ў 2001 годзе. Ужо ў 2003-м да яе далучылася і Беларусь.

Стакгольмскай канвенцыяй вызначаныя 12 самых небяспечных сінтэзаваных стойкіх арганічных забруджвальнікаў. Дзевяць з іх — гэта хлорзмяшчальныя пестыцыды (альдрын, дыльдрын, хлардан, дыхлор-дыфеніл-трыхлорэтан, эндрын, гептахлор, гексахлорбензол, міракс і таксафен), поліхларыраваныя біфенілы (ПХБ) і выкіды поліхларыраваных дыбенза-n-дыякінаў і дыбензафуранаў, гексахлорбензолу і ПХБ (дыяксіны і фураны). Поліхларыраваныя біфенілы доўгі час выкарыстоўваліся ў якасці дыэлектрычнай або ахаладжальнай вадкасці ў электраабсталяванні, у якасці пластыфікатараў і іншых дабавак падчас вытворчасці лакаў, фарбаў, змазачных маслаў, гідраўлічных вадкасцяў і г.д.

У маі мінулага года ў Жэневе, на чацвёртай нарадзе канферэнцыі бакоў Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках было прынятае рашэнне аб унясенні паправак да канвенцыі. Так, у дакументе апынуўся яшчэ шэраг хімічных рэчываў: хлордэкон, гексабромдыфеніл, пентахлорбензол, ліндан, альфа-гексахлорцыклагексан, бэта-гексахлорцыклагексан, тэтрабромдыфенілавы эфір і пентабромдыфенілавы эфір (камерцыйны пентабромдыфенілавы эфір), гексабромдыфенілавы эфір і гептабромдыфенілавы эфір (камерцыйны актабромдыфенілавы эфір), перфторактанавая сульфонавая кіслата, яе солі і перфторактанавыя сульфанілфтарыды. Нягледзячы на тое, што ў спіс трапілі пентабромдыфенілавы і актабромдыфенілавы эфіры, была дазволеная перапрацоўка тавараў, якія ўтрымліваюць гэтыя рэчывы, а таксама іх экспарт да 2030 года.

Як ужо было сказана, Беларусь далучылася да Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках пасля прыняцця Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2003 года. Такім чынам, краіна ўзяла на сябе пэўныя абавязацельствы. Быў распрацаваны Нацыянальны план выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках, на 2007-2010 гады і на перыяд да 2028 года. План быў зацверджаны адпаведным Указам Прэзідэнта.

На першым этапе — у 2007-2010 гадах — асноўнымі накірункамі работы сталі ўдасканаленне заканадаўства ў галіне звароту са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі, абследаванне і ачыстка тэрыторый, забруджаных апошнімі, развіццё нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя і стану здароўя насельніцтва, экалагічна бяспечнае захаванне і абясшкоджванне адходаў, якія ўтрымліваюць стойкія арганічныя забруджвальнікі.

Як паведамляюць у **Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь,** на сёння зроблены папярэдні аналіз выканання мерапрыемстваў Нацыянальнага плана выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках, на 2007-2010 гады.

1. ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ Ў ГАЛІНЕ АБЫХОДЖАННЯ З САЗ

Прыняты шэраг нарматыўных прававых і тэхнічных нарматыўных прававых актаў, якія ўстанаўліваюць прыродаабарончыя патрабаванні пры абыходжанні з САЗ.

Пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі ад 3 лютага 2005 года «Аб зацвярджэнні Правілаў звароту з непрыдатнымі пестыцыдамі» ўстаноўленыя прыродаахоўныя патрабаванні пры звароце з непрыдатнымі пестыцыдамі на тэрыторыі краіны. У тым ліку парадак арганізацыі работ пры звароце з непрыдатнымі пестыцыдамі, абавязкі іх уладальнікаў пры абыходжанні з апошнімі, парадак уліку, інвентарызацыі, патрабаванні да захавання і перавозкі, парадак пераўпакоўкі, парадак і спосабы ідэнтыфікацыі, патрабаванні да тэхнікі бяспекі, пажарнай бяспекі і ахове працы пры рабоце з непрыдатнымі пестыцыдамі, парадак арганізацыі і правядзення маніторынгу навакольнага асяроддзя ў раёне размяшчэння аб'ектаў захавання непрыдатных пестыцыдаў, прыродаахоўныя патрабаванні да работ па абясшкоджанні непрыдатных пестыцыдаў.

У 2008 годзе прынятая пастанова Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі «Аб зацвярджэнні Правілаў абыходжання з абсталяваннем і адходамі, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы». Правілы вызначылі парадак ідэнтыфікацыі, маркіроўкі і ўліку абсталявання і адходаў, якія ўтрымліваюць поліхларыраваныя біфенілы; парадак кантролю стану абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ і дзеянні пры выяўленых пашкоджаннях і ўцечцы ПХБ; патрабаванні да захоўвання і перамяшчэння абсталявання і адходаў, якія ўтрымліваюць ПХБ; патрабаванні бяспекі пры рабоце з абсталяваннем, якое ўтрымлівае ПХБ.

Для стварэння неабходнай метадычнай базы маніторынгу САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2007 года зацверджаныя дзяржаўныя стандарты СТБ EN 1948-2-2007 «Выкіды ад стацыянарных крыніц. Вызначэнне масавай канцэнтрацыі ПХДД/ПХБФ і дыяксідападобных ПХБ. Частка 2. Экстракцыя і ачыстка ПХДД/ПХБФ» і СТБ ISO 11464-2007 «Якасць глебы. Папярэдняя падрыхтоўка проб для фізіка-хімічнага аналізу»; СТБ ISO 14507-2007 «Якасць глебы. Папярэдняя падрыхтоўка проб для вызначэння арганічных забруджвальных рэчываў».

Мінпрыроды сумесна з Дзяржстандартам распрацаваў дзяржаўны стандарт СТБ EN 1948-3-2008 «Выкіды ад стацыянарных крыніц. Вызначэнне масавай канцэнтрацыі ПХДД/ПХДФ і дыяксінападобных ПХБ. Частка 3. Ідэнтыфікацыя і якаснае вызначэнне ПХДД/ПХДФ».

Сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі Мінпрыроды распрацаваў тэхнічны кодэкс установы практыкі (ТКП) 17.08-13-2010 «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Атмасфера. Выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра. Правілы разліку выкідаў стойкіх арганічных забруджвальнікаў». Кодэкс устанаўлівае адзіны парадак разліку выкідаў у атмасферу такіх стойкіх арганічных забруджвальнікаў, як дыяксіны/фураны, ПХБ, гексахлорбензол і індыкатарныя злучэнні (бенза(а)перэн, бенза(b)флуарантэн, бенза(k)флуарантэн, індэна(1,2,3-c,d)пірэн). Гэты дакумент утрымлівае ўдзельныя паказчыкі выкідаў САЗ для асноўных катэгорый крыніц выкідаў у Рэспубліцы Беларусь.

2. УПРАЎЛЕННЕ Ў ГАЛІНЕ АБЫХОДЖАННЯ З САЗ

У рамках Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя распрацаваная структура спецыялізаванай базы даных САЗ: вызначаныя фарматы захоўвання, уводу і сарціроўкі даных з улікам дыферэнцыяцыі па аб'ектах назірання з дакладнай ідэнтыфікацыяй месцаў адбору проб. Выкананая распрацоўка праграмнага модуля для першаснай апрацоўкі інфармацыі з мэтай вызначэння ў рамках вопытнай эксплуатацыі фарматаў карыстальніцкіх справаздач пры распрацоўцы прыкладнога праграмнага прадукту на наступных этапах. Акрамя таго, сфарміраваныя звесткі маніторынгу САЗ у павярхоўных і падземных водах, глебе за 2006–2007 гады.

Для расшырэння функцыянальных магчымасцяў спецыялізаванай базы звестак праведзеная яе рэструктурызацыя, створаныя асобныя банкі даных аб'ектаў навакольнага асяроддзя (павярхоўныя і падземныя воды, донныя адкладанні і завесі, глебы), створаная бібліятэка дзейных і патэнцыйных крыніц паступлення САЗ у навакольнае асяроддзе, у раёнах размяшчэння якіх арганізаванае правядзенне назіранняў.

Праведзеная работа па стварэнні баз звестак аб пестыцыдах, аб'ектах іх размяшчэння і тэрыторыях, забруджаных пестыцыдамі; аб ПХБ, абсталяванні, матэрыялах і адходах, якія ўтрымліваюць ПХБ; тэрыторыях, забруджаных ПХБ; аб крыніцах выкідаў САЗ у выніку іх ненаўмыснай вытворчасці.

Прыклад правядзення інжынерна-тэхнічных мерапрыемстваў на адным з захаваняў непрыдатных пестыцыдаў. Да правядзення работ і пасля.

3. АБЫХОДЖАННЕ З НЕПРЫДАТНЫМІ ПЕСТЫЦЫДАМІ

На тэрыторыі рэспублікі размешчаныя сем захаванняў непрыдатных пестыцыдаў. У **Брэсцкай вобласці** — Гяршонскае захаванне, **Віцебскай** — Верхнядзвінскае, Пастаўскае, Гарадоцкае, **Гомельскай** — Петрыкаўскае, **Гродзенскай** — Слонімскае, **Магілёўскай** — Дрыбінскае. У 2007 годзе ліквідаванае Гяршонскае захаванне непрыдатных пестыцыдаў. Атрыманыя пестыцыды накіраваныя на КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці». У Гомельскай вобласці працягваюцца работы па ліквідацыі Петрыкаўскага захавання непрыдатных пестыцыдаў.

Выкананыя інжынерна-тэхнічныя мерапрыемствы па зніжэнні шкоднага ўздзеяння непрыдатных пестыцыдаў, якія ўтрымліваюцца ў Слонімскім, Верхнядзвінскім, Пастаўскім, Гарадоцкім, Дрыбінскім захаваннях: адноўленыя пад'язныя шляхі, абводныя каналы для адводу талых вод, абгароджванні, назіральныя свідравіны, захаванні ўкрытыя плёнкай або дадатковым слоем гліны, устаноўлены аншлагі.

Праведзеная работа па пераўпакоўцы непрыдатных пестыцыдаў, якія знаходзяцца на захаванні ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах.

Па інфармацыі Галоўнай дзяржаўнай інспекцыі па насенняводстве, каранціне і абароне раслін, у рэспубліцы застаюцца неператраўпакаванымі 153 тоны пестыцыдаў. З іх у Віцебскай вобласці — 99,2 тоны, Гродзенскай — 21,1 і Мінскай — 32,7 тоны.

4. АБЫХОДЖАННЕ З АБСТАЛЯВАННЕМ, МАТЭРЫЯЛАМІ І АДХОДАМІ, ЯКІЯ ЎТРЫМЛІВАЮЦЬ ПОЛІХЛАРЫРАВАНЫЯ БІФЕНІЛЫ

Праведзеная інвентарызацыя і маркіроўка абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ. Па выніках інвентарызацыі ўстаноўлена, што ў Беларусі налічваецца 54,6 тысячы сілавых кандэнсатараў, 308 сілавых трансфарматараў і 29 ёмістасцяў з ПХБ.

Праведзеная маркіроўка электратэхнічнага абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ, аб'ектаў размяшчэння абсталявання і адходаў з ПХБ.

З 2007 года ажыццяўляецца вывад з эксплуатацыі абсталявання з ПХБ. На сёння налічваецца каля 20,6 тысячы кандэнсатараў, або выведзеных з эксплуатацыі, або тых, што знаходзяцца ў рэзерве, — гэта 37 працэнтаў ад іх агульнай колькасці.

Асноўная колькасць выведзеных з эксплуатацыі кандэнсатараў належыць прадпрыемствам Міністэрства энергетыкі Беларусі і Міністэрства прамысловасці Беларусі.

Выведзена з эксплуатацыі 39 адзінак трансфарматараў, што складае 11,6 працэнта ад агульнай колькасці. Больш за палову выведзеных з эксплуатацыі трансфарматараў належыць прадпрыемствам канцэрна «Белнафтахім». Усімі міністэрствамі і ведамствамі зацверджаныя галіновыя планы дзеянняў па вывадзе з эксплуатацыі абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ, і яго дастаўкі на КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці».

Абнаўленне пераліку тэрыторый, забруджаных ПХБ, выконваецца з улікам вынікаў спецыяльнага абследавання шэрагу падстанцый РУП «Брэстэнерга», канцэрна «Белэнерга», цягавых падстанцый Беларускай чыгункі, а таксама прампляцоўкі ААТ «Лакафарба». У Беларусі выяўленыя забруджаныя глебы на тэрыторыі 28 прадпрыемстваў, у тым ліку 52 падстанцыях і 7 прампляцоўках. Гэты пералік будзе папаўняцца па меры расшырэння даследаванняў і назапашвання звестак аб утрыманні ПХБ у глебах.

У 2008 годзе былі праведзеныя работы па выемцы найбольш забруджанага грунту на прадпрыемствах Беларускай чыгункі. Грунт упакаваны ў металічныя або пластмасавыя ёмістасці. Агульная вага выбраных і ўпакаваных грунтоў склала каля 33 тон. У 2009 годзе ў арганізацыях «Белэнерга» таксама былі праведзеныя работы па выемцы і ўпакоўцы ў герметычныя кантэйнеры 2,5 тоны грунту, забруджанага ПХБ. Паўторнае абследаванне гэтых пляцовак паказала, што астаткавая колькасць ПХБ не перавышае 50 мг/кг глебы.

5. МАНІТОРЫНГ УТРЫМАННЯ САЗ У НАВАКОЛЬНЫМ АСЯРОДДЗІ

Асноўнай задачай маніторынгу і кантролю за САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя на 2006-2010 гады было фарміраванне сістэмнага падыходу да маніторынгу САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя, інтэграванага ў Нацыянальную сістэму маніторынгу навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь.

Паэтапнае разгортванне сістэмы маніторынгу САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя ўключала ў сябе:

— фарміраванне прыборнага і метадычнага забеспячэння для правядзення вымярэнняў утрымання САЗ у розных аб'ектах навакольнага асяроддзя;

— правядзенне папярэдніх даследаванняў і вызначэнне на іх аснове прынцыпаў тэрытарыяльнага і мэтавага фарміравання сеткі пунктаў маніторынгу і рэгламентаў правядзення назіранняў;

— стварэнне тэхнічнай базы для арганізацыі збору і захоўвання атрыманых звестак маніторынгу САЗ у аб'ектах навакольнага асяроддзя.

Набыты і ўведзены ў эксплуатацыю высокаэфектыўны вадкасны храматограф, прызначаны для колькаснага вызначэння палярных арганічных злучэнняў, што дазволіла павялічыць аб'ёмы аналітычных работ і дакладнасць аналізу проб.

6. МАНІТОРЫНГ СТАНУ ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў СУВЯЗІ З УЗДЗЕЯННЕМ САЗ

З мэтай развіцця сістэмы маніторынгу здароўя насельніцтва рэспублікі ў сувязі з уздзеяннем САЗ Міністэрства аховы здароўя Беларусі распрацавала «Методыку адначасовага вызначэння астаткавых колькасцяў поліхларыраваных біфенілаў і хлорарганічных пестыцыдаў у грудным жаночым малацэ і прадуктах жывёлагадоўлі з дапамогай вадкаснай храматаграфіі». Зацверджаная Галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь у 2007 годзе методыка прадугледжвае парадак правядзення аналізу прадуктаў харчавання, якія могуць быць патэнцыйна забруджанымі ПХБ, — малака і малочных прадуктаў, мяса і мясапрадуктаў.

У рамках санітарнага нагляду праведзена:

*звыш 10 тысяч аналізаў на ўтрыманне хлорарганічных злучэнняў у мясе і мясапрадуктах, рыбе і рыбапрадуктах, малацэ і прадуктах, вырабленых з малака. Перавышэнняў установленых гігіенічных рэгламентаў не выяўлена.

*250 даследаванняў на ўтрыманне поліхларыраваных дыбенза-n-дыяксінаў і дыбенза-n-фуранаў.

*198 даследаванняў узораў прадуктаў харчавання, харчовай сыравіны і пітной вады з усіх рэгіёнаў рэспублікі на ўтрыманне поліхларыраваных біфенілаў.

7. СКАРАЧЭННЕ ВЫКІДАЎ САЗ У ВЫНІКУ ІХ НЕНАЎМЫСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

У 2007 годзе Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі былі набыты 52 катлаагрэгаты, у камплект якіх уваходзяць гарызантальныя цыклоны-попелаўлоўнікі, прызначаныя для сухой інерцыйнай чысткі газаў з максімальнай тэмпературай 280 градусаў.

8. ІНФАРМАЦЫЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ РАБОТА

Забяспечана функцыянаванне сайта, на якім размяшчаюцца і абнаўляюцца інфармацыйныя матэрыялы пра САЗ. Праблема неаднойчы агучвалася з дапамогай сацыяльных відэаролікаў, прысвечаных папярэджванню негатыўнага ўздзеяння САЗ на навакольнае асяроддзе і чалавека. У перыядычных выданнях друкаваліся адпаведныя тэматычныя артыкулы. Два гады таму быў праведзены рэспубліканскі конкурс праектаў грамадскіх аб'яднанняў.

9. НАВУКОВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ Ў ГАЛІНЕ АБЫХОДЖАННЯ З САЗ

Распрацаваны прагноз аб'ёмаў выкідаў САЗ на перыяд да 2020 года.

Сумарныя выкіды дыяксінаў/фуранаў у атмасфернае паветра ў 2008 годзе склалі, паводле ацэнак, 38,163 г ЭТ, выкіды ГХБ — 0,816 кг у год, выкіды ПХБ — 11,318 кг у год.

Праведзеная работа па абгрунтаванні ўкаранення тэхналогіі абясшкоджвання САЗ. Улічваючы аб'ёмы ўжо назапашаных небяспечных адходаў і адходаў, якія будуць штогод утварацца, прызнанае мэтазгодным укараненне ў Беларусі ўстаноўкі па вынішчэнні ўсяго спектра небяспечных адходаў вытворчасцю 1-4 тысяч тон у год.

Дырэкцыяй КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці» падрыхтаванае заданне па працэдуры адкрытага конкурсу на закупку абсталявання для абясшкоджвання небяспечных адходаў тэрмічным метадам.

Святлана БАРЫСЕНКА,
Віктар ПАЗНЯКОЎ.

УНП 100519825.

У 70–80 гадах мінулага стагоддзя каля 3,7 тысячы тон непрыдатных пестыцыдаў былі змешчаныя ў сямі захаваннях Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.

За кошт сродкаў рэспубліканскага фонду аховы прыроды ліквідаванае Гяршонскае захаванне непрыдатных пестыцыдаў у Брэсцкай вобласці. Непрыдатныя пестыцыды былі вывезеныя на КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці». З 2008 года ў Гомельскай вобласці працягваюцца работы па ліквідацыі самага буйнога — Петрыкаўскага захавання непрыдатных пестыцыдаў, якое знаходзіцца на тэрыторыі Лучыцкага лясніцтва Петрыкаўскага раёна.

Месцы размяшчэння захаванняў непрыдатных пестыцыдаў

На тэрыторыі Беларусі застаецца 6 захаванняў з 3540,4 тонамі непрыдатных пестыцыдаў. Разглядаецца магчымасць ліквідацыі ўсіх захаванняў.

Праект Нацыянальнага плана выканання абавязкаў, прынятых Рэспублікай Беларусь па Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках, на 2011-2015 гады і на перыяд да 2028 года прадугледжвае ліквідацыю Слонімскага захавання непрыдатных пестыцыдаў з прыцягненнем міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Запланаваная таксама ліквідацыя Гарадоцкага захавання непрыдатных пестыцыдаў.

Праведзенае папярэдняе даследаванне каля 150 патэнцыяльных крыніц паступлення САЗ. Гэта захаванні непрыдатных пестыцыдаў, палігоны бытавых і прамысловых адходаў, глеістыя карты, палі фільтрацыі. Штогадовыя аб'ёмы адабраных проб і выкананых аналізаў склалі больш за 250 і 3,5 тысячы адпаведна. Гэта дазволіла арганізаваць сістэматычнае назіранне ўтрымання хлорзмяшчальных пестыцыдаў і ПХБ у аб'ектах навакольнага асяроддзя ў раёнах размяшчэння шэрагу буйных і патэнцыйна небяспечных крыніц паступлення САЗ. Акрамя таго, арганізаванае правядзенне сістэматычных назіранняў за ўтрыманнем САЗ у вадзе і донных адкладаннях трансгранічных участкаў 35 рэк Беларусі.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



«ТВАР» ЧАЮ

УВАЖЛІВА прыгледзьцеся да чалавека на здымку. Колькі б вы яму далі? А калі б не сівізна? Мэрыл ФЯРНАНДА ў свае пачэсныя 80 (!) — не толькі заснавальнік чайнай кампаніі Dilmah ды тамтэйшы дэгустатар, але і яе «твар». І ўсе свае ролі ён выконвае, па ўсім відаць, бліскуча.

Фота Яўгена ІРАСІНАВОКА.

Яго дзецішча (і гэта зусім не пераболшанне, бо сама назва «Dilmah» паходзіць ад імёнаў малодшых Фярнанда — Дзілхана і Маліка, сімвалізуючы вялікую любоў да чаю бы да трэцяга сына) — чацвёрты найбуйнейшы чайны брэнд у свеце. Гэтай гарбатай ласуюцца на ўсіх кантынентах — больш як у 90 краінах свету, не выключэнне і наша радзіма. Бізнэс-крэда спадара Фярнанда — вырабляць чай і ўпакоўваць яго там жа, дзе ён расце. Такі шлях (з чайнага саду, дзе кожны лісток збіраецца клапатлівымі жаночымі рукамі, — наўпрост у кубак) гарантуе якасць напою. Так, узамен сыравіне — шырспажыву з незразумела чаго намяшанага, 24-гадовы наватар Фярнанда (якога тады называлі Давідам у свеце чайных Галіафаў) прапанаваў чай — сапраўдны, стапрацэнтна цэйлонскі. І не прагадаў. Павярнуўшы чай тварам да пакупніка. Сёння паспяховы бізнэсмен не шкадуе на дабрачыннасць: ён дапамог ужо 10 тысячам чалавек. І ў Беларусі зрабіў свой унёсак у збор грошай на лячэнне Леры Шчэрбы. Па сутнасці, дабрадзеем становіцца кожны пакупнік чаю яго вытворчасці.

У дэгустацыі спадар Фярнанда таксама калі не сабаку з'еў, дык галоны гарбаты выпіў дакладна. Яшчэ б! Сваю кар'еру ён пачынаў якраз з тэсціравання напою, не грэбуе тым і сёння. Супольна з калегамі яны штотыдня «прапускаюць па кубачку»... сем тысяч (!) разоў. Таму падчас праверкі, наладжанай дасціпнымі беларускімі журналістамі, цэйлонскі джэнтльмен, не ўдарыў тварам... у чай! З лёгкасцю адрозніўшы «сваю» гарбату ад «падсадной качкі». Наўрад ці трэба казаць, як пасля каверзнага выпрабавання ўзрос у нашых вачах аўтарытэт чайнага гуру... Побач з такім і сам становішся экспертам. Нас цяпер таксама не правядзеш! Мы ведаем, што сапраўдны чай — гэта калі лісткі ў вадзе разварочваюцца (чаго, натуральна, не можа здарыцца з рассыпным чайным «пылам»). Такі можна герметычна запакаваць у кантэйнер і прыхаваць да лепшых часоў... у лядоўні! Ён застанецца свежым цэлы год.

Чайны вытворца, аказваецца, яшчэ і «мадэллю» схітраецца пабыць! Яго фота на пачку, дзякуючы якому кожны беларус ведае цэйлонскага майстра ў твар, — своеасаблівы знак якасці. У свой час ён з'явіўся там разам з аўтографам стваральніка, каб бараніць ад падробак. Сёння гэта хутчэй даніна традыцыі, аднак усё належнае для таго, каб быць «тварам» маркі ў спадара Фярнанда ёсць — і мужчынскі шарм, і знешні лоск. Карэспандэнт «Звязды» ўважліва прыглядалася да імпазантнага мужчыны ў гадах, употай спадзеючыся вызнаць эфектыўную методыку (хто яго ведае, можа якія чайныя прымочкі на твар) і выглядаць у 80 гэтак жа прыстойна. Прыкмеціла, напрыклад, яго манеру вітацца жэстам намастэ. «Ну, ёгай я займаюся», — суцешыла сябе. Але не вытрымала і чыста па-жаноцку пацікавілася, як рабіць гады сваім багаццем.

— Я парэкамендаваў бы вам і ўсім маладым людзям піць гарбату без цукру і малака, без аніякіх дабавак — падчас ежы і пасля яе, — ахвотна распавядае карэспандэнту «Звязды» задаволены чайны магнат. — Першы кубак гарбаты зранку павінен быць моцным. На працягу дня і познім вечарам можаце піць лёгкі зялёны чай. Проста папіце па 4—5 кубкаў у дзень на працягу паўгода — гаючыя ўласцівасці гарбаты вас уразяць! На Усходзе, дарэчы, чай п'юць пры розных хваробах як лекі — з імбіром, карыцай, лімонам.

І ўвогуле з чаем спрацоўвае прынцып «чым раней — тым лепш». Спадар Фярнанда кажа, што калі паіць немаўля гарбатай ужо з шасці месяцаў, гэта будзе найздаравейшае і наймацнейшае дзіця.

У Беларусі, якую сёлета наведаў упершыню ў рамках еўрапейскага турнэ, уражэнец Шры-Ланкі (так пасля доўгіх перапетый і выхаду з-пад брытанскага панавання стаў называцца Цэйлон) «калі б не іншая мова, адчуў бы сябе дома». Настолькі ж ветлівымі і гасціннымі, як і яго суайчыннікі, падаліся яму беларусы. І чайная культура, паводле яго ўражанняў, нам блізкая. Таму ён плануе адкрыць тут чайны дом. Dilmah сёння ў пяцёрцы асноўных чайных марак, якія набываюць у Беларусі.

— Гэта высакаякасны чай, і гэтым вызначаецца кошт. Ён знаходзіцца ў прэміяльным сегменце, — канстатуе **Павел ГУШЧА, дырэктар кампаніі «Авалонторг»**, эксклюзіўнага дыстрыб'ютара Dilmah на беларускім рынку.

Продажы прэміяльнага сегменту ў крызіс відавочна знізіліся — не надта беларусы гатовыя раскашэліцца на эксклюзіўны чай. Налета ж дыстрыб'ютар разлічвае дасягнуць дакрызіснага ўзроўню, а пасля і «прырасці» ў продажы на 10 — 15 адсоткаў. Бо, як слушна заўважае Мэрыл Фярнанда, з чаем, як і з іншым таварам вы атрымліваеце сувымерна таму, колькі заплацілі. Ён верыць, што, калі наведае нашу краіну ў наступны раз, беларусы стануць багацейшымі і змогуць часцей частавацца больш якаснай гарбатай. Пры гэтым бізнэсмен зазначае, што «хацеў бы быць не самым буйным, а самым лепшым гульцом на рынку».

Далучыць беларусаў да лепшага — сапраўды якаснага чаю — закліканы сумесны праект «Авалонторга» з кавярнямі «Амата кава», на базе якіх стваруюцца чайныя буцікі. Там можна не толькі атрымаць кансультацыю па відах чаю, правілах яго заварвання, але і, зразумела, набыць упадабанае, у тым ліку і рэдкія гатункі з t-серыі. Адным словам, пазнаць якасны тавар у твар.

Ала МАЧАЛАВА.

Усміхнемся

Калі паслухаць нашу матулю, дык у нас дома жывуць кот, трус, марскі парсючок і толькі-паспрабуй-не-паступіць-у-інстытут.

☺

Установа дашкольнай адукацыі.

— Скажыце, калі ласка, калі можна падысці запісаць дзіця ў садок?

— Падыходзьце ў любы час у панядзелак з 2-х да 4-х.

☺

Дарагія жанчыны! Калі ваш муж пачаў сачыць за модай, пачынайце сачыць за мужам.

☺

— Гледзячы на страказу, людзі прыдумалі верталёт.

— А што прыдумалі людзі, калі паглядзелі на муху?

— Мухабойку.

☺

Спачатку дзяўчынак цікавіць лялькі, а хлопчыкаў машыны. А потым — наадварот!

☺

На прыпынку цётка надрываецца, гарлапаніць у тэлефон:

— Міша! У халадзільніку! У халадзільніку суп! Ты чуеш мяне?! Міша! У халадзільніку! Я табе не есці яго казала! Выліць! Выліць трэба было!

НАДВОР'Е на заўтра

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.18	18.37	11.19
Віцебск —	7.09	18.25	11.16
Магілёў —	7.08	18.27	11.19
Гомель —	7.04	18.25	11.21
Гродна —	7.33	18.52	11.19
Брэст —	7.33	18.54	11.21

Месяц

Маладзік 7 кастрычніка. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Макара, Пятра, Фёдара.*

К. *Апалінара, Барталамея, Ігара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВЯЛІКАЯ ВЯСЕЛЬНІЦА,

або Найбольш аптымальны тэрмін правядзення вяселляў

Адным з найболей спрыяльных перыядаў для правядзення вяселляў нашы продкі лічылі час ад канца жніўня (калі закончылася жніво) і да пачатку Каляднага посту (28 лістапада). Час з 14 кастрычніка да 28 лістапада называлі «Вялікая вясельніца» — з-за таго, што найбольшая колькасць вяселляў прыпадала менавіта на гэты перыяд. Лічылася, што гэта самы лепшы час для таго, каб стварыць сям'ю. Але пры гэтым з яго неабходна выключыць усе памінальныя дні, напрыклад, Восеньскія, Міхайлаўскія, Дзмітраўскія Дзяды.

● Другім найбольш аптымальным тэрмінам для вяселляў з'яўляецца зімовы Мясаед — так званыя «Мясаедныя вяселлі», перыяд, які пачынаецца 21 студзеня і заканчваецца напярэдадні Масленічнага тыдня (г.зн. на восьмым тыдні перад Вялікаднем).

● У структуры народнага календара ёсць яшчэ адзін невялічкі прамежак часу, на працягу якога дапускалася гуляць вяселлі. Ён пачынаецца напярэдадні Сёмухі і заканчваецца перад Пятроўскім постам. Часцей за ўсё гэты перыяд выпадае на другую палову мая і пачатак чэрвеня. У народнай творчасці захаваліся два фразеалагізмы, якія сведчаць пра стрыманае ці нават негатыўнае стаўленне народа да вяселляў гэтага перыяду: «Як беднаму жаніцца, дык і ноч кароткая», «Хто ў маі ажэніцца, той усё жыццё маяцца будзе».

● Пры выбары дня вяселля варта абавязкова ўлічваць і такі істотны касмічны фактар, як фаза Месяца. Найбольш спрыяльным для распачынання вялікіх і значных спраў (і, вядома ж, для правядзення вяселляў) лічыцца час «пад поўню» (ад першай фазы Месяца, так званага маладзіка да таго перыяду, калі вось-вось Месяц стане «поўным», г.зн. наступіць поўня).

● І яшчэ адзін немалаважны фактар для нашага сучасніка — выбар першага дня вяселля: пятніца, субота ці нядзеля? Па этнаграфічных запісах XVIII-XIX стагоддзяў можна меркаваць пра тое, што вяселле пачыналася ў нядзелю — самы спрыяльны, «святы» дзень тыдня. Маладая пара спачатку прытрымлівалася тыднёвага посту, прыходзіла ў храм на споведзь, а ў нядзелю здзяйсняўся абрад шлюбу. Другім днём на тыдні, спрыяльным для шлюбу, Праваслаўная царква ўсталявала пятніцу. Таму, калі маладыя плануюць вянчацца, добра было б расставіць «акцэнты» паміж «светлай», або «святой», нядзеляй і штотыднёвым памінальным днём — суботай. Сёння найбольш спрыяльным днём для пачатку вяселля (рэгістрацыі ў загсе, а потым шлюбу ў храме і, адпаведна, далейшага правядзення вясельнай імпрэзы) можа быць пятніца. На другім плане — нядзеля. Прааналізуйце тыповую сітуацыю: маладая пара рэгіструе шлюб у загсе ў суботу, затым адбываецца непасрэдна вясельная імпрэза і першая шлюбная ноч. А раніцай у нядзелю маладыя ідуць у храм для вянчання, парушаючы ўсе царкоўныя каноны.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Блізкая далёкая «другая Зямля»

Днямі за межамі Сонечнай сістэмы, на адлегласці 20 светлавых гадоў, амерыканскія вучоныя адкрылі новую планету. Падобныя аб'екты ў космасе знаходзілі і раней, аднак гэтая знаходка — унікальная, бо па асноўных параметрах вельмі падобная на нашу Зямлю. Яе пакуль што асцярожна называюць «нябесным целам, якое патэнцыяльна прыдатнае для жыцця».

Планета, якую «ахрысцілі» 581g (а дакладней, Gliese 581g), усяго ў некалькі разоў цяжэй за наш «блакітны шарык». Перыяд яе абарачэння вакол уласнага сонца — чырвонага карліка — 37 сутак. Ландшафт 581g прадстаўлены ў асноўным каменнем і скаламі, аднак вучоныя сцвярджаюць, што на яе паверхні месцамі можа існаваць вада ў звыклай для нас вадкай форме, а сілы гравітацыі даюць падставу меркаваць, што там ёсць атмасфера. Праўда, яе састаў яшчэ невядомы. «Пакуль што мы не ведаем, з чаго складаецца атмасфера — яе хімічны састаў, — заявіў **прафесар астраноміі і астрафізікі Каліфарнійскага Універсітэта Сціў ВОГТ,** — калі гэта кісларод і вуглякіслы газ, то можна меркаваць, што ў той ці іншай форме жыццё на планеце існуе».

— Да гэтага адкрыцця людзі ішлі некалькі гадоў. Знаходзілі і вывучалі планеты з верхнім і ніжнім парогам тэмператур, прыдатных для жыцця, — патлумачыў **астраном Пол БАТЛЕР з Інстытута Карнегі,** які разам з Вогтам узначальвае праграму па даследаванні экзапланет. — І вось, нарэшце, мы знайшлі планету з аптымальнай тэмпературай — прычым даволі хутка разабраліся з яе каардынатамі. Гэта дазваляе гаварыць пра тое, што падобных планет можна знайсці дастаткова шмат.

Як патлумачыў **дырэктар Абсерваторыі БДУ, кандыдат фізіка-матэматычных навук Альгерд КУЗНЕЧЫК,** назіранні за сістэмай Gliese 581 у сузор'і Ліра цягнуліся больш за 10 гадоў (абсерваторыя Кек на Гаваях). У сістэме спачатку адкрылі дзве планеты на мяжы «зоны жыцця» — адну ў «гарачай» зоне (планета c), другую — у «халоднай» (планета d). Між іншым, некаторыя астраномы выказваюць меркаванні, што і планета d можа быць патэнцыйна населенай, калі ў яе тоўстая атмасфера з моцным парніковым эфектам. Новая адкрытая планета g знаходзіцца якраз у сярэдзіне «зоны заселенасці», ці «зоны жыцця». Планета, як Месяц да Зямлі, заўсёды павернутая да сваёй зоркі адным сваім паўшар'ем. На адной палове планеты заўсёды спёка (каля 160 градусаў Цэльсія), на другой — цёмна і холадна (мінус 25 па Цэльсію). Гэтая акалічнасць можа станоўча паўплываць на стабілізацыю клімату ў зоне мяжы святла і ценю — «поясе прыдатных тэмператур» (ад 0 да 40 па Цэльсію), дзе найбольшая верагоднасць існавання жыцця. У гэтым жа «поясе» вада можа існаваць у вадкай форме.

На сёння вядома шэсць планет гэтай сістэмы; як і ў Сонечнай сістэме, планеты вакол Gliese 581 абарачаюцца амаль па кругавых арбітах.

На жаль, патрапіць туды ў бліжэйшай перспектыве чалавецтва не зможа: 20 светлавых гадоў — усё ж такі вялікая адлегласць пры цяперашнім узроўні развіцця касмічных тэхналогій (хаця на астранамічных мерках — гэта зусім побач). Таму планы перасялення пакуль прыйдзецца адкласці. Тым не менш, для навукі адкрыццё Gliese 581g — знакавая падзея, якая даказала наяўнасць экзапланет (планет вакол іншых зорак), на якіх верагодна існаванне жыцця.

Інга МІНДАЛЁВА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

АЎТАРСКІ-12/11

Майстар кампазіцыі Пётр Шклудаў (Наваполацк) працягвае конкурс рашэнняў яго задумак на 64-клетачнай дошцы наступным эцюдам:



Белыя: b4, g3, дамка e1 (3). **Чорныя**: a5, d8, f6, f8, h8 (5). Выйгрыш: c5 (e5AB) f4, h4 (c7) g3 (b6) a7 (b4) f4 (c3) c1 (hg7) b8 (f6) bf4 (g7) fe3 (d2C) g5, f8 (g3) c5x. C(h6) f4 (e5) d6/b8 (g5) h6 (b2) e5x. A(c7) f4 (e7) b6 (cd6) a7 (c5) b8 (cb4) a7 (a3) e5, f2/g1 (b2D) c3x. D(b4) a5 (b2) c3x. А вось варыянты B(fe7) f4 (g7) f2 (h6E) і E(c7) застаюцца за вамі.

ПЕРШАЯ ЛАСТАЎКА

Сумесна з Федэрацыяй шашак Беларусі мы праводзім Рэспубліканскі конкурс-21 па складанні 100-клетачных мініяцюр. Ад чэмпіёна свету па іх, міжнароднага гросмайстра Уладзіміра Матуса (галоўны суддзя конкурсу) пяць пераможцаў чакае яго кніга «Гранды России» (Москва, Графпресс, 2008), а першых трох прызёраў — яшчэ і адпаведныя дыпломы Федэрацыі. Суддзёй-каардынатарам з'яўляецца міжнародны майстар кампазіцыі Віктар Шульга (Мінск) — пастаянны звяздоўскі аўтар, як і Уладзімір Матус.

Конкурс адкрыты, і ім зацікавіліся не толькі айчынныя праблемісты, але і замежныя:расіяне Р. Шасцірыкаў, Я. Капылоў, Васіль і Еўдакія Факанавы, украінцы М. Левандоўскі, С. Усцьянаў, І. Уласаў, І. Івацка, І. Булатаў, В. Несцярэнка і В. Трынас, Г. Андрэеў (Латвія) і В. Студзянцоў (Літва). Нашу рэспубліку прадстаўляюць Ю. Мурадаў (Барысаў), Л. Вітошкін і М. Вяргейчык (Гомель), В. Варушыла, В. Грабенка, Б. Іваноў і І. Наўроцкі (Мінск), А. Кагоцька (Пінск), Д. Слясарчык (Гродна), П. Шклудаў і вядучы рубрыкі.

Першым даслаў сваю канструкцыю 5 на 6 Ю. Мурадаў:

Белыя: 16, 23, 25, 26, 29 (5). **Чорныя**: 12, 28, 32, 37, 38, 39 (6). Разбярыце яе па-за конкурсам. Першы ход белых.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/22



Белыя: d6, дамка f8 (2). **Чорныя**: a5, дамкі d8, h8 (3). Нічыя.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Конкурс быў прысвечаны светлай памяці ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і спорту Міхаіла Міхайлавіча Станоўскага — майстра спорту СССР, суддзі ўсесаюзнай катэгорыі, таленавітага трэнера, нястомнага прапагандыста старадаўняй гульні праз газеты, часопісы, кнігі. Шмат чытачоў адгукнуліся і ўзялі ўдзел у развязванні звяздоўскіх заданняў. А перамаглі з іх Аляксандр Янчук і Цімур Каркенаў (Камянец), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Канстанцін Козел і Ігар Ананіч (Гродна). У заданні № 17 яны знайшлі прыватнае пабочнае рашэнне пасля 3. 23:3/1x і дадаткова зарабілі па 0,5 ачка.

Сярод жанчын лепшай была Аляксандра Камінская (Вілейка). Кожны лаўрэат атрымае ад ініцыятара конкурсу П. Шклудава па тры кнігі з бібліятэкі М. М. Станоўскага.



Віншуем з днём нараджэння **Дзіму БАБІЧА.** Жадаем здароўя, поспехаў у вучобе, надзейных сяброў.

Родныя з *г. Глыбокае.*

Віншуем з 74-м годам нараджэння **Вольгу Сямёнаўну ЛЫСЮК з в. Дубай.** Жадаем моцнага здароўя, каб сэрца білася рытмічна, дабрабыту, весялосці.

Муж Мікалай, Лена, Слава і іх дзеці.

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 29 (650)

аддзел рэкламы 287 17 79 Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Трактар ЮМЗ акучвальны (для раллі) + з/ч. Тэл. 8 029 673 91 38, 613 47 19.

❒ Трактар Т-25 з прычэпам «Зубраня», з дакументамі. Тэл. 8 044 759 70 71.

❒ Зварачны паўаўтамат (экстэль) 220 В, 200 А. Тэл. 8 029 378 15 36.

❒ А/м «Фальксваген-Гольф 3» 1997 г.в., 1,9 Д, універсал. Тэл. 8 029 378 15 36.

❒ Біблія і тлумачэнне да яе за 5 тыс. руб., кніга народных рэцэптаў за 5 тыс. руб. Тэл. 8 0212 258079.

❒ Стартар СТ230 УАЗ, Волга, карбюратар К126 УАЗ, трамблёр Р 119 УАЗ, генератар Г250 УАЗ, ГАЗ. Тэл. 8 01774 55308.

❒ А/м «Форд-Арыён» 1991 г.в., 1.4 бензін. Тэл. 8 029 871 60 99.

❒ А/м «Гольф 2» у добрым стане, 1986 г.в., дызель, белы, 1000 у.е., тэрмінова. Анатоль. Тэл. 8 029 2770617.

❒ А/м «Вольва-440» 1990 г.в., 1.7 бензін, Мінск. Тэл. 8 029 121 20 77.

❒ Касілка трактарная КС-21, дыстылятар, нівелір, шыны да трактара Т-25 (перад). Тэл. 8 01718 42 458, 8 029 391 23 56.

❒ Трактар Т-40АМ 1989 г.в., у добрым стане, бульбакапалка (Польшча). Тэл. 8 01718 42458, 8 029 3912356.

❒ Дом 11х7 м, можна на знос, в. Галынь Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Тэл. 8 01597 71479, 8 029 2533569.

❒ Племянныя трусы пароды «Бельгійскі велікан» («Фландр») і «Каліфарнійская». Тэл. 8 029 3576451.

❒ Новая падвеска ў камплекце ГАЗ-21. Тэл. 8 029 5593623.

❒ Пчальнік 12 пчола-сем'яў з неабходным інвентаром у Асіповіцкім р-не. Тэл. 8 029 1385107.

❒ А/м «Фальксваген-Гольф 3» 1996 г.в., 1,9 Д, чорны ўніверсал, або мяняю на любы бензінавы. Варыянты. Тэл. 8 017 9331540, 8 033 6360712.

❒ Акардыён «Вельтмейсцер», Германія, поўны, 11 рэгістраў, у добрым стане, акардыён «Horch», Германія, поўны, 11 рэгістраў, у добрым стане. Тэл. 8 0214 526809.

КУПЛЮ

❒ Трактар МТЗ-82, можна з пагрузчыкам ці экскаватарам. Тэл. 8 044 4736890.

❒ Дом у вёсцы ці на хутары 40—70 км ад Мінска. Тэл. 8 029 3576451.

❒ Клеткі для вулічнага трымання трусоў, новыя ці б/у. Тэл. 8 029 3576451.

МЯНЯЮ

❒ Самаробны трактар (рухавік Д-21) на мотаблок беларускі. Тэл. 8 029 5837727.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4834 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12